№ 33 (487) 8 верасьня 2006
www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА
ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

### Інструкцыі па разлажэньні апазыцыі

У архівах "Штазі" ёсьць дырэктывы, якімі, магчыма, дагэтуль кіруюцца ў Беларусі. Піша Алесь Кудрыцкі. **Старонка 8.**

### Патрабую немагчымага – будзьце рэалістамі

Андрэй Дынько адказвае Сяргею Навумчыку, Зянону Пазьняку, Віталю Тарасу. **Старонка 4.**

## Дзень нашай славы

**8 верасьня 1514 году войска гетмана Астроскага разьбіла пад Воршай утрая большыя сілы расейскіх агрэсараў. Гэта забясьпечыла мірнае жыцьцё й незалежнасьць краіны на паўтара стагодзьдзя. Біблія Скарыны, Статут Сапегі і першы "беларус" Саламон Рысінскі зьявяцца ў гэты пэрыяд, пазьней празваны "залатым векам" Вялікага Княства Літоўскага. У гонар той перамогі 8 верасьня сьвяткуецца Дзень беларускай вайсковай славы. Ці можна лічыць тую бітву самай значнай перамогай беларускай зброі? Апытаньне гісторыкаў — старонка 3.**






**У нумары**: Аляксандар Класкоўскі. Змушаны дрэйф: пінскія заявы Аляксандра Лукашэнкі. Старонка 24. Камэта-мятла: пра астролягаў і абскурантызм. Старонка 12. Нас чакае зьезд "За незалежнасьць". Старонка 18. Прамэнад: Мальёрка. Старонка 38.



**Эніра Браніцкая і Аляксандар Шалайка далі першую па выхадзе з турмы прэс-канфэрэнцыю.**

## 8 верасьня, у Дзень беларускай вайсковай славы, стартуе сайт "НН" у новым фармаце

Экран кампутара перастаў быць копіяй газэтнай старонкі. "НН" цяпер можна ня толькі чытаць, але і пісаць, і спрачацца ў ёй, а неўзабаве — і чуць яе. "НН" цяпер ствараюць самі чытачы. Штодня. Кожны можа выказаць сваё меркаваньне наконт любога артыкулу, паспрачацца з аўтарам, падыскутаваць зь іншымі чытачамі. Кожны можа сам напісаць артыкул у" НН" проста на сайце. Новая "Наша Ніва" зьбірае беларусаў.

Чытаць "НН" у Інтэрнэце цяпер таксама можна па-рознаму. Можна праглядаць толькі галоўныя навіны, можна – толькі навіны, напісаныя нашаніўцамі, а можна – усе матэрыялы сайту разам. Зарыентавацца дапамогуць рэйтынгі найбольш чытаных і найбольш камэнтаваных артыкулаў.

Ня ўсё ўдаецца сказаць у межах артыкулу ці навіны. Сьвет ва ўсім багацьці драбніцаў, прыватныя адкрыцьці — у аўтарскіх блогах — мовай слоў, выяў і вашых водгукаў.

На сайце таксама праводзяцца апытаньні (з сумленным падлікам галасоў).

Дык заходзь, ня стой адзін. Далучайся і заставайся.

**Андрэй Кузьнечык, ўэб-рэдактар nn.by**



## у нумары


### камэнтары

Андрэй Дынько. Патрабую немагчымага — будзьце рэалістамі ... 4

Уладзімер Лобач. Толькі ў Беларусі вырашыцца лёс Беларусі ... 14

Аляксандар Краўцэвіч. Два словы пра Мілінкевіча і Фядуту ... 14

Павал Севярынец. Калёнія звычайнага рэжыму ... 22

Аляксандар Класкоўскі. Змушаны дрэйф ... 24

Сяргей Харэўскі. Помнікі нашы... ... 28

Руслан Равяка. Рэчы, дзеля якіх мы жывём ... 34

### паралелі

Інструкцыі па разлажэньні апазыцыі ... 8

### люстра дзён

Несудзімы судзьдзя ... 11

Камэта–мятла ... 12

Звольнены–настаўнік прыкуў сябе да ліхтарні ... 13

Падпольнае сьвята ... 16

Нас чакае зьезд "За незалежнасьць" ... 18

Мілінкевіч: Радзіма ў небясьпецы ... 18

У часопісе "Спецназ" раяць гітлерскі кодэкс гонару ... 19

Адам Міхнік: Лукашэнку засталося нядоўга ... 19

Справа «Партнэрства» толькі пачынаецца ... 19

Аб усім патроху ... 20

Хроніка ... 22

### левым вокам

Лёлік Ушкін. Беларусь гой, або Мова інтэграцыі з Вэнэсуэлай ... 25

### з усіх старон

Беларускамоўныя вёскі ў тайзе ... 26

### культура

Харавыя сьпевы ... 31

Уладзімер Някляеў: "Мы стаміліся, патрэбная сьвежая кроў" ... 32

Прамова Сяргея Навумчыка ... 34

Дыскаграфія ... 36

Кропля салідарнасьці ў краіне цынізму ... 37

### прамэнад

Апладысмэнты для сонца. Мальёрка ... 38

### навука

Тэлевізар для памяці забойчы ... 40

Канец спрэчкі пра эмбрыёны ... 40

Футбалістаў вылечаць мацярынскія клеткі іх дзяцей ... 40

### газэтка дзеткам

Плястыляндыя ... 42

### дзе варта быць

Аршанская бітва 2006 ... 43

Гістарычная песьня ... 43

Шалкевіч прызямліўся ... 44

Выкіньце свой мабільнік! ... 44

NRM у Маладэчне ... 44

Трыб'ют Сяргею Новіку–Пеюну ... 45

Зьміцер Вайцюшкевіч у Менску ... 45

222 альбомы ў Воршы ... 45

### мы самі

Шукаем чытачоў ... 46

### калі б...

Малюнкі Лёліка Ушкіна ... 47


# Сьвяткаваньне 100-годзьдзя "Нашай Нівы" пачнецца з Бэрліна

Сёлета "Наша Ніва"; сьвяткуе сваю сотую гадавіну. Як і ўсяму незалежнаму ў Беларусі, "Нашай Ніве" даводзіцца існаваць у складаных палітычных умовах. Летась, як і многія іншыя выданьні, газэта была выкінутая зь дзяржаўных падпісных каталёгаў. Дзеля таго каб газэта трапляла да сваіх чытачоў, Рэдакцыі давялося амаль з нуля стварыць складаную сыстэму для свайго распаўсюду. Тым мацней мы адчуваем вартасьць таго, што робім, што нараджаецца, дзякуючы ахвяраваньням тысячаў людзей. Тым з большым хваляваньнем чакаем 100-гадовага юбілею. Так выпала, што яго адзначэньне пачнецца з Бэрліна.

У сераду 20 верасьня (пачатак а 20-й гадзіне) у Літаратурнай майстэрні (*Literaturwerkstatt*) у Бэрліне выступяць Андрэй Дынько, Андрэй Хадановіч і Лявон Вольскі. Доктар Райнэр Лінднэр (Фонд навукі і палітыкі) распачне вечар невялікім рэфэратам пра значэньне "НН" для беларускай гісторыі.

У пятніцу, 22 верасьня (пачатак а 20-й гадзіне) Лявон Вольскі і Андрэй Хадановіч зноў выступяць у Бэрліне — гэтым разам у кінатэатры *Kino Krokodil*, з паэзіяй і музыкай. Уваход: 5 эўра.

З дапамогай гэтых захапляльных вечарынаў бэрлінцы і беларусы Нямеччыны здолеюць глыбока зазірнуць у сучасную беларускую культуру.

Арганізуе імпрэзы Інго Пэтц і Нямецка-беларускае таварыства. Фундатарамі сталі Фонд Робэрта Боша (Штутгарт) і пасольства Нямеччыны ў Беларусі.

У кастрычніку-лістападзе заплянаваныя таксама юбілейныя вечарыны і сустрэчы з чытачамі ў Менску (першая зь іх мае адбыцца 5 кастрычніка, а 19.00), Воршы (8 кастрычніка), Віцебску, Горадні. Рэдактары і аўтары "НН" таксама абяцаюць прыехаць у любы горад Беларусі, куды іх запросяць.

Па дадатковую інфармацыю зьвяртайцеся да: Інго Пэтц, тэл. 0163-843-14-00, ingopetz@hotmail.com

Вітаньне гэтым падзеям даслаў Юры Андруховіч: "Тры выбітныя беларускія асобы і юбілей легендарнай газэты ў рамках адной імпрэзы, ды яшчэ ў Бэрліне — ініцыятарам за гэта сардэчны дзякуй. Застацца спадзявацца, што гэта толькі пачатак, і што не ў апошні раз новая Эўропа адкрые саму сябе".

# Тры беларускія перамогі

Якая перамога беларускай зброі была найбольш значнай? Меркаваньні гісторыкаў.

**Мікалай Сташкевіч**, экс-дырэктар Інстытуту гісторыі НАН РБ, дасьледчык грамадзкага руху першай паловы XX стагодзьдзя: «Гэта разгром фашыстаў у Другую сусьветную вайну. Партызанскі рух. Ён найбольш поўна адлюстроўвае беларускую нацыянальную ідэю. Ніхто ніколі ў Беларусі не забудзецца на жахі той вайны. У кожнага на вайне загінуў нейкі сваяк. Сёньня я не магу зразумець, адкуль у тых людзей браўся аптымізм і патрыятызм, каб разграміць ворага».

**Анатоль Сідарэвіч**, публіцыст, гісторык XX ст.: «Найбольшыя беларускія перамогі не зьвязаныя са зброяй. Я маю на ўвазе тое, што ў 1991-м годзе Беларусь нарэшце канчаткова аддзялілася ад Расеі, а ў 1939 годзе — ад Польшчы. А калі браць рамантычнае сьветабачаньне, то гэта, канечне, Аршанская бітва».

**Валеры Чарапіца**, выкладчык гістфаку Гарадзенскага ўнівэрсытэту імя Купалы: «Перамога ў Вялікай айчыннай вайне. Гэта быў адзіны парыў беларускага народу за волю, свабоду і незалежнасьць».

**Сяргей Балахонаў**, настаўнік гісторыі, Гомель: «Аршанская бітва. Гэта была выдатная бітва з пункту гледжаньня вайсковай тактыкі, і грамадзкі рэзананс, які выклікала гэтая перамога войскаў Канстанціна Астроскага ў Эўропе, быў вялізны. Аршанская бітва паклала канец небясьпечнаму для Вялікага княства хаўрусу між Масковіяй і Сьвятарнай Рымскай імпэрыяй».



Вітаўт Вялікі.

**Алег Трусаў**, старшыня Таварыства беларускай мовы, археоляг: «Грунвальдзкая бітва. Пасьля 10 ліпеня 1410 году больш чым пяцьсот гадоў нага ўзброенага немца не ступала на беларускія землі».

**Аляксандар Каваленя**, дырэктар Інстытуту гісторыі НАН РБ: «У вас няправільна сфармуляванае пытаньне, таму я не зьбіраюся на яго адказваць».

**Натальля Гардзіенка**, дасьледніца беларускай эміграцыі: «Грунвальд. Гэтая бітва была вырашальнай для далейшага росквіту Вялікага Княства Літоўскага».

**Алесь Смалянчук**, выкладчык гістфаку Гарадзенскага ўнівэрсытэту імя Я.Купалы: «Гаварыць пра перамогу выключна беларускай зброі не выпадае, бо мы ўвесь час былі зь некім у хаўрусе. Я б назваў Грунвальдзкую бітву, але гэта не беларуская, а беларуска-польска-летувіска-ўкраінская перамога. Там жа ўдзельнічалі і татары, і чэхі, і багата хто яшчэ».

**Уладзімер Ляхоўскі**, гісторык, архівіст: «Аршанская бітва. Па-першае, таму што маскоўцы значна пераўзыходзілі наша войска ў сіле. А па-другое, таму што паклала канец плянам масквітаў і немцаў па імаверным падзеле Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы».

**Ігар Марзалюк**, выкладчык Магілёўскага ўнівэрсытэту імя Куляшова: «Грунвальд. Хоць я ня схільны гаварыць аб нейкай цывілізацыйнай барацьбе між славянскім і нямецкім народам. Перамога пад Грунвальдам стабілізавала сытуацыю ў краіне, а таксама прадвызначыла культурнае разьвіцьцё княства надоўга наперад».

**Янка Запруднік**, гісторык, Нью-Джэрзі (ЗША): «Аршанская перамога 1514 году, яна і сёньня паказвае беларусам, адкуль ідзе для іх найбольш значная пагроза страты нацыянальнай ідэнтычнасьці і дзяржаўнасьці».

**Вольга Гарбачова**, выкладніца гістфаку БДУ, дасьледніца паўстаньня 1830—1831 г.: «Аршанская бітва».

**Алег Латышонак**, гісторык, выкладчык катэдры беларускай культуры Беластоцкага ўнівэрсытэту: «Ворша. Гэта перамога была атрыманая ў вельмі важны час. Яна здолела затрымаць маскоўскую агрэсію, дарма, што ВКЛ выйшла з той вайны з тэрытарыяльнымі стратамі».

**Генадзь Сагановіч**, гісторык: «Некалі я ўжо выказваўся на гэтую тэму. З таго часу мая пазыцыя пакуль не зьмянілася, таму я называю Аршанскую бітву».

**Юры Туронак**, патрыярх беларускай гістарыяграфіі, Варшава: «Напэўна, Аршанская бітва».

* * *

Грунвальдзкая бітва 15 ліпеня 1410 году, Аршанская бітва 8 верасьня 1514 году і перамога ў Другой сусьветнай вайне 1945 году застаюцца найчасьцей называнымі падзеямі беларускай гісторыі.

**Апытаў Зьміцер Панкавец**

## АПЫТАНЬНЕ НА САЙЦЕ «НН»

### Якая перамога беларускай зброі самая значная?

| | |
|---|---|
| Перамога над татарамі на Сініх Водах у 1362 г. | 27 (10.9%) |
| Грунвальдская бітва 1410 г. | 70 (28.2%) |
| Клецкая бітва 1506 г. | 1 (0.4%) |
| Бітва пад Воршай 1514 г. | 126 (50.8%) |
| Перамога над швэдамі пад Кірхгольмам у 1605 г. | 5 (2.0%) |
| Бітва пад Мілавідамі 1863 г. | 6 (2.4%) |
| Апэрацыя «Багратыён» | 13 (5.2%) |

Усяго прагаласавала ад панядзелка да 17.30 серады: 248

# Патрабую немагчымага —

Андрэй Дынько адказвае Сяргею Навумчыку, Зянону Пазьняку і Віталю Тарасу.

У №30 «Нашай Нівы», прысьвечаным 15-годзьдзю незалежнасьці Беларусі, зьявіліся два артыкулы, два погляды на бягучую палітычную сытуацыю, аўтары якіх робяць супрацьлеглыя высновы.

Сяргей Навумчык адкамэнтаваў знойдзенае ім у Інтэрнэце фатаграфічнае сьведчаньне таго, што камісія па міжнародных справах палаты прадстаўнікоў засядае пад расейскімі дзяржаўнымі сымбалямі: «Зьлева — чырвона-зялёны сьцяг, а справа — сьцяг Расейскай Фэдэрацыі. А на сьценцы, разам з лукашэнкаўскім гербам, прымацаваны расейскі дзьвюхгаловы арол». Аўтар піша:

*«На пачатку 1990-х мы, тагачасныя актывісты БНФ, казалі, што дзяржаўныя сымбалі і мова — гэтак жа важныя, як і эканоміка.*

*Мы памыляліся.*

*У параўнаньні са сьцягам, з гербам, з мовай, эканоміка (...) ня мае ніякага значэньня. Удакладняю: яна ня проста менш істотная ці мала істотная — яна ўвогуле ня мае значэньня, калі на карту прастаўлены лёс сымбаляў і мовы. (...)*

*Гісторыя мае шмат прыкладаў, калі эканоміка адраджалася за некалькі гадоў (...) — Нямеччына на мяжы 1940–1950-х. Але няма ніводнага прыкладу, калі б насельніцтва, якое згубіла нацыянальныя арыенціры, дасягнула б дабрабыту».*

Віталь Тарас у сваім эсэ «Незалежнасьць за даляглядам», творы аптымістычным праз «не магу», задаецца пытаньнем:

*«Дык усё ж ткі ці быў шанец на пачатку і ў сярэдзіне 1990-х гадоў пачаць будаваць «ня толькі незалежную, але й свабодную» беларускую дзяржаву?»* — і карпатліва перабірае страчаныя магчымасьці і набыты досьвед.

Без настойлівага, пры патрэбе — вельмі працяглага, бязьлітаснага аналізу памылак мінулага пэрыяду, гісторык ня зможа напісаць яго гісторыю, а палітык — адгарнуць новую старонку.

«У беларускага народу шанец пабудаваць свабодную й незалежную дзяржаву ня толькі быў, але застаецца», — падсумоўвае эсэіст. Публіцыст С.Навумчык, наадварот, завяршае свой артыкул трывожным:

*«Некалькі гадоў я спрачаюся з палітолягамі, якія лічаць, што «Незалежнасьці Беларусі нічога не пагражае». Аргумэнтам яны ня верацЬ. Магчыма, цяпер яны паверацЬ уласным вачам?»*

## Спадзяваньне на «раптам»

15 гадоў незалежнасьці — сапраўды істотны часавы адрэзак, каб прыпыніцца і агледзецца.

Калі я пачаў ужо занатоўваць разважаньні, справакаваныя тымі артыкуламі, на сайце «Беларуская салідарнасьць» (www.bielarus.net) зьявіўся новы артыкул Зянона Пазьняка.

*«Калі б цяпер раптам абваліўся рэжым Лукашэнкі, то да ўлады ў Беларусі (пры дапамозе Масквы, калякіных і лябедзек) прыйшлі б зноў антыбеларускія сілы»*, — піша ў ім лідэр Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ. Больш за пагардлівае стаўленьне да палітычных апанэнтаў мяне ўразіла ў ім зачапіла гэтае «раптам».

Бо рэжым — які б несправядлівы ён ні быў, нават такі нялюдзкі, як Кімаў у Карэі, нат такі карумпаваны, як у Азэрбайджане, — ніколі не абвальваецца *раптам*. Ён можа абваліцца толькі ў выніку дзеяньня, ці, па-грэцку кажучы, *прагмы* тых, хто зычыць Беларусі іншага жыцьця. Настойлівых выхадаў на Плошчу, галасаваньняў супраць, байкотаў, падтрымак і г.д.

Інакш мы мусілі б пагадзіцца зь іншай думкай В.Тараса: «Незалежнасьць звалілася на Беларусь як сьнег на галаву». Ад яе недалёка і да каляніяльнага адмаўленьня галоўным лукашэнкаўскім ідэолягам Рубінавым суб'ектнасьці беларусаў, наяўнасьці ў іх палітычнай волі, інстынкту незалежнасьці:

*«Ведь Беларусь смогла стать самостоятельным государством не вопреки, а благодаря усилиям советской страны, прежде всего братского российского народа. Без его деятельной помощи мы никогда не смогли бы в столь короткие сроки развиться из бедной, аграрной, малограмотной окраины Российской империи в мощную страну с развитой наукой, образованием, промышленностью, культурой, с подготовленными институтами государственного управления. И вовсе не борьба за национальную независимость привела к отделению Беларуси от Союза, а тектонические исторические процессы, которые произошли вопреки воле и желанию белорусского народа» («Советская Белоруссия»,*



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Палітык можа прыйсьці да ўлады, толькі калі заручыцца падтрымкай большасьці выбарцаў.**

# будзьце рэалістамі

*28 ліпеня)* — і ўпартага нежаданьня прызнаць фактам стогадовую дзейнасьць беларускіх «будзіцеляў нацыі», якія пачасту плацілі за яе ў Трасьцянцах і Курапатах, але насельне якіх прарасло праз жоўты пясочак.

Старэйшыя беларускія палітыкі сфармаваліся як палітыкі ў пэрыяд «тэктанічных», як піша Рубінаў, зрухаў, часам непадуладных чалавечаму ўспрыманьню (нават Буш-старэйшы, самая абазнаная асоба ў сьвеце, за лічаныя месяцы да путчу ў 1991 годзе ў Кіеве засьцерагаў Украіну ад незалежнасьці). Але цяпер іншы палітычны пэрыяд — стабільнасьці, які яшчэ толькі гадоў дзесяць таму пачаўся, а, значыць, да канца якога мусіць быць далёка. Разважаньні пра «раптам», пра «што было б, калі» цікавыя літаратурна, але бессэнсоўныя, нясвоечасовыя палітычна.

## Грэх летуценнасьці

Віталь Тарас піша пра віну інтэлігенцыі за тое, што здарылася ў Беларусі ў 1995—2000 гадах: за патаптаньне нацыянальнай культуры, а сьледам і палітычных свабодаў.

Гэта нечакана. Раней вінавацілі іншых. Палітыкі — палітолягаў, інтэлігенцыя — палітыкаў, народ — праваДыроў. В.Тарас абвінавачціў сябе. Мая павага яму за гэта. Але я хацеў бы тройчы ўдакладніць ягонае абвінавачаньне.

1) Найбольшую віну я бачу ня ў тым, што беларуская інтэлігенцыя 90-х не пачала пераменаў зь сябе, не перайшла на мову. Якраз-такі перайшла, не аддала сьвятыні псам. Віна наша бачыцца мне ў тым, што інтэлектуалы не былі рэалістамі. Была пара суцэльных летуценьняў. Ня мелі Масарыка, ня мелі Бальцаровіча. Эстэтыка нязбытнага — гэтым захаплялася і «Наша Ніва». Праекты, бясконцыя праекты, якія часта ня мелі аніякага грунту пад сабою, прыгожыя ідэі паветраных замкаў, забаўныя містыфікацыі замест дробязнай, малапрыемнай арганічнай працы — «Беларускія егерскія службы» і «Правыя рэваншы» замест Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы. Форма мела больш значэньня за зьмест. Хараство — за трываласьць.

Гэта ўсё было трэба. Так, мы мелі сплянаваць нацыянальны дзяржаўны дом, адбудаваць яго цалкам наноў з савецкай панэльнай руіны, а для таго мусілі даць сабе натхняльныя ідэі, апладніць крэатывам пякельна цяжкую працу. Напэўна, мы былі малаверныя, раз столькі сілаў у нас пайшло проста на тое, каб *захапіць сябе*. Але адно дакладна: мы не маглі замяніць дом на новы, мы будавалі не з нуля, мусілі ўлічваць асаблівасьці канструкцыі таго будынку, які мелі.

2) Нацыянальныя палітыкі 90-х паходзілі з інтэлігенцыі. Няма чаго каму процістаўляць. І от гэтае дактрынёрства і пражэкцёрства — яно было аднолькава ўласьцівае інтэлектуалам і палітыкам.

Нарэшце, 3). Аналізуючы, ці *мелі мы шанец*, ці магла Беларусь застацца дэмакратычнай краінай, не спаўзьці да васальнай залежнасьці ад Масквы, В.Тарас не зьвяртаецца да эканамічных фактараў. Між тым бяз гэтага немагчыма зразумець найноўшую гісторыю Беларусі. Аналіз аднаго толькі стану элітаў, нават калі ўсё гэта робіцца ў комплексе з аналізам гістарычных перадумоваў, духоўнага стану краіны і значэньня асобы А.Лукашэнкі, нздатны патлумачыць унікальную для Цэнтральнай Эўропы эвалюцыю Беларусі, калі не дапоўніць яго заглыбленьнем у эканамічныя працэсы, што адбываліся ў краіне й рэгіёне.

## БНФ і эканоміка

С.Навумчык у сваёй новай кнізе «Сем гадоў Адраджэньня, альбо Фрагмэнты найноўшай беларускай гісторыі (1988—1995)», апублікаванай у часопісе «ARCHE», вычарпальна паказвае, якім чынам Народнаму Фронту і Пазьняку, гэтаму генію палітычнай тактыкі, у 1991-м удалося выціснуць з рэвалюцыйнай сытуацыі максымум пры мінімуме рэсурсаў. Але аўтар фактычна ўнікае аналізу прычыны паразаў Народнага Фронту на выбарах 1990-га і 1994—1995 гадоў. Ён абмяжоўваецца канстатацыяй слабасьцяў нацыянальнага руху і неспрыяльнасьці абставінаў.

С.Навумчык не наважваецца прызнаць: у тых палітычных кампаніях і іхных вулічных працягах БНФ прайграў, бо ня здолеў перацягнуць на свой бок большасьці насельніцтва. А чаму ня здолеў?

Таму што беларуская сьвядомасьць зарадзілася позна і не пасьпела ўмацавацца. Таму што пасьляваенная нацыянальная інтэлігенцыя масава загразла ў калябарацыі й канфармізьме. Таму што структура беларускай эканомікі прывязвала насельніцтва да Расеі. Так, так, але гэта мінулае, гэта дадзенасьць, зь якой трэ было працаваць.

«Будзьце рэалістамі, патрабуйце немагчымага», — зьвяртаўся да францускіх студэнтаў-бунтароў Жан-Поль Сартр. Тыя студэнты пацярпелі ганаровую паразу. Якую можна назваць і маральнай перамогай. Ці ня тое самае здарылася з БНФ?

У сваёй кнізе С.Навумчык прызнае, што бізнэс на пачатку 90-х не падтрымліваў БНФ, але не гаворыць, што БНФ не зрабіў, лічы, нічога, каб зацікавіць бізнэс. Ён ня здолеў даць пераканаўчых аргумэнтаў для тых, для каго эканоміка значыць найболып. І гэта тыя, хто найбольш уплывае: кіраўнікі прадпрыемстваў і лідэры бізнэсу. Больш за тое, ён пасьлядоўна абʼяўляў бой «чырвоным памешчыкам». БНФ, да прыкладу, дэкляраваў апору на фэрмэраў, якіх у краіне было 3000, а не на калгасьнікаў, якіх было 500 000. (Да слова, тая самая «падтрымка фэрмэраў і ўсіх формаў уласнасьці» прыкачавала ў сваёй незаплямленасьці да праграмы А.Мілінкевіча.)

Лідэр БНФ абмяжоўваўся, і лідэры КХП БНФ і ПБНФ дагэтуль абмяжоўваюцца, вельмі агульнымі эканамічнымі пастулятамі. БНФ амаль ня меў эканамістаў (куды, дарэчы, падзеўся сп.Заблоцкі, якога апазыцыя БНФ меркавала ў прэмʼеры?), ня меў рэалістычнае эканамічнае праграмы, дый нават эканамічных інтарэсаў, але пры гэтым ідэя кампрамісу зь сіламі, якія такія кадры мелі, такія інтарэсы мелі, была лідэрам Фронту не да разгляду.

Яны баяліся людзей, якіх слаба зналі, баяліся страціць чысьціню сваёй формы. Народны Рух Украіны, як відно з вышыні гадоў, баяўся гэтага меней.

Лепей памерці ў гордай цноце, чым перамагчы сярод бруду, прыкладна так, мяркую, мысьлілі многія нацыянальныя палітыкі-інтэлігенты 90-х. У выбарах — ня ўдзельнічаць. Эканоміку ігнараваць, бо ў ёй сам чорт нагу зломіць. Зь бізнэсам ня мець нічога супольнага, каб ня дай Бог не запэцкаць рук. Лукашэнку, як здрадніка Радзімы, не заўважаць. За

**Працяг на старонцы 6.**

# Патрабую немагчымага —

Працяг са старонкі 5.

палітычныя памылкі пачатку 90-х прыйшло пакараньне. Цяпер палітычнае жыцьцё ў краіне адстунічае, а магчымасьці колішніх лідэраў думак зводзяцца да пісаньня адозваў і разьмяшчэньня іх у Інтэрнэце.

## Ахметаў і ўкраінская культура

Украінскі алігарх Рынат Ахметаў, які стаіць за Партыяй рэгіёнаў Украіны і Віктарам Януковічам, сёлета стварыў Фундацыю падтрымкі ўкраінскай культуры і прызначыў яе кіраўніком... ідэоляга Майдану, рэктара Кіева-Магілянскай акадэміі Вячаслава Брухавецкага. Аляксандар Фядута, які працуе ва Ўкраіне апошні год, тлумачыць гэта ў шырэйшым кантэксьце тым, што ўкраінскія прамыслоўцы, украінскі капітал усьвядомілі: іхны палітычны і эканамічны інтэрас палягае на ўмацаваньні незалежнасьці, адкрыцьці рынку Эўразьвязу — шматабяцальнага для ўкраінскіх тавараў, і атрыманьні ад ЭЗ сродкаў на мадэрнізацыю эканомікі.

## Сямашка і птушкі

Кажуць, першы віцэ-прэм’ер беларускага ўраду Ўладзімер Сямашка моцна ганарыцца тым, што за час сваёй працы не пусьціў у Беларусь ніводнага расейскага прадпрымальніка. Кажуць, дырэктарскі корпус ад віцэ-прэм’ера Сямашкі проста ў захапленьні. Кажуць, што ў сапраўднасьці ўстаноўку Сямашку дае той чалавек, які заўважыў яго на сярэднепэрспэктыўным заводзе «Гарызонт» і адправіў ва ўрад. Кажуць, што страўні зь мілымі сэрцу нацыяналістаў назвамі «Салодкі фальварак» і «Ракаўскі бровар» («...дэмакратаў апошні фарпост...», як сьпявае Бартосік) належаць пэўнаму спадару Чыжу, якому някепска лётаецца ў Драздах, а «Талака» й «Мірскі замак» — сыну іншай дамы з птушыным прозьвішчам.

Для іх расейскі арол у кабінэце ўраджэнца Смаленскай вобласьці Вадзіма Папова нічога ня значыць — маленькая ваенная хітрасьць у вялікай палітычнай вайне за гандлёвыя прэфэрэнцыі і скідкі на энерганосьбіты. Дзеяньні віцэ-прэм’ера Сямашкі нагадваюць мне дзеяньні ўкраінскага мільярдэра Ахметава. Рэспубліка Беларусь Лукашэнкі дзейнічае як фінансава-прамысловая група. Яна клапоціцца пра абарону сваіх пазыцый, імкнецца памнажаць капітал, дабіваецца зьніжак і льготаў. Калі б яна мела шанец захапіць Маскву, яна б, не вагаючыся, пайшла б на яе захоп. Капітал ня мае бацькаўшчыны. Але такога шанцу «беларуская ФПГ» ня мае і ніколі болей мець ня будзе. Таму нашы Ахметавы бачаць свае эканамічныя інтарэсы ў іншым, хоць пакуль ня бачаць у беларускай культуры гарантыі свайго дабрабыту.

Вышэй я гаварыў на яркім прыкладзе КХП БНФ, але тая самая прыроджаная хвароба няўвагі да эканомікі ўласьцівая ўсёй беларускай дэмакратыі. Многія апазыцыйныя палітыкі й публіцысты мэнтальна застаюцца калі не ў 1991-м, дык у 1999-м. Ігнаруецца нараджэньне новых эканамічных інтарэсаў беларускага бізнэсу і адміністрацыі, якія пагадзіліся на нявыгаднасьці падпарадкаваньня эканамічнага патэнцыялу краіны замежнаму капіталу, дапушчэньня адплыву з краіны прыбавачнай вартасьці. І тое ігнараваньне аказваецца ўзаемным. Беларускі бізнэс ігнаруе палітыкаў, што дэманстратыўна ігнаруюць яго існаваньне і інтарэсы.

Ці значыць гэта, што арол у беларускім парлямэнце — гэта нармальна? Не і не. Але даказваць гэта мусім без дэмагогіі і пазэрства — «эканоміка ня мае ніякага значэньня». Нават у якасьці рытарычнага прыёму С.Навумчыку ня варта сьцьвярджаць прыярытэт сымболікі над эканомікай.

Адной зь іншых бедаў нацыянальнага руху 90-х было тое, што публіцыстыка падмяняла і палітыку, і, з другога боку, навуку.

Калі беларускія нацыяналісты хочуць заручыцца падтрымкай народу, ім варта паклапаціцца пра тое, як пазбыцца іміджу дэмагогаў. Іншая хвароба дэмакратычнай апазыцыі — элітызм, які дазваляе лічыць, што палітык можа прыйсьці да ўлады, не заслужыўшы падтрымкі большасьці выбарцаў. За гэтымі «элітнымі тэорыямі» часам хаваецца ня што іншае, як лянота й пагарда да свайго народу.

## Дык чаго ж нам баяцца?

У рыторыцы КХП БНФ нязьменна чапляе падкрэсьлена зьняважлівае стаўленьне да канкурэнтаў. Так было ў часы КПСС, Кебіча, Грыба, раньняга Лукашэнкі. У дачыненьні да палітычных праціўнікаў гэта можа і мела палітычны сэнс (з маральным фатальна сэнсам — плякат «Да, я байстрюк, отец — цыган, объединю я всех славян», які выносілі ў сярэдзіне 90-х, можна сьпісаць на дзейнасьць правакатараў, але цяжка зацерці ў памяці). Так застаецца і цяпер: нацыянал-кансэрватарам няма розьніцы, на каго навешваць ярлыкі.

Гэтыя палітыкі бачаць сваю задачу не ў перакананьні грамадзтва і ягоным пераўтварэньні, не ў перацягваньні іншых палітычных сілаў на бліжэйшыя да сваіх пазыцыі, а ў захаваньні нацыянальнай ідэі ў яе чыстай форме. Што, на маю думку, не набліжае дэмакратычнай трансфармацыі. Перад намі зноў жа прыклад Украіны — такі слаўлёны палітыкамі КХП БНФ. Умовай гістарычнай перамогі нацыянальнага руху там у 2004 годзе было стварэньне шырокага фронту вельмі розных сілаў, часам далёка ня чыстых, нават такіх, проці каторых нашы мадамы з птушынымі прозьвішчамі здаюцца не бруднейшымі за шамякінскую гандлярку.

Калі канстатуецца вострая пагроза беларускай незалежнасьці (Пазьняк, Навумчык):

*З усяго, што я ведаю пра*



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Праз 15 гядоў многае бачыцца іначай.**

# будзьце рэалістамі

*так званую беларуска-расейскую інтэграцыю, гэтыя здымкі* (расейскага трыкалёру і арла ў палаце. — **Рэд.**) — *найбольш яскравае сьведчаньне таго, як далёка зайшоў працэс, які я ўсё ж вызначыў бы як анэксія. У сучасным сьвеце ня трэба (...) уводзіць дывізіі, каб узяць пад кантроль чужую тэрыторыю. Ёсьць мэханізмы палітычнага, эканамічнага, заканадаўчага паглынаньня (дарэчы, апошнім цяпер і занятая «палата», пасьлядоўна праводзячы «ўніфікацыю» беларускага заканадаўства пад расейскае),* — то лягічнай рэакцыяй было б шукаць тое, што паяднoўвае з самымі нямысьлімымі партнэрамі дзеля яе абароны, а зусім не выпячваньне таго, што падзяляе.

## Прагма і працэнты

Неўзабаве выйдзе з друку новая праца Валера Булгакава «Гісторыя беларускага нацыяналізму», яна цяпер друкуецца. Ён прыводзіць дзьве лічбы. На свабодных выбарах ва Ўстаноўчы сход 1917 году за Беларускую сацыялістычную грамаду прагаласавала ўсяго 0,5% выбарцаў. На наступных адносна свабодных выбарах 1994 году за беларускамоўных кандыдатаў на прэзыдэнта прагаласавалі ўжо цэлыя 23% выбарцаў. Для В.Булгакава гэта доказ таго, наколькі за XX ст. пашырыўся ўплыў нацыянальнае ідэі. На думку В.Булгакава, толькі наступныя свабодныя выбары, якія шчэ немавед калі адбудуцца, пакажуць, наколькі беларускі нацыяналізм умацаваўся ці аслабеў за гады лукашэнкаўшчыны. В.Булгакаў у апошнім — непрадрашэнец, у тым сэнсе, што ён дапускае магчымасьць і першага і другога ў залежнасьці ад інтэнсіўнасьці *прагмы* беларускага руху.


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Маючы рэпутацыю эканамічнага нацыяналіста, віцэ-прэм’ер Уладзімер Сямашка ніколі не гаворыць па-беларуску.**

В.Булгакаў не прыводзіць яшчэ адной лічбы, якая б моцна падкрэсьліла апошнюю ідэю. Паміж 1917-м і 1991-м было яшчэ некалькі часткова свабодных кампаній, у якіх удзельнічалі беларускія сілы. Маю на ўвазе выбары ў польскі сойм у Заходняй Беларусі. У 1922 годзе, усяго праз 5 гадоў пасьля правальнага выніку БСГ, беларускія кандыдаты атрымалі бліскучы вынік. Розьніца толькі ў тым, што 1) беларускія нацыянальныя сілы ішлі на іх арганізавана, чаго не было ў 1917-м, калі рухавік БСГ аказаўся адрэзаны лініяй фронту, 2) яны ішлі зь яснай для выбарцаў канкрэтнай эканамічнай праграмай, 3) яны ўмела выйгравалі на альянсах з палітычна блізкімі сіламі ўнутры і вонкі краіны (і з «калякінымі» ў тым ліку), 4) дзякуючы тым альянсам яны забясьпечылі сябе рэсурсамі (габрэйскія і нямецкія грошы, у прыватнасьці, — яны ішлі ў адзіным, вельмі стракатым сьпісе нацменшасьцяў). Яны дазвалялі сабе часам вольна трактаваць польскія законы і інтарэсы. Але яны нідзе ня здраджвалі нацыянальным беларускім інтарэсам! Хоць пры патрэбе і пад арлом сядзелі, тым іншым, «бялым», бачачы ў тым *прагма*тычную карысьць.

Яны ня ставілі перад сабой задачы ўзяцьця ўлады, бо былі нацыянальнай меншасьцю. Але калі б не прывабнасьць нацыянальнага руху ў тым, заходнебеларускім варыянце, не ягоная масавасьць, рызыкну дапусьціць, што да яго не далучыўся б малады суботніцкі селянін Янка Пазьняк, і тады хто б ведае, якія ідэі высьпелі ў галаве ягонага ўнука Зянона.

## Птушкі і гнёзды

«Цяперашняя задача ўсёй нашай беларускай супольнасьці — вярнуць Беларусі нацыянальную палітычную пэрспэктыву, каб мець будучыню», — піша З.Пазьняк. Правільна, але як тое зрабіць? Пакуль беларускія нацыяналісты будуць жыць з фантомнымі ўяўленьнямі пра сваіх палітычных праціўнікаў (і тым больш саюзьнікаў), пакуль яны ня ўзброяцца лепшаю, сучаснаю ведай, у тым ліку пра эканоміку (а яны ня ўзброяцца, дакуль для іх існуюць толькі тыя інтэлектуалы, якія ўваходзяць у іхныя партыйныя палітбюры), зрабіць тое будзе цяжка.

На ўвазе палітыкаў чакаюць новыя эканамічныя інтарэсы Беларусі, як бізнэсу, так і працоўных. Ня тых ідэальных, з падручнікаў эканомікі, з мрояў інтэлектуала-літаратара, а рэальных, якія працуюць на існых заводах, у сыліконавых далінах і калгасах, і тымі заводамі й далінамі распараджаюцца.

Той, хто зможа пагадзіць эканамічны нацыяналізм Сямашкаў і Чыжоў з культурнымі патрабаваньнямі маладое нацыянальнай сьвядомасьці, атрымае стабільныя палітычныя дывідэнды.

Гэта ня заклік да палітычнага апартунізму, а самая надзейная стратэгія забясьпечыць незалежнасьць нашай краіны, якая нам усім так дарагая. Іначай краіна будзе — пры нашых ці вашых — лятаць з адным крылом. Нацыянальная палітычная пэрспэктыва цэлай нацыі, не адной партыі, ня толькі нацыянальнага руху, беларускамоўных і расейскамоўных, міністраў і калгасьнікаў, залежыць ад нашага ўменьня пагадзіць той нацыяналізм з гэтай сьвядомасьцю.

# Інструкцыя па разлажэньні апазыцыі

У архівах «Штазі» ёсьць дырэктывы, якімі, магчыма, дагэтуль кіруюцца ў Беларусі. Піша **Алесь Кудрыцкі**.

Мірная рэвалюцыя 1989 г. у ГДР разбурыла ня толькі бэрлінскую сьцяну, але і іншага монстра — сакрэтную службу «Штазі» (так у народзе называлі Міністэрства дзяржаўнай бясьпекі). Арыгіналы дакумэнтаў, спрадукаваных гэтай службай за сваю амаль саракагадовую гісторыю, чытаюцца, як гісторыя псыхічнай хваробы істоты, якая пакутуе на маніякальную нянавісьць да свабоды. Праглядаючы іх, міжволі праводзіш паралелі зь беларускай рэчаіснасьцю.

Наколькі агульнымі і дубовымі мэтады «Штазі» былі спачатку, і якімі рафінаванымі яны зрабіліся напрыканцы існаваньня ГДР! Калі ў 50-я гады гэта былі банальныя арышты, то ад 70-х гадоў у практыцы «Штазі» шырока пачалася ўжывацца псыхалёгія. З краіны турмаў ГДР ператварылася ў краіну-турму, а кожны грамадзянін — у вязьня, скаванага ў камэры сваёй уласнай чарапной каробкі.

Страхам былі ахопленыя ўсе. «Масавая шызафрэнія» — так можна акрэсьліць стан ГДРаўскага грамадзтва, якое звонку выражала шчырую еднасьць з курсам партыі, падсьвядома ня верачы ва ўсё гэта.

«Апэратыўная псыхалёгія» — так на жаргоне Штазі называлася дысцыпліна, якая мусіла дапамагчы трымаць пад кантролем кожнага паасобку і ўсіх разам. Галоўная яе мэта — так званае «разлажэньне», падаўленьне ў асобах і групах здольнасьці да супраціўленьня і імкненьня да свабоды. Сваё лягічнае афармленьне «захады, скіраваныя на разлажэньне», атрымалі ў Дырэктыве нумар 1/76, зацьверджанай «Штазі» ў 1976 г.

## Зьнішчэньне асобы

Велізарная колькасьць супрацоўнікаў «Штазі» (91 000 штатных і больш за 100 000 «інфарматараў» па стане на 1989 г.) дазваляла весьці працу з 16-мільённым насельніцтвам ГДР ледзь ня тэт-а-тэт. З вальнадумцамі працавалі на трох узроўнях: спачатку стваралі ім псыхалягічную няўпэўненасьць, потым абмяжоўвалі волю, а ў скрайнім выпадку — ліквідавалі.

«Разлажэньне варожых элемэнтаў» пачыналася з забароны на працу, на вышэйшую адукацыю, на выезд за мяжу. Мэта — пазбавіць патэнцыйнага апазыцыянэра веры ў сябе. А яшчэ — пасяліць у душы страх. Звычайнай практыкай былі маўклівыя начныя тэлефанаваньні дахаты ды перасоўваньне мэблі і асабістых рэчаў у хаце, калі гаспадара не было дома. Як рэагаваць, калі кожны раз увечары пасьля працы ты знаходзіш тэлевізар у лазенцы? Ці калі ў кватэры рэгулярна нехта пераводзіць стрэлкі гадзіньнікаў? Ці калі пошта з газэтамі штораніцы ляжыць не ў паштовай скрыні, а на шафе ў калідоры, хоць уваходныя дзьверы замкнёныя?

Калі гэта ня дзейнічала, апазыцыянэр рана ці позна трапляў у турму, дзе рабіўся аб’ектам псыхалягічных катаваньняў. Усё: ад грубага абыходжаньня (да вязьняў зьвярталіся па нумарах іх камэраў-адзіночак), антыгігіенічных умоваў да катаваньня шумам ці сьвятлавымі эфэктамі, прымусовага гіпнозу і пазбаўленьня сну — мела на мэце прынізіць чалавека, зламіць яго волю, прымусіць яго адмовіцца ня толькі ад сваіх перакананьняў, але і ад сваёй годнасьці. Калі ж і гэта не дапамагала... Што ж, у дакумэнтах



WWW.RUNDE-ECKE-LEIPZIG.DE

**Нэгатывы апэратыўных здымак «Штазі».**




**Час памяняўся, інструкцыі засталіся? Менск, 25 сакавіка 2006.**

«Штазі» давядзеньне да самагубства нярэдка падаецца як лягічны вынік захадаў па «разлажэньні».

Дарэчы, псыхолягі сьцьвярджаюць, што наступствы псыхалягічных катаваньняў праяўляюцца ў ахвяры празь некалькі год — у выглядзе дэпрэсіяў, фобіяў і нэўрозаў. Але найбольшым выпрабаваньнем робіцца час пераменаў, калі людзі, якія адпакутавалі, разумеюць, што нават самы дэмакратычны лад ня здольны гарантаваць заслужанага пакараньня многім зь іх катаў.

## Падзяляй і ўладар

Мэтай «разлажэньня» апазыцыйных групаў было паралізаваць камунікацыйныя працэсы і ізаляваць іх ад грамадзтва. Дарэчы, не заўжды «Штазі» ставіла перад сабой «праграму-максымум». Часьцяком дастаткова было проста затлуміць людзям галаву, сапсаваць уражаньне ці настрой, каб прытармазіць справу супраціву. Прыклад: на паседжаньні апазыцыйнай царкоўнай групы падсадны агент гістэрычным голасам сьцьвярджае, што патрабаваньні вернікаў па дэмакратызацыі краіны... «заражаныя партыйнай мовай, а значыцца — заражаныя камунізмам». Пачынаюцца спрэчкі, якія адводзяць ад сутнасьці. Гэта зацягвае час, і ўрэшце грамада разыходзіцца, расчаравана хітаючы галовамі. Мэта «Штазі» дасягнута — людзі не змаглі дамовіцца.

Сакрэтная служба ГДР вельмі любіла інсьпіраваць скандалы ў мэдыях, рабіць гучныя выкрыцьці і часам нават «рассакрэчваць» сваіх агентаў — калі гэта магло стварыць супярэчнасьці ды сваркі ў колах вальнадумцаў. Хаця насамрэч змагацца з такім «разлажэньнем» было ня так і складана: варта толькі прааналізаваць, ці сапраўды праблема вартая спрэчкі і ці не адводзіць яна ад вырашэньня сапраўды важных пытаньняў. Аднак гэта ўдавалася не заўжды.

## Каты-ахвяры

«Штазі» была гермэтычным апаратам, які выключаў у сваіх супрацоўнікаў нават найменшы сумнеў у правільнасьці і пачэснасьці сваёй справы. Усе сродкі апраўдваліся «жорсткасьцю клясавай барацьбы». Найбольшы пласт афіцэраў Міністэрства дзяржбясьпекі ГДР належаў да пакаленьня «дзяцей вайны». Іх вэрбавалі яшчэ зь ліку піянэраў, пераконвалі, што тое, што яны перажылі — бамбёжкі, голад, сьмерць — не павінна паўтарыцца. Абы не было вайны, інакш кажучы. А для гэтага трэба абараняць сацыялістычную радзіму ад замежных і ўнутраных ворагаў, якія жадаюць рэваншу. Таму інструкцыі «Штазі» дазвалялі самыя нізкія сродкі, абгрунтоўваючы іх самымі

Працяг на старонцы 10.

# Інструкцыя па разлажэньні апазыцыі

Працяг са старонкі 9.

высокімі мэтамі. Аднак паступіўшы на службу, чалавек трапляў у тую самую турму — падпісваючы заяву ў «Штазі», ён цалкам адмаўляўся ад свабоды ў асабістым жыцьці. Нават пра новых сяброў трэба паведамляць у справаздачах, а каханак адбіраць паводле «службовых установак».

## Паталёгія мовы

Нямецкі псыхоляг Кляўс Бэнке, які адмыслова займаецца рэабілітацыяй ахвяраў «Штазі», кажа, што да яго раз-пораз зьвяртаюцца нават самі каты. Але хворымі яны сабе ня лічаць — афіцэры «Штазі» ў першую чаргу жадаюць «адмыць сумленьне» ці, дакладней, — апраўдаць сябе ва ўласных вачах. Зразумець, што служба ў «Штазі» ім самім нанесла псыхалягічную траўму, яны найчасьцей ня ў стане. А пераканацца ў гэтым лёгка — досыць хаця б наведаць «Круглы кут», былы цэнтар «Штазі» ў Ляйпцыгу, дзе сьцены абвешаныя парнапостэрамі, а на стале аднаго з афіцэраў ляжыць падзелка — драўляны чурбачок зь любоўна выпаленымі паяльнікам словамі «Кожнага трэцяга, хто будзе скардзіцца на жыцьцё, прыстрэлю. Двое ўжо былі».

Псыхолягі ўсур'ёз займаюцца аналізам прамоваў былога шэфа «Штазі» Эрыха Мільке. Іхнай галоўнай рысай была адсутнасьць мяжы паміж уяўным і рэальным. Няіснымі зьявамі ён апэраваў як фактамі, а сапраўдныя рэчы не заўважаў — прычым найбольш гэтая схільнасьць праяўлялася ў працоўных гутарках у цесным коле вышэйшых чыноў «Штазі». Нездарма Юрген Фукс, нямецкі псыхоляг і літаратар, якому давялося шмат пасядзець у засьценках ГДРаўскіх спэцслужбаў, сваёй галоўнай стратэгіяй лічыў не перайманьць мову катаў. Але і не маўчаць, бо слова дапамагае чалавеку застацца чалавекам.

**Алесь Кудрыцкі**

*Anatomie der Staatssicherheit. Geschichte, Struktur und Methoden. — MfS-Handbuch. — Herausgegeben von Siegfried Suckut, Ehrhart Neubert, Walter SьЯ,*
*Roger Engelmann, Bernd Eisenfeld, Jens Gieseke. Berlin, 2004*
*Кнігу ў электронным выглядзе і іншую інфармацыю можна знайсьці на сайце http://www.bstu.bund.de (Фэдэральны ўпаўнаважаны па матэрыялах службы дзяржаўнай бясьпекі былой ГДР)*

## З дырэктывы Міністэрства дзяржаўнай бясьпекі ГДР 1/76 па разьвіцьці і апрацоўцы апэратыўных захадаў (1976 г.)

...

Падмацаванымі пасьпяховай практыкай формамі правядзеньня працы па разлажэньні зьяўляюцца:

— сыстэматычная дыскрэдытацыя грамадзкай рэпутацыі, павагі і прэстыжу на падставе зьвязаных разам сапраўдных, правераных і дыскрэдытуючых фактаў, а таксама дадзеных, якія няпраўдзівыя, але праўдападобныя ці не выклікаюць сумневу і такім чынам таксама дыскрэдытуюць;

— сыстэматычная арганізацыя працоўных і грамадзкіх няўдачаў для падрыву веры вызначаных асобаў у саміх сябе;

— мэтанакіраваны падкоп пад перакананьні ў сувязі з пэўнымі ідэаламі, прыкладамі, і інш. з мэтай выклікаць сумненьні ў асабістых пэрспэктывах;

— стварэньне недаверу і ўзаемных падазрэньняў у групах, групоўках і арганізацыях з дапамогай мэтанакіраванага выкарыстаньня асабістых слабасьцяў асобных сяброў гэтых груповак;

— канцэнтраваньне высілкаў групаў, груповак і арганізацыяў на іх унутраных праблемах з мэтай абмежаваньня іх варожа–нэгатыўных дзеяньняў;

— стварэньне перашкодаў у прасторы і часе для камунікацыяў у групах, групоўках і арганізацыях з выкарыстаньнем дзейных, дазволеных законам нормаў, напр. з дапамогай умоваў працы, вызначэньнем аддаленых працоўных месцаў, і г.д.

Пры правядзеньні захадаў па разлажэньні варта выкарыстоўваць высоканадзейных, правераных, адпаведных для такіх задачаў НІ («нефармальных інфарматараў» — то бок «стукачоў». — **Заўв. Рэд.**).

Праверанымі практыкай сродкамі і мэтадамі правядзеньня захадаў па разлажэньні зьяўляюцца:



**Камэра-гузік, экспанат музэю «Штазі».**

— задзейнічаньне НІ ў якасьці начальнікаў, давераных асобаў кіраўніка групы, упаўнаважаных прадстаўнікоў структураў, зьвязаных зь дзейнасьцю групы, сувязных асобаў і г. д.;

— выкарыстаньне ананімных ці псэўданімных лістоў, тэлеграмаў, тэлефанаваньняў і інш.; выкарыстаньне кампрамэтуючых фота, у тым ліку як сапраўдных, так і інсцэнаваных сустрэчаў;

— мэтанакіраванае распаўсюджваньне чутак пра вызначаных асобаў, прыналежных да групы, групоўкі ці арганізацыі;

— наўмыснае рассакрэчваньне, напр. інсцэніроўка дэканспірацыі агентаў і апэратыўных захадаў Міністэрства дзяржаўнай бясьпекі;

— выклік асобаў у дзяржаўныя службы ці грамадзкія арганізацыі з прычынаў, якія выклікаюць давер ці, наадварот, выклікаюць недавер.

У залежнасьці ад канкрэтных умоваў пэўнай апэрацыі гэтыя сродкі і мэтады павінны творча і дыфэрэнцыявана выкарыстоўвацца, пашырацца і разьвівацца.

*Паводле кнігі «Анатомія Штазі. Гісторыя, структура і мэтады» (Бэрлін, 2004)*

# Несудзімы судзьдзя

Крымінальная справа за дапамогу ў дачы хабару супраць Дзьмітрыя Дземчанкі, былога гарадзенскага судзьдзі, вядомага па гучных працэсах над апазыцыянэрамі, закрытая. Піша **Ірына Чарняўка.**

Справа была распачатая ў студзені гэтага году з падачы КДБ. У ёй фігуруе сума 25 тысячаў даляраў, якая нібыта была перададзеная для судзьдзі Ленінскага раёну Горадні Дзьмітрыя Дземчанкі за тое, каб ён паспрыяў у скарачэньні тэрміну зьняволеньня для асуджанага. Справу супраць судзьдзі распачала Генэральная пракуратура з дазволу А.Лукашэнкі; Дзьмітры Дземчанка сышоў з пасады, і зь яго была зьнятая недатыкальнасць.

Імя Дз.Дземчанкі даўно ўпісана ў маніторынгі парушэньняў правоў чалавека. Праз гэтага маладога чалавека (Дземчанку 33 гады) прайшло мноства гарадзенскіх апазыцыйных ды грамадзкіх актывістаў і журналістаў — большасьць у адміністрацыйных, некаторыя ў крымінальных працэсах. Напрыклад, у 2002 г. ён судзіў 13 гарадзенскіх журналістаў, удзельнікаў пікету у абарону закрытай газэты «Пагоня», і даў шасьці зь іх ад 3 да 15 сутак арышту, а яшчэ чатыром — штрафы. Таму навіна пра справу супраць Дз.Дземчанкі выклікала пільную цікавасьць у дэмакратычным асяродку Горадні.

Пра тое, што Дз.Дземчанка больш не судзьдзя, першым даведаўся яго былы падсудны — лідэр рэспубліканскага страйкаму прадпрымальнікаў Валер Леванеўскі. У 2004 г. Дз.Дземчанка вёў справу пра «абразу прэзыдэнта», у якой В.Леванеўскі і яго намесьнік Аляксандар Васільеў былі асуджаныя на два і паўтара году зьняволеньня ў калёніях агульнага рэжыму. Выйшаўшы на волю ў траўні гэтага году, В.Леванеўскі напісаў у Гарадзенскую абласную пракуратуру заяву з патрабаваньнем прыцягнуць судзьдзю да крымінальнай адказнасьці за незаконны вырак. У адказе старшы сьледчы пракуратуры вобласьці паведаміў, што супраць Дз.Дземчанкі крымінальная справа ўжо ёсьць. А ў Ленінскім судзе дапытліваму прадпрымальніку распавялі, што Дз.Дземчанка там не працуе, «звольніўся на ўласнае жаданьне».

Пачатак крымінальнай справе супраць судзьдзі дала заява бацькі 20-гадовага хлопца, асуджанага на 8 год зьняволеньня за продаж марыхуаны. Мужчына распавёў, што ад чэрвеня да верасьня 2005 г. перадаў праз «пасярэдніка», знаёмага прадпрымальніка, 25 тысячаў даляраў судзьдзю Дз.Дземчанку, які паабяцаў паспрыяць, каб у касацыйнай інстанцыі, абласным судзе, сыну скарацілі тэрмін зьняволеньня. (Цікавая падрабязнасьць пра стасункі «пасярэдніка» і судзьдзі: годам раней Дземчанка вёў супраць гэтага прадпрымальніка працэс і за махлярства адправіў на «хімію», якую пасьля замянілі на папраўчыя працы. Пазьней, паводле словаў Дз.Дземчанкі, — яны спатыкаліся некалькі разоў у адных кампаніях.)

Аднак касацыя паводле справы 20-гадовага хлопца была прайграная, Вярхоўны суд таксама прысуду не зьмяніў — і бацька пачаў патрабаваць ад Дз.Дземчанкі свае грошы назад.

У лістападзе судзьдзя аддаў бацьку 13 тысячаў даляраў, сказаўшы, што менавіта столькі яму перадаў «пасярэднік». Некалькі тыдняў мужчына штодня, як на працу, хадзіў да судзьдзі, патрабаваў астатнія 12 тысячаў, папярэджваў, што зьвернецца ў «органы» — і пры гэтым запісваў свае зь ім размовы на дыктафон. У студзені, так і не дабіўшыся астатніх грошай, бацька зьвярнуўся ў КДБ.

Падазраваных у справе адразу аказалася двое: «пасярэднік» ды судзьдзя Дз.Дземчанка. Статус у іх быў розны, дый павялі сябе яны па-рознаму. Таму розным стаўся іх лёс.

Дземчанка — судзьдзя, справы супраць судзьдзяў распачынае Генэральная пракуратура, атрымаўшы дазвол «органу, які прызначае на пасаду». Орган гэты ў Беларусі — прэзыдэнт. Да таго ж у тым самым студзені Дземчанка прыйшоў у КДБ «з павіннай» і ад свайго ўдзелу ў перадачы хабару не адмаўляўся. Таму і сьледзтва ў дачыненьні да яго было празь пяць месяцаў спыненае, таму і на судовым працэсе ён праходзіў ужо сьведкам.

«Пасярэднік» жа віны свае не прызнаў і па факце хабару падчас сьледзтва і на судзе паказаньні даваць адмовіўся. Таму ўвесь цяжар абвінавачаньняў лёг толькі на яго. На працэсе ён стаўся адзіным абвінавачаным, і на падставе паказаньняў сьведкаў у пачатку жніўня быў асуджаны на 8 год зьняволеньня — за «махлярства» і «падбухторваньне да дачы хабару».

Аднак ні за паўгоду сьледзтва, ні ў судзе так і не прагучала яснага адказу на галоўнае пытаньне: дзе грошы, дзе тыя зьніклыя 12 тысячаў?

Схему, паводле якой адбываўся «рух капіталу», апісаў сам Дземчанка ды іншыя сьведкі ў сваіх паказаньнях на адкрытым судовым працэсе над «пасярэднікам».

Бацька кажа, што ў чэрвені 2005 г. перадаў «пасярэдніку» для Дземчанкі 3 тысячы, у жніўні — 20 тысячаў, у верасьні — 2 тысячы даляраў. Дземчанка распавёў, што атрымаў ад «пасярэдніка» спачатку 8 тысячаў, а пасьля 5 — ды перадаў усю суму іншаму судзьдзю, назавём яго Z. У лістападзе, калі бацька асуджанага хлопца стаў патрабаваць грошы назад, Z, паводле паказаньняў Дземчанкі, гэтыя 13 тысячаў вярнуў, і Дземчанка аддаў іх бацьку. На допытах падчас сьледзтва Z адразу і катэгарычна заявіў, што ня меў ніякага дачыненьня да гэтай гісторыі. І хоць спасылка на яго паказаньні ёсьць у шэрагу дакумэнтаў — у крымінальнай ды судовай справе ён аніяк не праходзіць.

У такой трактоўцы карупцыйны ланцужок абрываецца менавіта на Дз.Дземчанку. Але, выносячы вырак, суд палічыў, што гэтая сума асела менавіта ў «пасярэдніка».

Цяпер асуджаны «пасярэднік» рыхтуецца да касацыі ў гарадзенскім сьледчым ізалятары. Z застаецца на сваёй пасадзе і працягвае працаваць судзьдзём. Дз.Дземчанка ўладкаваўся на працу ва ўпраўленьні прыватызацыі Гарадзенскага аблвыканкаму.

*Горадня*

# Камэта-мятла

**Алег Дзярновіч** піша пра абскурантызм палітыкаў і астролягаў.

У жніўні 2006 г. прэзыдэнт Асацыяцыі авэстыйскай астралёгіі Павал Глоба назваў Беларусь цэнтрам Эўропы і паабяцаў нязьменнасьць курсу краіны, прынамсі, да 2016 г. Галоўным астралягічным аргумэнтам гэтага прагнозу, шырока прадубляванага беларускімі ды расейскімі мэдыямі, стала тое, што Аляксандар Лукашэнка прыйшоў да ўлады ў 1994 г., «калі адбылася найрадчэйшая зьява — на Юпітэр упала камэта і раскалолася на 22 кавалкі».

17 траўня 1994 г. арбітальны тэлескоп Габл (HST) зьняў фантастычнае відовішча гэтай катастрофы сапраўды касьмічнага маштабу — на падлёце да Юпітэра зь ягонымі пастэльнымі колерамі чырвоныя фрагмэнты камэты расьцягнуліся на даўжыню 1,1 млн кілямэтраў, а гэта тры інтэрвалы паміж Зямлёй і Месяцам. Глоба, як гэта ў яго часта здараецца, паблытаў «дэталі» — фрагмэнтаў было не 22, а 21, і ўтварыліся яны не ад сутыкненьня з плянэтай, а менавіта самі фрагмэнты камэты P/Shoemaker у дарылі па Юпітэру. Вельмі цікавай, нават для атмасфэры паноўнага ў Беларусі абскурантызму, стала сама практыка выкарыстаньня астралягічных прагнозаў для прадказаньня палітычнай сытуацыі.

У тыя ж самыя жнівеньскія дні майго астралягічнага знаку Льва ў 2006 годзе мне ў рукі трапіла выданьне перакладу з польскай на расейскую мову кнігі сэнатара Рэчы Паспалітай XVIII ст. Яна Малахоўскага, які быў аматарам астраноміі і астралёгіі. Малахоўскі зрабіў апісаньне камэты Шэзо, якую назіралі ў небе з 10 студзеня па 3 сакавіка 1744 г. Аўтар з высокай дакладнасьцю назваў каардынаты камэты і апублікаваў каталёг вядомых на той час камэтаў ад Стварэньня сьвету да XVIII ст., а ў ягоных камэнтарах можна пабачыць, як завострывалася мастацтва палітычнай сатыры.

Камэта Шэзо была вельмі нязвыклым аб’ектам і найярчэйшай камэтай XVIII ст. — яе галаву бачылі нават удзень. У некаторых месяцах назіраньня камэта мела 6 хвастоў, што было, магчыма, зьвязанае з пэрыядычнымі выкідамі зь ядра.

Але і лёс зьяўленьня перакладу працы Малахоўскага абстаўлены дзіўнымі знакамі. Укладальнік знайшоў фаліянт у Фондзе Радзівілаў Нацыянальнага гістарычнага архіву Беларусі. Амаль адначасова з Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі зьніклі кнігі, сярод якіх была праца Готфрыда Гойнзіюса «Апісаньне камэты, якая зьявілася ў 1744 годзе...», што нарабіла вялікага шуму ў прэсе. Так, гэтыя дзьве кнігі прысьвечаныя адной і той жа камэце Шэзо.

Вышэй я напісаў «укладальнік» кнігі. Потым жа высьветлілася, што гэта ўкладальніца — менскі астроляг Галіна Гайдук. Ва ўсёй жа кнізе я не знайшоў яе поўнага імя. Існуе такая кніжная традыцыя, замацаваная ў савецкія часы, калі на вокладку выносяць толькі ініцыялы і чытач не заўжды можа граматычна правільна праскланяць імя аўтара, бо ня ведае, хто гэта — жанчына ці мужчына. Увогуле, да рэдактуры выданьня шмат іншых заўваг. Напрыклад, укладальніца піша пра супрацоўніцтва з «славяністкай» Пацехінай. Напэўна, на пачатковых стадыях мелася на ўвазе «паляністка», але потым узьнікла новае слова, якога няма ў слоўніках (там ёсьць толькі «славістка»). Далей усё ж робіцца зразумелай гэтая фройдаўская памылка, бо Галіна Гайдук спрабуе разважаць пра «славянскую астралёгію», залічыўшы сюды і Малахоўскага. Нават аналіз прадмовы да кнігі сьведчыць, наколькі беспэрспэктыўныя гэтыя спробы. Мы можам казаць пра эўрапейскую астралёгію ці, напрыклад, пра авэстыйскую традыцыю ў астралёгіі, але вылучэньне асобнай славянскай астралёгіі выглядае цалкам штучна.

Асноватворная ідэя астралёгіі заключаецца ў тым, што прасторава-часавая арганізацыя зьяваў і аб’ектаў анізатропная, гэта значыць неаднолькавая, і кожны момант часу ўнікальны паводле сваіх глыбінных праяваў. Такім чынам, згодна з астралёгіяй, вывучаючы асаблівасьці момантаў часу, можна вызначыць тэндэнцыі далейшага разьвіцьця зьяваў і аб’ектаў. Астролягам, што ставяць свае мэтады на службу асобным палітычным рэжымам, я хацеў бы прыгадаць словы Яна Малахоўскага, якімі ён скончыў сваю кнігу: «Бачачы гэтае прадвызначэньне ды падпарадкоўваючыся знакам... няхай шчыра цяпер аддаюцца Богу, каб не атрымалі па галаве мятлой».

**Малаховский, Ян. Экспериментальная практика о кометах** / Пред. и коммент. Г.В. Гайдук; Пер. с польск. Е.А. Потехиной. — Минск: РІВШ, 2006. — 120 с.: ил.



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Узаконенае цемрашальства спараджае сон розуму. Малебен пратэсту супраць ідэнтыфікацыйных нумароў у пашпартах. Менск, 2005.**

# Звольнены настаўнік прыкуў сябе да слупа

Алесь Чыгір: Такія акцыі заўсёды маюць плён.

Алесь Чыгір, настаўнік гісторыі з Бабруйску, у мінулы чацьвер прыкуў сябе да ліхтарні на галоўнай плошчы гораду. Так ён пратэставаў супраць свайго звальненьня з працы. Так яго пакаралі за ўдзел у Дні Волі. У руках гэты бацька трох дзяцей трымаў плякат з вытрымкай з арт.41 Канстытуцыі аб праве на працу.

Яго затрымалі і груба (**на фота**) адвалаклі ў машыну. З прымяненьнем грубай фізычнай сілы былі затрыманыя і прысутныя журналісты.

Сярод іх была наша фотакарэспандэнтка, ляўрэатка сёлетняй прэміі імя Завадзкага Юлія Дарашкевіч. Супрацоўнік міліцыі падпалкоўнік Сяргей Глушко балюча заламаў ёй рукі. Сярод затрыманых былі таксама Сяргей Пульша («БелаПАН»), Паўлюк Канавальчык («Навінкі»), Валер Ляўкоў («Труд»), а таксама журналісты «Салідарнасці», «Бабруйскага кур'ера», усяго 11 чалавек.

«НН» узяла бліц-інтэрвію ў затрыманага Алеся Чыгіра проста ў пастарунку.

**Алесь Чыгір:** Кожны чалавек мае права бараніць свае правы. Калі я як дэпутат гарсавету не магу абараніць свае правы, як я магу бараніць правы сваіх выбарцаў?

**«НашаНіва»: Як Вы лічыце, ці мела гэтая акцыя плён?**

**АЧ:** Такія акцыі заўсёды маюць плён, бо гэтым мы адваёўваем тэрыторыю свабоды. Тое, што мяне затрымалі празь дзесяць хвілін пасьля пачатку акцыі, сьведчыць, што ўлады баяцца, каб людзі ня ўбачылі, што ў краіне ёсьць людзі, якія бароняць свае правы.

**«НН»: Якіх Вы чакаеце наступстваў?**

**АЧ:** Наступствы мяне асабліва не хвалююць. Мяне хвалюе лёс краіны.

**«НН»: Што плянуеце рабіць далей?**

**АЧ:** Далей я пляную перамагаць.

Цяпер Чыгір напісаў у Фэдэрацыю прафсаюзаў Беларусі заяву, у якой просіць дапамагчы ў аднаўленьні на працы. У тое, што прафсаюз хоць неяк адрэагуе на сытуацыю, Чыгір ня верыць, але, паводле яго словаў, ёсьць пэўны альгарытм дзеяньняў, у выніку чаго ягоная справа можа быць разгледжаная Міжнароднай арганізацыяй працы (МАП). Цяпер над афармленьнем адпаведных папераў працуюць юрысты.

Тымчасам у пракуратуры знаходзяцца паперы на самога Чыгіра — 1 верасьня, на наступны дзень пасьля пратэсту, Чыгіра выклікалі позваю даць тлумачэньні. Праваахоўныя органы вырашаюць, ці прыцягваць Чыгіра да адміністрацыйнай адказнасьці за парушэньне закону «Аб правядзеньні масавых мерапрыемстваў».

**АГ**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Толькі ў Беларусі вырашыцца лёс Беларусі

Алесю Аркушу адказвае Ўладзімер Лобач.

Чытаючы развагі Алеся Аркуша пад назовам «Замежжа — наш саюзьнік і база» («НН», №32), раптам адчуў, нягледзячы на сур'ёзнасьць тэмы, як у пакоі маім зьявіліся цені Астапа Бэндэра і яго нягеглага памагатага Кісы Вараб'янінава зь іх звонкім: «Заграніца нам дапаможа». Як вядома, літаратурныя героі няблага зарабілі на гэтым лёзунгу, таленавіта ўдаючы дзеяздольную і маральна сьпелую апазыцыю існаму рэжыму.

Шлях, прапанаваны сп.Аркушам, — гэта «выхад за межы Беларусі, пашырэньне беларускага поля». Пры гэтым аўтар вельмі неабачліва чапляецца за глябалізацыю як за нібыта праўдзівы і аб'ектыўны аргумэнт на карысьць разьвітаньня з Радзімай: «У сёньняшні век глябалізацыі насамрэч неістотна, дзе чалавек фізычна жыве, ці ў самой Беларусі, ці па-за яе межамі: галоўнае, каб ён знаходзіўся ў беларускім дыскурсе, удзельнічаў у беларускім жыцьці». Бясспрэчна, малоху глябалізацыі зусім няма розьніцы, дзе чалавек зарабляе сабе на жыцьцё: у Беластоку, Полацку ці Таронта. Але пры гэтым вір глябалізацыі, укручваючы сусьветную этнакультурную разнастайнасьць у мярцьвяна-гамагенную прастору ўсёабдымнага «вольнага рынку», прынцыпова ігнаруе такія загадкавыя словазлучэньні, як «беларускі дыскурс», «беларускае жыцьцё». І хай ня цешыць сябе ілюзіямі сп.Аркуш — «дэмакратыі», якая зацікаўлена ў бесьперастанных пастаўках газу й нафты з Расеі ў Заходнюю Эўропу, усё адно, на якой мове гаворыць насельніцтва транзытнай тэрыторыі ад Віцебску да Берасьця, якую каляровую гаму мае сьцяг над Домам ураду ў Менску.

«Важна іншае, — бароніць «каліноўцаў» Алесь Аркуш, — каб яны засталіся ў Польшчы беларусамі і не згубіліся для Беларускай Справы, нават калі й ня вернуцца на радзіму». Такім чынам, аўтар спрытна разводзіць Беларускі Дом зь нейкай, спасьціжнай толькі яму, «Беларускай Справай». Нібыта мэханізатар з-пад Бегам'я, настаўніца з Мазыра і будаўнік з Капыля, не скарыстаўшы з парады «выносіць беларускую справу за межы самой краіны, туды, дзе ёсьць для яе спрыяльныя ўмовы, найлепш у суседнія краіны — у Польшчу, у Літву, Украіну», расьпісваюцца ў тым, што ад рана да рана займаюцца справай выключна антыбеларускай.

Спасылкі на Севярынца ў тэксьце выглядаюць недарэчна, бо Паўлу хапіла мужнасьці й веры не шукаць «спрыяльных умоваў» у суседніх краінах (хоць рэальных падставаў для палітычнае эміграцыі яму ставала ня менш, чым для ўсіх «каліноўцаў» разам узятых), а застацца ў Беларусі. Бо як, на заклік сп.Аркуша, можна пашыраць беларускае поле за мяжой, калі быльнягом парастаюць палеткі ля тваёй хаты? У гэтым сэнсе чыстай гістарычнай спэкуляцыяй у дні сёньняшнім ёсьць і такое сьцьверджаньне, што «і Польшча, і Літва, і Ўкраіна — ніякае для нас не замежжа. Мы жылі сотні гадоў поруч, часам у супольных дзяржавах». Замежжа! Бо мы ад багоў і Дзядоў маем Свой Дом. І, як на тое пайшло, чаму ў пераліку няма Расеі?

Ня трэба шукаць прыгожых словаў на апраўданьне ўласнай жыцьцёвай прагматыкі. Беларускі Дух жыве толькі ў Беларускім Доме; у чужых кватэрах ён, у лепшым разе, ператвараецца зь цягам часу ў назольны пах.

*Полацак*

Скарочана. Загаловак ад Рэдакцыі. Аўтарскі загаловак: «Сьпірытычны сэанс па-за роднаю хатай». Поўны тэкст апублікаваны на сайце nn.by.

# Два словы пра Мілінкевіча і Фядуту

**У параўнаньні «працаўладкаваньня» Віктара Лукашэнкі і Вітаўта Мілінкевіча (№32) сп.Фядута не карэктны, паколькі ўладкаваньне на працу і адсыланьне па навуку – рэчы ня цалкам тоесныя. Акрамя таго, сын Мілінкевіча карыстаецца праграмай Каліноўскага на агульных умовах, чаго ня скажаш пра працаўладкаваньне Віктара Лукашэнкі.** Вітаўт Мілінкевіч мае поўнае права ўдзельнічаць у праграме Каліноўскага, бо адпавядае ўсім яе патрабаваньням (напрыклад, быў актыўны на Плошчы і быў затрыманы). Заява Мілінкевіча-старэйшага: «З майго сына павінны патрабаваць, як зь любых іншых» — укладваецца ў сыстэму дэмакратычных вартасьцяў.

Якраз сп.Фядуту не выпадае вучыць Мілінкевіча маральнасьці ў грамадзкім захаваньні. Мілінкевіч разам з сынамі змагаўся на Плошчы, у той час як сп.Фядуты там не было. Адсюль вынікае, што роля руплівы грамадзкай маралі сп.Фядуту, мягка кажучы, ня надта пасуе.

**Аляксандар Краўцэвіч, Горадня**

**Ад Рэдакцыі.** Тэма праграмы Каліноўскага, якая дазваляе рэпрэсаваным у Беларусі студэнтам вучыцца за мяжою, працягвае выклікаць найбольшую колькасьць водгукаў наведнікаў сайту nn.by. Прапануем урыўкі з камэнтароў, пакінутых чытачамі гэтага ліста сп.Краўцэвіча.

**харошы чалавек напісаў(ла) Верасень 4, 2006 у 23:24**

Я таксама выпіваў, курыў, быў ганарысты і не беларускі на людзях, калі вучыўся. Усё гэта мала сьведчыла пра маю асобу.

**kaciarynka напісаў(ла) Верасень 4, 2006 у 20:40**

Фядута закрануў, безумоўна, балючае пытаньне пра маральны капітал лідэра апазыцыі. Што ведае адзін — заўтра будзе ведаць 10, а пасьлязаўтра — 100... Калі бацька = (чалавек і палітык) Мілінкевіч зьбіраецца кіравацца ў жыцьці тымі ж прынцыпамі, як і Лукашэнка, тады навошта беларусам перамены?

**Сіліцкі напісаў(ла) Верасень 5, 2006 у 5:58**

Спадар Фядута, давайце разбярэмся, што мы крытыкуем. Ці вылучаем мы абвінавачаньні кіраўнікам праграмы Каліноўскага за нізкае маральнае аблічча ўдзельнікаў праграмы?.. Дык вось, умоўна кажучы, чалавек можа прымаць удзел у акцыях супраціву і пры гэтым пры выпадку прапусьціць паўлітра ў кампаніі. Я не кажу, што гэта добра. Але наконт гэтага нашых апазыцыянэраў нядаўна вельмі дакладна і «ў тэму» пакрытыкаваў Павал Севярынец. Вось нармальнай, зьмястоўнай крытыцы, а не правакатарству, я б раіў вам у яго павучыцца. Зь іншага боку, растлумачце, нават калі ўсё, аб чым вы казалі, праўда — чым удзельнікі праграмы Каліноўскага адрозьніваюцца ад студэнтаў любога ўнівэрсытэту, уключна з Стэнфардам, адкуль выйшлі некалькі дзясяткаў Нобэлеўскіх ляўрэатаў, якія (студэнты, а не ляўрэаты), паверце мне, бухаюць кожную пятніцу? Чым яны розьняцца ад беларускіх студэнтаў у дзяржаўных ВНУ, якія п'юць ня менш? Ці не атакуеце вы іх за тое, што, у прынцыпе, уласьціва маладым людзям? І ці ўваходзіць праверка маральных якасьцяў у кампэтэнцыю кіраўнікоў праграмы? Ці павінны яны, як за савецкім часам, зьбіраць аб'ектыўкі, характарыстыкі, патрабаваць хадзіць па вуліцах утраіх і каб адзін быў член партыі? Праверыць «маральныя якасьці» можа толькі таталітарны апарат, а мы размаўляем аб дэмакратычнай праграме. Можна казаць, што ня так выхавалі, што ў нас культура такая, аднак пры чым тут прэтэнзіі да праграмы Каліноўскага? Можна толькі адсякаць і пазбаўляць тых, хто правініўся. Часткова гэта адбываецца, і давайце заўчасна рабіць высновы ня будзем. Цяпер да размоваў пра «ненацыянальнасьць» удзельнікаў. Тут мы вас і зславілі, Фядута! Памятаеце дыскусіі пра «Нямецкія хвалі» і нацыяналізм, што размаўляе па-расейску? Вы ж разумееце, што ў Беларусі той, хто выходзіць на вуліцы, можа па-беларуску і не размаўляць. Дык што, цяпер ВЫ за нацыяналшавінізм?

**блямба напісаў(ла) Верасень 5, 2006 у 16:13**

За ўсёй дыскусіяй вакол праграмы Каліноўскага адчуваюцца нейкія гэбісцкія карані. Трэба б «Ніве» быць асьцеражнейшай з гэтым усім.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Напішы палітвязьню

Яму цяпер цяжка. Твой ліст можа выратаваць яго.

220050 Менск, вул. Валадарскага, 2, СІЗА №1, Казуліну Аляксандру.

220050 Менск, вул. Валадарскага, 2, СІЗА №1, кам93, Дранчуку Цімоху.

220050 Менск, вул. Валадарскага, 2, СІЗА №1, кам 187, Астрэйку Міколу.

211652 Віцебская вобласьць, Полацкі раён, п.а. Малое Сітна, да запатрабаваньня, Севярынцу Паўлу.

212002 г. Магілёў, вул. Пушкіна, 65, ПУОТ №43, пакой 211, Фінькевічу Артуру.

247511 Гомельская вобласьць, Рэчыцкі раён,

в.Баршчоўка, ВУАТ №22, Клімаву Андрэю.

Пухавіцкі раён, вёска Блонь, Статкевічу Мікалаю.

211791 Віцебская вобласьць, Глыбокае–1, ВК–13, атрад №7, Круку Івану.

# Падпольнае сьвята

На Дзень ведаў сталічная моладзь пратэставала супраць русіфікацыі адукацыі.




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**На плошчы Якуба Коласа незарэгістраваная «Моладзь БНФ» зладзіла цэлы спэктакль.**

1 верасьня адбылася ўрачыстая лінейка ў Беларускім гуманітарным ліцэі, на плошчы Якуба Коласа закатавалі гісторыю Беларусі, а родная мова на праспэкце Пераможцаў прасіла дапамогі ў мінакоў.

Для беларусаў 1 верасьня сталася ўжо ня проста сьвятам ведаў, а днём свайго натуральнага жаданьня вучыцца на роднай мове. Таму і сёлетні Дзень ведаў быў багаты на акцыі супраціву.

Беларускі гуманітарны ліцэй імя Якуба Коласа працягвае сваё забароненае жыцьцё. 1 верасьня ў ім адбылася ўрачыстая лінейка. Нагадаем, што ўлады ў 2003 г. закрылі гэтую навучальную ўстанову. Выкладчыкі, навучэнцы і іх бацькі ня склалі тады рук.

Дарма што ішоў дождж, на дзень ведаў а 10-й раніцы некалькі дзясяткаў навучэнцаў сабраліся ля брамы будынку на Кірава, 21, які раней належаў Ліцэю і дзе цяпер месьціцца суд Цэнтральнага раёну Менску. Спачатку зь невялікім уступным словам выступіў дырэктар Уладзімер Колас, які запэўніў, што гэтая ўнікальная навучальная ўстанова працягне сваю дзейнасьць у любых, нават самых неспрыяльных умовах. Потым хлопцы і дзяўчаты разам выканалі ліцэйскі гімн і ўсклалі белыя і чырвоныя кветкі да агароджы будынку.

У.Колас паведаміў, што заняткі ў Ліцэі пачнуцца толькі 18 верасьня, і пакуль няма ніякай пэўнасьці, дзе яны будуць праходзіць. Нягледзячы на ўсе складанасьці, твары ліцэістаў зіхацелі ад усьмешак, ад сустрэчы зь сябрамі і знаёмцамі.

Празь нейкую гадзіну на плошчы Якуба Коласа адбыўся яркі пэрформанс.

Чатыры рослыя хлопцы выцягнулі на пляц насьпех



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Сустрэча ліцэістаў-коласаўцаў ля будынку на вуліцы Кірава.**

зробленую шыбеніцу і адышлі ўбок. Адначасова з боку салёну «На ростанях» выйшаў чырвона-зялёны кат, які меў з сабой імправізаваны бел-чырвона-белы падручнік. З аднаго боку на ім было напісана «Гісторыя Беларусі. 10 кляса», а з другога — «Беларуская мова». На вачох у Якуба Коласа кат правёў экзэкуцыю над гэтым падручнікам.

Міліцыянты зьявіліся на пляцы тады, калі ўсе ўдзельнікі пэрформансу пасьпелі разьбегчыся па сваіх справах. Яны зламалі шыбеніцу на часткі, акуратна склаўшы рэчдоказы ў МУСаўскі «козьлік».

Пасьля заняткаў маладыя людзі выйшлі на праспэкт Машэрава. Некаторыя зь іх былі апранутыя ў адмысловыя строі з надпісам «Беларуская мова». Яны прасілі ў людзей паставіць свае подпісы пад тым, каб вывучэньне гісторыі Беларусі ў школах вялося на роднай мове. За паўтары гадзіны юнакі назьбіралі каля 200 подпісаў.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Беларуская мова зьбірала подпісы на вуліцах Менску.

Арганізатары гэтай акцыі казалі, што малаімаверна, што гэтыя подпісы дадуць нейкі вынік. Галоўнай мэтай акцыі было інфармаваньне грамадзянаў, якія, на жаль, далёка ня ўсе ведаюць, што ў школах гісторыю Беларусі з гэтага году пачынаюць выкладаць па-расейску, а беларускую мову чакае правапісная рэформа. Хоць і не ў вялікім аб'ёме, але гэтая мэта была дасягнутая.

Важна памятаць аб праблемах, зьвязаных з навучаньнем, ня толькі 1 верасьня, але і на працягу ўсяго году, бо ад разумных і прыгожых дзяцей залежыць шмат у нашай краіне і ва ўсім сьвеце.

**Зьміцер Панкавец**


ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

## ПОШТА РЭДАКЦЫІ

### Ліст з Кармянскага раёну

**Беларуская школа на вёсцы? А вы, шаноўнае спадарства, бачылі хоць адну беларускую школу (ня будзем чапаць Менску), дзе выкладаньне вялося б цалкам на беларускай мове?** Але самае страшнае зусім ня гэта: у "беларускіх школах" наагул няма сапраўдных настаўнікаў-патрыётаў, якія б штодня размаўлялі па-беларуску. А то выходзіць, што настаўнікі т.зв. беларускай школы вучаць дзетак любіць матчыну песьню, заклікаюць любіць і шанаваць родную культуру і гісторыю, а як толькі заканчваецца ўрок, то адразу пераходзяць на "любімую" расейскую мову. Ці яшчэ "лепей" — "трасянку". Паступова ў дзяцей закладваецца комплекс "непаўнавартаснасьці": яны баяцца размаўляць па-беларуску, бо іх настаўнікі здрадзілі беларушчыне; яны баяцца змагацца за свае эканамічныя і палітычныя правы, бо іх настаўнікі і бацькі "за грошы" здалі Беларусь у "фашысцкі" палон.

Дзеці стараюцца быць падобнымі да дарослых. І калі вы прымушаеце сваіх дзяцей уступаць у БРСМ ці гоніце іх да пасольства Польшчы, Нямеччыны з антыпольскімі і антыгерманскімі лёзунгамі, то вы, даражэнькія, становіцеся ня толькі здраднікамі Беларусі-маці, але і яе акупантамі і катамі.

Я рад за тых дзяцей, якія выйшлі ў сакавіку 2006 г. на пляц Волі бараніць нашу Свабоду. Я нізка схіляюся перад тымі настаўнікамі, якія ня толькі падтрымалі сваіх вучняў у гэты момант, але і перадалі бел-чырвона-белы сьцяг у рукі маладога пакаленьня бараніць ідэі Кастуся Каліноўскага, Міколы Ермаловіча.

Дзякуй вам, дарагія юнакі і дзяўчаты, што вы ёсьць у нас, што не баіцеся катаў і здраднікаў Беларусі, што вы выйшлі бараніць свабоду і незалежнасьць нашай Бацькаўшчыны. Старэйшае пакаленьне забыла, хто ў краіне гаспадар, унукі — не забылі, бо яны заўсёды памяталі і памятаюць духоўны запавет Кастуся Каліноўскага: "Толькі тады, народзе, зажывеш шчасьліва, калі над табой маскаля больш ня будзе!"

**Юры Мянькоў, настаўнік, вёска Баравая Буда**

# Нас чакае зьезд “За незалежнасьць”

Тэма незалежнасьці Беларусі зноў трапіла ў эпіцэнтар грамадзкай увагі. Спачатку Аляксандар Мілінкевіч выступіў з зваротам да беларускага народу, у якім папярэдзіў пра небясьпеку правядзеньня рэфэрэндуму пра “канстытуцыйны акт саюзнай дзяржавы”. Мілінкевіч піша, што фактычна ставіцца пытаньне, ці будзе існаваць Беларусь.

Ён малюе нярадасную пэрспэктыву, якая чакае беларусаў у выпадку далейшай інтэграцыі з Расеяй: “Аб’яднаемся – і нашы дзеці будуць ваяваць у Чачні, і скупяць нашыя прадпрыемствы і зямлю іхнія алігархі, і прыйдуць да нас іхнія мафія і злачынцы, і станем мы глыбінкай Расеі, дзе жывуць куды бядней, чым сёньня ў нас”. Мілінкевіч не называе крыніцаў, зь якіх ён мае зьвесткі пра пагрозу беларускай незалежнасьці.

5 верасьня Партыя БНФ прапанавала правесьці форум “За незалежнасьць”, старшынём аргкамітэту якога меркавана будзе менавіта Аляксандар Мілінкевіч. Старшыня ПБНФ Вінцук Вячорка адзначыў, што правядзеньне форуму магчымае ўжо пры канцы кастрычніка, а яго асноўнымі мэтамі будзе кансалідацыя ўсіх незалежніцкіх сілаў. Вячорка гаворыць, што пытаньне аб магчымым рэфэрэндуме ніколі не здымалася з парадку дня ў аб’яднанай апазыцыі. Разам з тым ён ня змог уцямна патлумачыць, чаму правядзеньне форуму заплянаванае менавіта зараз.

У аўторак інфармацыйнае агенцтва БелаПАН паведаміла, што падчас працы форуму “За незалежнасьць” можа быць утвораны і аднаіменны блёк на чале з тым жа Аляксандрам Мілінкевічам. У такім разе гэта будзе свайго роду кампэнсацыя за так і ня створаны Рух “За Свабоду”.

Не сакрэт, што ён не паўстаў праз сабатаж партыйных лідэраў, што баяліся аслабленьня сваіх пазыцый. У колах блізкіх да Мілінкевіча спадзяюцца, што больш вольная форма блёку знойдзе згоду Вячоркі, Статкевіча, Палевіковай ды іншых партыйцаў.

Намесьнік старшыні ПБНФ Аляксей Янукевіч пацьвердзіў, што перамовы аб стварэньні такога блёку ўжо пачаліся й будуць весьціся з рознымі сіламі: ад КХП-БНФ да сацыял-дэмакратаў.

Пакуль цяжка даць адназначны адказ, наколькі прадстаўнічым будзе форум “За незалежнасьць”. Адзін зь лідэраў АГП Аляксандар Дабравольскі ўранку ў сераду яшчэ ўвогуле нічога ня чуў пра гэтую ідэю.

**Зьміцер Панкавец**

# Мілінкевіч: Радзіма ў небясьпецы!

У панядзелак 4 верасьня прэс-служба **Аляксандра Мілінкевіча** распаўсюдзіла ягоны зварот да беларускага народу з нагоды меркаванага рэфэрэндуму. Прыводзім поўнасьцю тэкст звароту.

«Дарагія суайчыньнікі!

Прыйшоў час, калі ад кожнага з нас залежыць наша будучыня. У найбліжэйшыя месяцы нам прыйдзецца вырашыць, ці будзе далей існаваць наша Радзіма — родная Беларусь, ці мы станем ускраінай іншай краіны — суседкі Расеі.

Цяперашні кіраўнік Беларусі доўга гуляў у інтэграцыю, бо надзвычай хацеў стаць самадзержцам «усяе Русі». І дагуляўся. Плянуецца рэфэрэндум па стварэньні так званай «саюзнай дзяржавы». Гэта ня будзе аб’яднаньне роўных. Наш лёс стане вырашаць «саюзнае» кіраўніцтва, дзе ў нас будзе нашмат менш галасоў, чым у суседзяў. Зноў па дазвол на ўсё будзем ехаць на паклон у сталіцу Расеі.

З суседам трэба сябраваць, супрацоўнічаць, гандляваць, паважаць адзін аднаго. Але нашто зноў рабіць камунальную кватэру, спрабаваць жыць не сваім, а чужым розумам? Чаму мы, працавіты, адукаваны народ, павінны перакласьці адказнасьці за наш лёс на іншых? Мы што, нямоглыя, хворыя, неразумныя?


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Нам кажуць: «Мы заўсёды былі разам...» Няпраўда — толькі два няпоўныя стагодзьдзі. А беларускай дзяржаўнасьці больш за тысячу гадоў. Або лямантуюць: «Мы такія бедныя, а ў іх — нафта і газ». Але толькі непісьменны чалавек ня ведае, што хутка ўсюды цэны на энэрганосьбіты будуць сусьветныя.

Паглядзіце на сёньняшні сьвет: багацей за ўсё жывуць людзі ў невялікіх краінах, дзе няшмат прыродных рэсурсаў. Бо жывуць па сваёй волі ў свабодзе для сябе, а не для іншаземнага дзядзькі.

Затое скажу я табе, мой народзе: аб’яднаемся – і нашы дзеці будуць ваяваць у Чачні, і скупяць нашыя прадпрыемствы і зямлю іхнія алігархі, і прыйдуць да нас іхнія мафія і злачынцы, і станем мы глыбінкай Расіі, дзе жывуць куды бядней, чым сёньня ў нас.

Думайце, разважайце. Нават родным братам лепей жывецца ва ўласных дамах, чым у інтэрнаце.

Мы павінны захаваць нашу Беларусь незалежнай. Сьвятым не гандлююць. Бацькаўшчына дасталася нам ад продкаў, і мы мусім захаваць яе для нашых нашчадкаў. Толькі незалежная Беларусь можа забясьпечыць сваім грамадзянам дабрабыт і спакой.

Мы пабудуем эўрапейскую Беларусь, якая будзе для нас утульным домам, а для нашых суседзяў надзейным мастом супрацоўніцтва, але ніколі — прахадным дваром або разьменнай манэтай.

Маці-Радзіма патрабуе нашай абароны, чыстай веры, шчырай любові і гарачых сэрцаў.

Толькі разам мы адстаім свабоду і незалежнасьць. Кожны з Вас патрэбен для гэтай сьвятой справы.

Мы пераможам!»

# У часопісе «Спецназ» раяць гітлерскі кодэкс гонару

У ліпеньскім нумары нядаўна створанага часопісу «Спецназ» зьмешчаны артыкул Юр'я Сівакова «Аб гонары». У ім перадрукоўваецца кодэкс гонару афіцэра, напісаны Адольфам Гітлерам. Паводле Ю.Сівакова, беларускаму афіцэру?

«Любоў да фюрэра, народу і айчыны па-над усім. Таму афіцэр павінен дакладна аддзяліць сябе ад тых, хто стаіць наўзбоч ад германскага шляху і барацьбы».

«Яго блізкія абавязаны прытрымлівацца тых самых перакананьняў, што і ён. Калі жонка афіцэра дазваляе сабе выказваньні, якія могуць пацягнуць за сабой крымінальнае пакараньне за «падбухторваньне», то гэта ніяк ня робіць яму гонару...»

Часопіс «Спецназ» заснаваны ГА «Беларуская асацыяцыя вэтэранаў падразьдзяленьня спэцыяльнага прызначэньня войскаў МУС «Гонар» (старшыня асацыяцыі Ю.Сівакоў). На старонках друкуецца камандзір брыгады спэцыяльнага прызначэньня ўнутраных войскаў Дзьмітры Паўлічэнка. Байцы яго брыгады даўно прысягаюць у першую



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Юры Сівакоў.**

чаргу прэзыдэнту, а ўжо потым народу і краіне. Аднак гаворка вядзецца пра «вернасьць фюрэру». Ці ня цягнуць рэкамэндацыі былога міністра МУС на прапаганду фашызму? Камэнтуе праўнік Валянцін Стэфановіч: «У беларускім праве няма вызначэньня «прапаганда фашызму», таму за гэтыя выказваньні Сівакова немагчыма асудзіць юрыдычна. Але гэта папросту амаральна, і Сівакоў варты маральнага асуджэньня. У Беларусі рэкультывуецца вобраз Сталіна, і тут жа дзяржаўныя асобы вышэйшага рангу дазваляюць сабе цытаваць Гітлера. Гэта, мабыць, агульная тэндэнцыя ўзьвялічваньня таталітарных каштоўнасьцяў».

**Сямён Печанко**

# Адам Міхнік: Лукашэнку засталося нядоўга

Галоўны рэдактар уплывовай польскай «Газэты выборчай» Адам Міхнік наведаў Кіеў, дзе 1 верасьня яму ўручылі дыплём і мантыю ганаровага прафэсара Кіева-Магілянскай акадэміі.

Напярэдадні ён даў інтэрвію інтэрнэт-парталу «Всеукраінська експертна мережа», падчас якога закрануў і беларускую тэматыку.

**— Адам, карэспандэнта «Выборчай» Вацлава Радзівіновіча не акрэдытавала беларускае МЗС. Вас можна з гэтым павіншаваць?**

— Вядома! Значыць, ён выдатна працуе. У Еўтушэнкі ёсьць верш «Казанскі ўнівэрсытэт», дзе сказана, што калі цябе пасадзілі ў турму, значыць, улада цябе ацаніла. Калі ў Беларусі не акрэдытавалі журналіста, значыць, гэты журналіст сумленна выконвае свой абавязак.

**— Пасьля Майдану Беларусь засталася адзінай дзяржавай у Эўропе, дзе не працуюць дэмакратычныя інстытуты. Ці доўга будзе гэта працягвацца?**

— Ужо нядоўга. У 1995 г. я быў у Менску, там ішла нейкая блытаніна, галадалі дэпутаты. І Пятро Марцаў спытаў у мяне пра тое ж — ці доўга будзе кіраваць Лукашэнка?

Я сказаў яму: на жаль, доўга. Цяпер я магу сказаць адваротнае: на шчасьце, ужо ня доўга. Ён вычарпаў свой рэсурс і дастаў ужо нават Расею. Спадзяюся, хутка «Выборча» пачне пісаць пра Беларусь як пра дэмакратычную дзяржаву.

**АФ, Кіеў**

# Справа “Партнэрства” толькі пачынаецца

У аўторак 5 верасьня ва ўправе Партыі БНФ адбылася прэс-канфэрэнцыя з удзелам вызваленых надоечы Аляксандра Шалайкі і Эніры Браніцкай.

Паводле словаў Шалайкі, існавала тры доказы «віны» “партнэраўцаў”, гэта тры дакумэнты. Адзін быў зроблены на блянку «Gallup» зь нібыта вынікамі прэзыдэнцкіх выбараў, ён увогуле не разглядаўся сьледзтвам. Другі — блянк з вынікамі яўкі на папярэдняе галасаваньне падчас рэфэрэндуму 2004 г., да гэтага блянку было проста дапісана «19 сакавіка 2006 году. Грамадзкае аб'яднаньне «Партнэрства». Суд прызнаў, што гэта сапраўдны дакумэнт і ніякага падману быць ня можа. Трэці — блянк ЦВК з подпісам Ярмошынай, але яго я ўвогуле бачыў толькі па тэлевізары, на сьледзтве ён не фігураваў. Не было доказаў, таму абвінавачваньне зьнялі, пакінуўшы толькі ўдзел у незарэгістраванай грамадзкай арганізацыі».

**Зьміцер Панкавец**

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ





## Беларускімі чарніцамі ласуюцца ў Швэцыі

Гэтым годам дзяржава зьбіраецца выкупіць у насельніцтва 2400 тонаў чарніцаў. Сярэдняя цана на гэтую ягаду складае 5 тысячаў рублёў за кіляграм. Каля сямісот тонаў чарніцаў будзе пастаўляцца на экспарт. Найперш у краіны далёкага замежжа — Швэцыю, Галяндыю, Аўстрыю. Было вырашына адмовіцца ад супрацоўніцтва зь літоўскімі і польскімі фірмамі, бо яны займаюцца толькі пасярэдніцкай дзейнасьцю.

Таксама сёлета беларускі бок мяркуе паставіць у Расейскую Фэдэрацыю каля 40 тысячаў тонаў бульбы. Сярод якіх 5 тысячаў пойдзе на Маскву і Санкт-Пецярбург. Беларусы яшчэ будуць экспартаваць у Расею моркву і капусту. От ужо тая Расея. Ужой і капуста ў іх не расьце.

**Зьміцер Панкавец**

## На рынку ў Скідзелі бэтонная пліта ўпала на пэнсіянэрак

Два чалавекі пацярпелі на рынку ў горадзе Скідзель. Пліта плота прыціснула двух жанчын-пэнсіянэрак. Адна з іх атрымала чэрапна-мазгавую траўму, іншая загінула на месцы.

Абрушэньне пліты адбылося ад удару легкавіка. Кіроўца *Renault* прыпаркаваў машыну за некалькі мэтраў ад агароджы і пайшоў на базар. Аўтамабіль пакаціўся пад ухіл і ўдарыўся у стык паміж плітамі. Ад штуршка адна зь іх упала.

Як сьцвярджаюць мясцовыя жыхары, гэтая частка агароджы падае ўжо не ўпершыню. Апошні раз пліта абвалілася летась, але тады ніхто не пацярпеў.

Міліцыя вядзе сьледзтва.

**Эўрапейскае радыё для Беларусі**




PHOTO.BYMEDIA.NET

## Канфлікт у футбольнай зборнай Беларусі

Нацыянальная зборная вылецела ў Галяндыю на адборачны матч Чэмпіянату Эўропы — 2008 бяз трох гульцоў асновы: паўабаронцы расейскай «Томі» Аляксандра Кульчыя, ягонага аднаклюбніка форварда Віталя Булыгі, а таксама форварда італьянскай «Пармы» Віталя Кутузава.

Рашэньне галоўнага трэнэра Юр'я Пунтуса не ўключаць іх у выязны склад падтрымаў кіраўнік асацыяцыі «Беларуская фэдэрацыя футболу» і Адміністрацыі прэзыдэнта Генадзь Нявыглас, які ў панядзелак увечары спэцыяльна прыбыў на трэніроўку каманды ў «Стайкі».

Булыгу ў панядзелак у клініцы №9 сталіцы зрабілі апэрацыю на скулавой косьці. Нібыта, гульцы «адпачывалі» ў ноч на нядзелю, у прыватнасьці, Булыга зь іншымі гульцамі быў заўважаны ў клюбе «Мэдысан», дзе сьвяткавалі нічыю альбанскія футбалісты.

**Паводле «Прессбол»**

## Беларускаму Сакрату — 70 год

4 верасьня споўнілася 70 гадоў вядомаму беларускаму пісьменьніку зь Беласточчыны Сакрату Яновічу. Яновіч рашуча крытыкуе беларускія ўлады, але даволі жорстка выказваецца і на адрас саміх беларусаў, заяўляючы, што беларусам, каб стаць нацыяй,




**Палітвязьня Міколу Статкевіча перавялі дабываць пакараньне пад Пухавічы, у вёску Блонь**



«патрэбна яшчэ гадоў дваццаць». Жыве Яновіч у мястэчку Крынкі, дзе й нарадзіўся.

**МБ**

## «Газпром» купіў адну з апошніх незалежных газэт Расеі

Выдавецкі дом «КоммерсантЪ» выкуплены зьвязаным з «Газпромам» бізнэсоўцам Алішэрам Усманавым. Гэты сталёвы магнат займае 25-е месца ў сьпісе найбагацейшых расейцаў (паводле «Форбс», ён мае $2,6 млрд). Адначасова ён кіруе адным з даччынных прадпрыемстваў расейскага газавага манапаліста.

«Газпром» заявіў, што пакупка «Ъ» — прыватная інвэстыцыя Ўсманава. Аднак брэнд «Газпрому» ў Расеі трывала асацыюецца з «барацьбой за СМІ», што колькі гадоў таму распачалі людзі Пуціна. «Газпроммэдыя» нэўтралізаваў тэлеканал НТВ, а таксамаператварыў купленыя ў 2005 г. «Известия» ў газэту, што ўнікае нявыгадных Пуціну тэмаў.

Рэдакцыя газэты спадзяецца, што яе чакае лёс радыёстанцыі «Эхо Москвы», якая — хаця яе колькі гадоў таму таксама пераняў «Газпром» — засталася прытулішчам незалежнай журналістыкі.

Крэмль зґаджаецца з існаваньнем некалькіх мэдыйных «фігавых лісткоў», бо ён усё яшчэ зацікаўлены ў рэпутацыі на Захадзе і сярод часткі расейскіх элітаў. Апрача таго, крэмлёўскія паліттэхнолягі вераць, галоўным чынам, у моц падпарадкаванай ім тэлевізіі, а не газэт, якія чытае адносна няшмат расейцаў.

У 1999 г. Беразоўскі і яго партнэр у інтарэсах Бадры Патаркацышвілі купілі «КоммерсантЪ» за 26 млн даляраў. Усманаў выкладвае за яго каля 200 млн даляраў.

**ВД**

## Румынскія цэрквы пагадзіліся на люстрацыю

Апошняя прапанова прэзыдэнта Траяна Басэску трапіла на добрую глебу. Басэску абвясьціў, што дакумэнты «сэкурытытэ» (румынскга КГБ), павінны быць апублікаваныя. Прэзыдэнта падтрымала ўплывовая Найвышэйшая рада Нацыянальнай абароны. Дакладна не вядома, колькі сьвятароў супрацоўнічалі з рэжымам. Абвінавачаньні ў супрацоўніцтве зь бясьпекай кранаюць нават патрыярха Румынскай праваслаўнай царквы Феактыста.

Зь іншага боку, шмат іншых сьвятароў прынялі пакуты — 2,5 тыс. клерыкаў прайшлі праз турмы.

**ВД**

Коммерсант

## Памёр слынны паляўнічы на кракадзілаў



Славуты аўстралійскі паляўнічы на кракадзілаў Стыў Ірвін загінуў ад удару скаташыпахвоста, які пракалоў яму сэрца і частку лёгкага.

Выпадак здарыўся ля гораду Порт-Даглас (штат Кўінзлэнд) на паўночнаўсходнім узьбярэжжы Аўстраліі. Там Стыў браў удзел у здымках фільму пра падводны сьвет Аўстраліі.

Гелікоптэр з мэдыкамі прыляцеў занадта позна, і выратаваць паляўнічагашоўмэна не ўдалося.

Стыў Ірвін быў дырэктарам Аўстралійскага заапарку ў Кўінзлэндзе. А славу здабыў — разам са сваёй жонкай-амэрыканкай Тэры Ірвін — як аўтар знакамітага прыгодніцкага дакумэнтальнага сэрыялу «Лавец кракадзілаў», у якім ня раз хадзіў мяжой жыцьця і сьмерці.

Сэрыял ідзе на канале *Animal Planet* і карыстаецца заслужаным посьпехам у гледачоў ва ўсім сьвеце. У тым ліку і ў Беларусі.

**ВД**

## Хто заб’е Бэнэдыкта XVI у Стамбуле?

Замах на Бэнэдыкта XVI падчас візыту ў Стамбул — тэма дэтэктыву, што зьявіўся ў Турцыі за тры месяцы да пілігрымкі папы ў гэтую краіну і ўжо пабіў усе рэкорды папулярнасьці. Пра сэнсацыйную аповесьць піша італьянская газэта *Il Giornale*.

Газэта зазначае, што крымінальная аповесьць «Замах на папу» мае падзагаловак «Хто заб’е Бэнэдыкта XVI у Стамбуле?» і апісвае замах, зьдзейсьнены італьянскім журналістам у выніку міжнароднай інтрыгі з удзелам Opus Dei, масонства і турэцкіх спэцслужбаў.

Аўтар аповесьці — Ючэл Кая, які спэцыялізуецца на дэтэктывах. На працягу дзесяці дзён ад зьяўленьня аповесьць займае першыя месцы ў рэйтынгу кніг, што найлепей прадаюцца ў Турцыі.

«Гэта трывожна, калі ўзяць пад увагу той факт, што насамрэч пілігрымка папы ў Турцыю пачнецца ўжо 28 лістапада» — падкрэсьлівае газэта, адначасова нагадваючы, што за апошнія месяцы ў гэтай краіне адбылося некалькі нападаў на каталіцкіх сьвятароў. «Камусьці па прачытаньні аповесьці Каі магла б прыйсьці ў галаву якая-небудзь дзіўная задума», — піша газэта.

*Il Giornale* зьвяртае ўвагу на асьцярожную рэакцыю каталіцкага Касьцёлу ў Турцыі. «Гэта літаратурная выдумка і так мы павінны да яе падыходзіць. Мы застаёмся асьцярожнымі і поўнымі веры. Турэцкі ўрад робіць захады, каб візыт папы быў як найлепей падрыхтаваны», — такім чынам апостальскі нунцый у Турцыі пракамэнтаваў зьяўленьне кніжкі.

Турэцкі дэтэктыў — гэта першы літаратурны сюжэт, героем якога зьяўляецца папа, які ў гэты момант кіруе ў Ватыкане, а ня постаць, прыдуманая пісьменьнікам.

**Паводле «Газэты выборчай»**

# Калёнія



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 гадах лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

## ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

Афіцыйна Малое Сітна — калёнія-пасяленьне пры Ветрынскай спэцкамэндатуры №15. Межамі калёніі лічацца межы вёскі, і пакідаць іх без распараджэньня начальніка камэндатуры забаронена: парушэньне рэжыму. Такім чынам, купацца ў бліжэйшым возеры, лавіць рыбу або зьбіраць у лесе грыбы ды ягады «хімікі» могуць толькі пад пагрозай арт.415 Крымінальнага кодэксу: замена «абмежаваньня волі» на пазбаўленьне волі («зону» або калёнію агульнага рэжыму).

«Хімічных» спэцкамэндатураў у Беларусі больш як паўсотні. У кожнай зь іх па некалькі працоўных філіяў. Гэтак, кантынгент Ветрына, апроч Сітна, могуць адпраўляць у калгас у вёсцы Нача, на склады ў Вітаржы або на абслугоўваньне «зоны» ў Наваполацку. Калі прыглядзецца, уся Беларусь аблытаная сеткай «калёніяў-пасяленьняў» — і сама пацíху ператвараецца ў адну вялікую калёнію.

«Хімікі» трапляюць сюды за тое, да чаго ў нас дапускаецца бальшыня насельніцтва. Бытавыя п’янкі з распусканьнем рук, нявыплата алімэнтаў, пашкоджаньне маёмасьці ці неасьцярожнае прычыненьне шкоды чалавеку. Калі строга (як у Эўропе ці ЗША) датрымлівацца закону, у калёніях-пасяленьнях мусяць пастаянна знаходзіцца некалькі мільёнаў беларусаў. Гэткі мэханізм працуе на ўладу. Нязгодныя з палітыкай дзяржавы баяцца пераступіць пэўныя межы (адкрыта выказацца, паставіць подпіс, узяць удзел у маніфэстацыі), бо асабіста ім гэта пагражае «ўзмацненьнем рэжыму». Калёнія рабскага, генэтычнага саўковага страху, гэткі невялікі свойскі архіпэляг ГУЛАГ, займае ладную частку душы сярэдняга беларуса. Увогуле, *каляніяльная сьвядомасьць* — спадчына дзьвюхсотгадовага панаваньня тут расейскага імпэрыялізму. Вяскоўцы ў Сітне, дый гараджане ў Віцебску ці Менску дагэтуль жывуць як не на сваёй зямлі, і задавальняюцца зьбіральніцтвам, дробным крадзяжом ды спажывецтвам — быццам чорныя тубыльцы, вывезеныя кудысьці на пасяленьне. У стане пастаяннага страху пакараньня *прасьвядомасьць* лёгка выцясьняецца масавай крымінальнай сьвядомасьцю. І мы прызвычайваемся. Звычайны страх. Звычайны прэзыдэнт. Звычайны рэжым.

Між тым, калёнія пашыраецца. Паводле колькасьці вязьняў на душу насельніцтва Беларусь у сьвеце саступае ўжо толькі Расеі ды Амэрыцы. А дзяржава вынаходзіць усё новыя віды крымінальна караных дзеяньняў.

Міхаіл Марыніч адседзеў у турме за тое, што прыняў у падарунак ад пасольства ЗША некалькі кампутараў.

Сяргей Скрабец сядзіць дагэтуль, бо калісьці быў вылучыўся ў прэзыдэнты.

Андрэй Клімаў — на «хіміі» за тое, што заклікаў людзей адсьвяткаваць Дзень Волі й выйшаў на плошчу з мэгафонам.

Мікалай Статкевіч — там жа: не паверыў

## ХРОНІКА

**28 жніўня**

Адказ з «нацыянальнага сходу» атрымаў актывіст з Гомелю **Васіль Палякоў**: ён прасіў патлумачыць закон пра адказнасьць за грамадзкі парадак падчас мітынгаў (у «Законе аб масавых мерапрыемствах» адказнымі называюцца арганізатары, а суд Цэнтральнага раёну Гомелю адмовіў у гэтым фізычным асобам, і гэта было падставай для забароны мітынгу). Адказ НС быў: палажэньні закону «выкладзеныя ясна і зразумела».

**29 жніўня**

У Гомелі ўлады ня здолелі спагнаць па 5 базавых велічыняў штрафу за раздачу ўлётак з **Кацярыны** і **Андрэя Толчыных**: беспрацоўныя ня мелі грошай, а потым сышоў тэрмін спагнаньня.

**30 жніўня**

Падчас антыфашысцкага пікету на плошчы Перамогі ў Менску былі затрыманыя **Тацяна Камкар**, **Зьміцер Шаўлюкевіч**, **Юлія Міхайлава**, а таксама **Руслан Мацьвееў**, які фатаграфаваў іх. Мацьвеева як адзінага паўналетняга зьвінавацілі ў арганізацыі несанкцыяванай акцыі.

У Баранавічах на пастара царквы пяцідзясятнікаў «Ратаваньне» **Сяргея Пазьняковіча** наклалі штраф у 150 б.в. за несанкцыяваны абрад масавага хрышчэньня.

Газэце ПКБ **«Товарищ»** аб’яднаньне «Белпошта» адмовіла ў распаўсюдзе па падпісцы і ўраздроб на 2007 год.

У Салігорску падчас раздачы ўлётак пра гаспадоўку **Валер’я Бараноўскага** затрыманы моладзевы актывіст **Іван Шыла**. Хлопца затрымалі таксама і 1 верасьня.

**31 жніўня**

У цэнтры Бабруйску падчас акцыі пратэсту быў затрыманы дэпутат гарсавету, былы настаўнік **Алесь Чыгір** (яму не падоўжылі кантракту з палітычных прычынаў). Пры затрыманьні яму пашкодзілі руку. Разам зь ім затрымалі журналістаў **Юлію Дарашкевіч**, **Сяргея Пульшу**, **Галіну Абакунчык**, **Паўлюка Канавальчыка**, **Валер’я Ляўкова**, **Кацярыну Герасянкову**, **Уладзіслава Пятніцу**, **Алену Якжык**, **Настасьсю Неказакаву**, **Яўгена Шчэтава**. Пракуратура адмовілася даваць дазвол на арышт Чыгіра, бо ён дэпутат. Моладзевага актывіста **Дзяніса Буйніцкага**, затрыманага разам зь імі, у судзе апраўдалі: міліцыянты не змаглі падаць у суд нават пратаколаў затрыманьня.

**1 верасьня**

Журналістаў недзяржаўнай газэты **«Мясцовы час»** (Пінск) не акрэдытавалі на адкрыцьці Палескага дзяржунівэрсытэту з удзелам Лука-

# звычайнага рэжыму

афіцыйным вынікам рэфэрэндуму.

Аляксандар Казулін адбывае 5,5 году калёніі, бо нагаварыў па тэлевізіі замнога праўды й разьбіў шкло на партрэце Лукашэнкі.

Артур Фінькевіч — у спэцкамэндатуры за надпіс «Мы хочам новага!».

Вячаслаў Сіўчык — пад «крыміналкай», бо пад ягоным кіраўніцтвам у намётавым гарадку на плошчы Каліноўскага не аказалася ані выбухоўкі, ані гарэлкі, ані наркотыкаў, ані нават дохлых пацукоў.

Мікалай Аўтуховіч — у ізалятары: сумленна займаўся бізнэсам.

Мікалай Астрэйка, Цімох Дранчук, Эніра Браніцкая й Аляксандар Шалайка зьняволеныя за ўдзел у «незарэгістраванай арганізацыі», зарэгістраваць якую ў законным парадку не дазволіла сама дзяржава.

Цяпер суду за тое ж самае чакаюць маладафронтаўцы — а БТ на ўсялякі выпадак распавядае пэнсіянэрам, што насамрэч у летніках з дапамогаю «аўганцаў» «МФ» рыхтуе баевікоў.

Працэсы паказальныя. Больш за тое, паказальна абсурдныя. Маўляў, было б за што саджаць — увогуле б забілі.

І люд баіцца.

Што ж можна супрацьпаставіць страху?

Толькі веру. Вера зьнішчае страх.

Тыя, каму Бог прадугледзеў прайсьці праз зьняволеньне, павінныя памятаць словы Бібліі: «Зь вялікай радасьцю прымайце, браты мае, калі ўпадаеце ў розныя выпрабаваньні, ведаючы, што выпрабаваньне *вашай веры* робіцца цярплівасьцю, а цярплівасьць павінна мець дасканалае дзеяньне, каб вы былі дасканалыя ва ўсёй паўнаце, безь ніякай пахібы» (Якуба 1:2—4).

Адбыцьцё сутак у спэцпрымальніках, месяцаў у ізалятарах, гадоў на «хіміі» ці ў турме кшталтуе ды гартуе змагароў. Дае час на роздум, грунтоўную адукацыю, духовае ўдасканальваньне. Паверце, дарагія Аляксандар і Артур, Цімох і Мікалай, Сяргей і Андрэй — Госпад Бог лепш за ўсіх ведае, дзе нам у гэты момант трэба быць. І ў вырашальную хвіліну, калі Беларусі спатрэбяцца найвялікшая цьвёрдасьць, бязьмежнае трываньне, рэдкая адвага — гэты гарт дасьць плён, і мы зробімся кропкамі апірышча для рычага, што пераверне краіну.

Насамрэч яна — у галовах.

«Шчасьлівыя тыя, каго гоняць за праўду, бо іх ёсьць Валадарства Нябеснае!» (Мацьвея 5:10).

Што ж да спробаў запалохаць судзілішчамі ўвесь народ... Беларусам няма чаго баяцца. Насамрэч, *калёнія звычайнага рэжыму* — у галовах. Як і ў выпадку зь Сітнам, мяжа забароны ўмоўная. Зямля беларуская. Людзі нашыя. Параза рэжыму непазьбежная. Калі зразумець гэта, страх проста зьнікае.

Бо Беларусь атрымала незалежнасьць ня дзеля таго, каб быць калёніяй-пасяленьнем на 10 мільёнаў асуджаных да абмежаваньня волі. Божая воля для сучаснае Беларусі — гэта нацыянальнае абуджэньне.

*в.Малое Сітна*

## ХРОНІКА

шэнкі.

Карэспандэнту «Gazety Wyborczej» **Вацлаву Радзівіновічу** адмовілі ў акрэдытацыі: у беларускай амбасадзе ў Варшаве яму заявілі, што ён «неаб’ектыўны журналіст».

**Валер Шчукін** падаў у Вярхоўны суд на судзьдзю Аляксея Рыбакова, які вёў працэс Аляксандра Казуліна. Шчукін лічыць выдаленьне журналістаў з залі суду перашкодай у прафэсійнай дзейнасьці.

### 4 верасьня

Палітвязьня **Міколу Статкевіча** перавялі з Баранавічаў у вёску Сітнікі Пухавіцкага раёну.

Палітвязень **Аляксандар Казулін** заявіў, што яму дагэтуль не далі аналізаў мэдычнага абсьледаваньня ў турэмнай бальніцы. Таксама яго сваякам не даюць магчымасьці перадаць пітную ваду.



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Вацлава Радзівіновіча (справа) затрымліваюць міліцыянты ў цывільным падчас штурму Польскага дому ў Горадні. 2005 год.**



# Змушаны дрэйф

Любая процівага імпэрыі — бясспрэчны плюс. Піша **Аляксандар Класкоўскі.**

Нядаўні Чавэсаў візыт здаваўся выключна прапагандысцкім блефам, а вось глядзеце ж! Спадары Шэйман і Сямашка ўжо ў Каракасе. Кіраўнік Рады бясьпекі ды першы віцэ-прэм'ер — тандэм сур'ёзны.

Хто-кольвек кпіў: можа, трубу праз Атлянтыку пракладаць будзем? Але палітоляг Андрэй Фёдараў кажа: «Не абавязкова, каб тая нафта фізычна перапампоўвалася ў Беларусь. Ёсьць розныя заліковыя схемы». Экспэрт Юры Шаўцоў даводзіць, што здабытае беларусамі ў Вэнэсуэле «чорнае золата» можна з выгадай прадаваць Штатам ці нават Кітаю. Ёсьць між Менскам ды Каракасам глеба і для іншых гешэфтаў.

Зрэшты, незалежна ад эканамічнага эфэкту, сымптаматычна выглядае сама тэндэнцыя. Парадаксальным чынам, з-пад палкі «Газпрому», айчыннае кіраўніцтва мусіць напаўняць рэальным зьместам зашмальцаваную тэзу пра шматвэктарную палітыку. Справа зусім не абмяжоўваецца «лігай дыктатараў». Ці ўяўлялася колькі гадоў таму, на піку «братняга яднаньня» з Расеяй, што болей за палову экспарту пойдзе ў Эўразьвяз?

А як вам намёк на тое, што дарагая замова на праектаваньне АЭС можа дастацца не маскоўцам, а французам? Менавіта такі мэсыдж зрабіў Аляксандар Лукашэнка падчас візыту ў Пінск. Там жа было сказана і пра цікавыя прапановы з Каракасу.

Са «сталіцы Палесься» па Маскве быў зроблены папераджальны залп. Не выпадковая згадка пра тых, хто разам з расейцамі гінуў некалі ў акопах. Гэта літаральны паўтор рыторыкі лютага 2004 году, калі Лукашэнка адбіваў газавы бліцкрыг Масквы. Менск дэманструе маральную гатовасьць да новай бітвы.

А маса падтрымае. Пад 80% беларусаў лічаць, што «Белтрансгаз» нельга прадаваць ні пры якіх умовах.

На думку эканаміста Яраслава Раманчука, Расея сваім шантажом можа зрабіць тутэйшаму начальству паслугу. На імпэрыю зручна сьпісаць і так даўно насьпелае рэзкае падвышэньне жыльлёва-камунальных тарыфаў. Як ні парадаксальна, гэты непапулярны крок, мяркуе экспэрт, можа стаць «магутным чыньнікам эскаляцыі эканамічнага ды палітычнага нацыяналізму».

Дарэчы, ці заўважылі: на нядаўняй нарадзе з пасламі афіцыйны лідэр фактычна рэабілітаваў ідэю Балта-Чарнаморскага калектару. БНФ мог бы ганарыцца. Але нацыянал-дэмакраты ўсё адно б'юць у званы, перасьцерагаючы ад паглынальнага рэфэрэндуму.

Пэўныя пасажы ў тым жа Пінску сапраўды гучалі двухсэнсоўна. Напрыклад, што пры пэўных умовах імаверны пераход на расейскі



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Пакуль улада дамаўляецца пра паліва за акіянам, людзі зьбіраюць трубы ў лясох і здабыв**

рубель. Зрэшты, гэта можа быць рытуальным заклінаньнем. Хай расейцы чакаюць ля мора пагоды. А мы спакваля наладзім інтэграцыю праз акіян. Тыя, прынамсі, не інкарпаруюць: далекавата!

Можна, вядома, пакпіць: даабдымаліся з расейскім мядзьведзем, схамянуліся, як косьці храбуснулі... А раптам Чавэс ваш нафтавы бізнэс потым нацыяналізуе — ён на гэта мастак!

Але варта памятаць, што любая процівага імпэрыі — несумненны плюс. Заходняя ж супольнасьць, выявіўшы пэўны спрыт, можа скарыстаць змушаны дрэйф рэжыму на карысьць дэмакратычнай пэрспэктывы Беларусі.



аюць сваё паліва. На фота: самагонны завод.

Гумарэска Лёліка Ушкіна.



# Беларусь гой,
## або Мова інтэграцыі з Вэнэсуэлай

Мне здаецца, што заплянаваная моўная рэформа рухаецца ня ў тым напрамку, без уліку апошніх геапалітычных тэндэнцыяў. Адным з галоўных чыньнікаў новай сытуацыі відавочна стане калянізацыя Вэнэсуэлы, што стартавала цяпер. А там, як вядома, народ гаворыць на мове Дон Кіхота і Лопэ дэ Вэга.

Посьпехі беларускага «дрангу нах сэльва» залежаць у тым ліку ад здольнасьцяў бульбашоў да камунікацыі з лацінасамі, іншымі словамі — ад таго, як хуценька нашыя акадэмікі будуць здольныя падагнаць беларускую пад гішпанскую, стварыўшы варыянт беларуска-вэнэсуэльскай трасянкі (гішпасянка).

У такім разе нашыя людзі, якія трапілі на палаючы кантынэнт, будуць ужо пампаваць нафту, у той час пакуль канкурэнты — расейцы і іншыя швэды — яшчэ толькі пачнуць вымаўляць гэткую прымітыўную фразу, як «Me llamo Vasia» (мяне завуць Вася).

Перш за ўсё нам трэба абеларусіць гішпанскія словы паўсядзённага жыцьця.

Напрыклад, прапаную наступныя лексычныя і артаграфічныя інавацыі ў актыўны вакабуляр — набеберыцца (ад «beber» — піць), мортыфэрны чычагон (ад «chicha» — пяршак і «mortifero» — забойны), тамары крэдыту на тынту (ад «tomar a credito» — пазычаць, «tinta» — чарніла).

Натуральна, шкаляры мусяць вывучаць лексыку сямейных дачыненьняў: вівэрыцца зь вехамі («vivir» — жыць і «viejo» — стары), дыстрыбуірка фарсадная (ад «distribuir» — разьмеркаваць і «forzado» — прымусова), пагаднае аддзяленьне (ад «pagado» — платнае).

Гішпасянку на працоўныя месцы!

Перафум (ад «fumar» — курыць), заканклюрыць трабахны кантракт (ад «concluir» — укласьці, заключыць; «trabajo» — працоўны), разрампэрыць кантракт (ад «romper» — парваць), пайсьці ў фарзадную ліцэнзію (ад «forzado» — прымусовы і «licencia» — адпачынак), мець дэдку па саляры («deuda» — пазыка і «salario» — заробак).

Натуральна, не абысьціся без ідэалягічнага напаўненьня: за эстабілідадную Беларусь! (ад «estabilidad» — стабільнасьць), падцька (ад «padre» — бацька), аблігаторная падпіска на «Беларусь гой» (ад «obligatorio» — абавязковы і «hoy» — сёньня), кантроль будзе бруталь (ад «brutal» — жорсткі).

Паверце мне, калі мы ўвядзём гішпасянку, праз пару гадоў багаты лацінаамэрыканскі рынак аўтаматычна ўпадзе да нашых ног: мулаткі будуць насіць «Мілавіцу», генэралы пясчаных кар’ераў у перапынках паміж гоп-стопамі смактаць «Налібоцкую пушчу», а Кастра, замест цыгары, курыць прадукцыю гарадзенскай тытунёвай фабрыкі.

Між тым беларусы, шпацыруючы сталічнай вуліцай Каракасу — праспэкту Пераможцаў (был.Балівара), будуць пачувацца, нібыта на родным раёне.

— Вы батэллу не аддэхарыце (ад «dejar» — пакінуць і «botella» — бутэлька)? — спытае ў вас на зразумелай гішпасянцы мінак-індзеец.

— Ды адкамінарся ты (ад «caminar» — ісьці)...

Як прыемна размаўляць на роднай мове!

# Беларускамоўныя вёскі ў тайзе



Беларусы Іркуцкай вобласьці перажываюць нацыянальны рэнэсанс. Піша **Зьміцер Панкавец.**

## Сто беларускіх вёсак

«Паводле статыстыкі, у Іркуцкай вобласьці цяпер жыве 50 тысячаў беларусаў, а напраўдзе яшчэ больш, — кажа Алег Рудакоў, кіраўнік Іркуцкага таварыства беларускай культуры імя Чэрскага. — Прыяжджаю я ў вёску, пачынаю гаварыць, бабуля кажа, што сястра ейная беларуска, а сама яна расейка. Як так, пытаюся? У вас што — ба́цькі розныя? Не, кажа. Бацька адзін, але ж сястра ў Беларусі нарадзілася, а я ў Расеі, таму й расейка. Прычым гаворыць усё на чысьцюткай беларускай. І колькі такіх бабулек, нават ня зьлічыш. Толькі я ведаю звыш ста беларускіх вёсак, і штолета, калі выпраўляюся ў пошукі, гэтая лічба павялічваецца. Жывуць у тых сёлах нашчадкі сялян, перасеtotal перасеrepresentation

## Беларуская дыскатэка ў Іркуцку

Алег Рудакоў уласным прыкладам даказаў: нічога немагчымага няма, калі ёсьць жаданьне. Вайсковец, ён стаў рухавіком стварэньня суполкі беларусаў Прыбайкальля.

Тут я адчуваю сябе нібыта ў казцы.

Для яго пачалося ўсё з удзелу ў IV зьезьдзе ТБМ у 1995 годзе. Гэта быў час, калі мова і сама тоеснасьць беларусаў былі пад пагрозай, нармальнай рэакцыяй у адказ была — дзейнічаць. І ён даў у іркуцкую газэту «Советская молодежь» абвестачку з заклікам да беларусаў адгукнуцца для стварэньня нацыянальнай суполкі.

Першапачатковае ядро суполкі ў Іркуцку склалі пяць чалавек, якія міжсобку перамаўляліся па-расейску. Для Алега гэта было непрымальна, і ён прапанаваў гаварыць на роднай мове. «Цяпер тыя беларусы, зь якімі я пачынаў, адышлі ад беларускіх справаў, — кажа Рудакоў. — Але, дзякуй Богу, іх ёсьць ужо кім замяніць».

Цяпер беларуская грамада Іркуцку самая актыўная і вялікая ў горадзе сярод нацыянальных меншасьцяў. Усё залежыць ад лідэра. Скажам, украінцаў на Далёкім Усходзе болей, чым беларусаў, але энэргічнага кіраўніка сярод іх няма, от і іх нацыянальнае таварыства яднае толькі пэнсіянэраў. У беларусаў наадварот.

У Іркуцку праводзяцца нават дыскатэкі, дзе гучыць толькі беларуская музыка! А беларускую мову вучаць расейцы й бураты. У горадзе выходзіць газэта «Маланка», ёсьць беларуская бібліятэчка.

## Цагліна не заб’е

Рудакоў падрыхтаваў да друку кнігу пра земляка Яна Чэрскага, дзе, апроч біяграфіі падарожніка, будзе паэма аб ім Алегавага аўтарства.

Яшчэ пяць гадоў таму ён думаў: «Калі мне на галаву якая цагліна зваліцца, то на гэтым і спыніцца беларускае жыцьцё ў Іркуцку. Цяпер такога ня будзе, прыйшла плеяда нашчадкаў тых,

хто перасяліўся сюды яшчэ за царом і пазьней».

«Я паставіў сабе задачу, — кажа сп.Рудакоў, — прыцягваць у арганізацыю больш моладзі, бо толькі ў такім разе мы будзем мець будучыню. А моладзь можна завабіць рознымі мерапрыемствамі і сьвежымі ідэямі».

Сёньня ў Іркуцкай вобласьці 8 аддзяленьняў ІТБК імя Я.Чэрскага, а таксама 11 беларускіх калектываў. Увесну два тыдні доўжыліся дні беларускай культуры, цягам якіх прайшла фотавыстава, народныя майстэрні, прэзэнтацыя кніжкі іркуцкай беларускай паэткі Кацярыны Агарковай «Сонейка», паказ вясёлага фільму «Акупацыя. Містэрыі».

## Купальле на Ангары

Сама шумна і весела адзначаюць беларусы Іркуцку нацыянальныя сьвяты. Сёлета ў беларускім Купальлі на Ангары ўдзельнічалі 260 чалавек. На Каляды езьдзяць шчадраваць на машынах, ад адной беларускай сям'і да другой.

Алега слухаеш з зайздрасьцю, бо на Радзіме «Акупацыя», на жаль, забароненая і ўсё часьцей Купальле сьвяткуюць у поўнай канспірацыі.

Рудакоў не заангажаваны ў палітыку, ні ў беларускую, ні ў расейскую (у Іркуцкай вобласьці, дарэчы, на выбарах у Думу ў 2003 годзе «Адзіная Расея» набрала 33%, а партыя Жырыноўскага аж 16% галасоў). Ён такі, якім і мусіць быць нармальны беларус — проста шануе сваю мову і культуру. Няма сумневу, што і ў другіх рэгіёнах Далёкага Ўсходу беларусаў ня менш, чым у Прыбайкальлі, толькі там не знаходзіцца арганізатара.

Разам з Рудаковым у Беларусь прыехала студэнтка Іркуцкага пэдунівэрсытэту Вольга Галаванава. Яе прабабуля паходзіць з Гомельшчыны. Вольга памятае, як яе чаравала прабабіна мова. Але бацькі не дазвалялі ёй размаўляць па-беларуску, хоць малой вельмі карцела. Мінуў час, Вольга выехала на вучобу ў Іркуцк, дзе выпадкова ўбачыла шыльдачку Таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага. Зайшла — і засталася. Цяпер яна адна з самых актыўных сяброў моладзевага клюбу «Крывічы».

Вольга ў Беларусі другі раз, упершыню яна была тут летась на Зьезьдзе беларусаў сьвету. Кажа, што тут адчувае сябе нібыта ў казцы. Такая культурнасьць людзей, такая цывілізацыя... Па сканчэньні вучобы яна цьвёрда вырашыла пераехаць на гістарычную Радзіму.



**Алег Рудакоў праехаў тайгу ўпоперак.**



**Вольга (справа) марыць жыць у Беларусі.**







**Каляндарык іркуцкіх беларусаў.**



**У беларускім купальлі на Ангары ўдзельнічалі 260 чалавек**

# Помнікі нашы...

*Помнікі нашы! Колькі ж штогод вас на цёскі*
*Трушчыць сякерай купец ці чыноўнік маскоўскі!..*
***Адам Міцкевіч***



АЛЕСЬ МАТАФОНАЎ

Як у 2006 годзе ў вёсцы Басьценавічы разбурылі царкву. Піша Сяргей Харэўскі.

## За саветамі так не руйнавалі

Усьлед за славутым кінатэатрам «Беларусь» у Менску працягваюць руйнаваць два дамы XIX ст. на рагу вуліцы Калектарнай і Нямігі. У 1902 г. там праходзіў зьезд прадстаўнікоў сіяніцкіх арганізацый Расейскай імпэрыі, дазвол на правядзеньне якога даваў міністар унутраных справаў. Такім чынам, завяршылася зьнішчэньне ўсяго кварталу на колішняй вуліцы Габрэйскай.

Размах вандалізму цяперашняе ўлады ўражвае нават тых, хто бачыў вандалізм савецкі. Весткі пра разбурэньне помнікаў прыходзяць рэгулярна з усяе краіны. На мінулым тыдні зруйнавалі, напрыклад, самы вялікі двохпавярховы будынак былога банку ў гістарычным цэнтры Гальшанаў. Бяз дай прычыны зруйнавалі капітальны панскі дом Гарэцкіх XIX ст. у Багацькаўцы, дзе яшчэ нядаўна быў клюб. Руйнуюць і ў Глыбокім, і ў Магілёве, і ў Слоніме, і ў Барысаве. Пра гісторыю змаганьня за помнікі Горадні ўжо можна напісаць цэлую кнігу. Цэлыя раёны, напрыклад Любанскі ці Клімавіцкі, засталіся зусім бяз помнікаў дойлідзтва. Чыноўнікі з Дэпартамэнту па ахове помнікаў і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Беларусі дагадліва пасьпяваюць раздаваць дазволы на зьнішчэньне.

Часам чыноўнікі, што «ахоўваюць» спадчыну, радасна паведамляюць, што той ці іншы аб'ект не стаяў на дзяржаўным уліку як помнік. Але гэта звычайныя савецкія хітрыкі. Зьнішчылі цалкам будынак №21 на плошчы Свабоды, які дасёньня знаходзіцца ў сьпісе гісторыка-культурных аб'ектаў; будынак №27 на вуліцы Гандлёвай, апошні, які захаваўся на схіле ад верхняга да ніжняга рынкаў Менску дасавецкага часу, быў пабудаваны ў XIX ст.

## Можна ставіць крыж

За апошнія гады пад кіраўніцтвам Дэпартамэнту па ахове помнікаў і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Беларусі пазьнішчалі цэлыя кварталы капітальнае старадаўняе забудовы ў Менску і Горадні, дзясяткі помнікаў па ўсёй краіне. Не ўратавалі дзяржаўныя «ахоўныя граматы» цэлыя кварталы Верхняга гораду, вуліцаў Камсамольскай, Замкавай, Дзімітрава.

На гістарычным цэнтры Менску ўжо можна ставіць тлусты крыж. Праз пару гадоў тут не застанецца ані каліва старасьвецкасьці. Цяпер надышла чарга вынішчаць сталічныя прадмесьці. Дырэктар цэнтру «Менск» пры Менскім гарвыканкаме, Віталь Машэчкаў, у інтэрвію ў «ЛіМе» радасна малюе пэрспэктывы старажытнай Лошыцы: «Там будзе пабудавана гасьцініца. Гістарычныя будынкі на тэрыторыі парку, у якіх яшчэ жывуць людзі, — млын, стары сьпіртзавод — будуць ліквідаваныя...» То бок замест унікальнага ансамблю XVIII—XIX ст. тамака будзе гатэльны комплекс з паркінгам. Варта пасьпяшацца ў старасьвецкую Лошыцу з фотаздымачом. Звадзіце туды і дзяцей, каб хоць нешта запомнілі...

## Там быў край...

Гэта ня праўда, што нашыя людзі застаюцца абыякавымі, калі руйнуюць нашую спадчыну на нашых вачах. У Багацькаўцы людзі кіпелі ад абурэньня, выказваючы нязгоду й неразуменьне лёгікі калгасных уладаў, што разбурылі панскі дом, у якім паўвёскі гуляла на вясельлях. Ніхто хіба і ў Гальшанах ня ўзрадаваўся, калі на месцы старога банку, дзе яшчэ сёлета было калгаснае праўленьне, зрабілі... аўтастаянку. Людзі казалі, лепей бы каму прадалі. А так — і сам ня гам і другому ня дам.

Вусьцішным прыкладам стала й разбурэньне калгаснымі ўладамі старадаўняе царквы ў гонар Покрыва Прасьвя-

**На здымку ўверсе: іконы і харугвы з Басьценавіцкай царквы перахоўваюцца па гарышчах.**



АЛЕСЬ МАТАФОНАЎ

**...тодня ходзяць у ...ную старшынём калгасу царкву.**

тое Багародзіцы ў вёсцы Басьценавічы, што пад Амсьціславам.

Некалі тут быў заможны й дабраслаўлёны край. Тут быў вялікі грэка-каталіцкі прыход. У тутэйшай царкве былі шыкоўныя аздобы. Менавіта адсюль паходзяць славутыя аўтарныя абразы 1723—1728 г. «Пакланеньне Трох Каралёў» і «Сустрэча Якіма і Ганны каля залатой брамы», «Аўрамі і Мэркуры Смаленскія», што перахоўваюцца цяпер у Нацыянальным мастацкім музэі. Іх уважаюць за шэдэўры беларускае школы жывапісу. Пасьля далучэньня да Расеі вёска Басьценавічы стала сялом у Чэрыкаўскай акрузе. Тут у 1816 г. было ўжо толькі 33 двары, 166 жыхароў. Старадаўняя ўніяцкая царква была перабудаваная каля 1880 г. і набыла элемэнты клясыцызму. Пасьля скасаваньня прыгону вёска пачала хутка расьці: у 1897 г. тут было 57 двароў, 408 жыхароў, дзейнічала школа, у якой у 1905 г. навучалася 45 хлопчыкаў і 10 дзяўчат, гула карчма, штогод 20 ліпеня і 15 жніўня праводзіліся кірмашы. Усё было як у людзей. Сяляне-тубыльцы, апрача земляробства, займаліся сталяркай і бондарствам.

У 1904 г. царкву Ўсьпеньня Прасьвятое Багародзіцы ў Басьценавічах, дзе ўжо было 66 двароў, разбудавалі ізноў. Цяпер гэтая драўляная царква набыла ўжо й псэўдарускі выгляд. Што да яе ўбраньня, то тут яшчэ зьберагаліся шыкоўныя ўніяцкія аўтары, багата розных абразоў у старасьвецкіх шатах, шмат самых розных царкоўных рэчаў розных эпох. Гадоў дзесяць таму гэтая царква, у шатах векавых дрэваў, выглядала цалкам прыстойна. Ад яе сыходзіў непадробны дух старасьвеччыны.

## Раскіданае гняздо

Сёньня ў Басьценавічах — як паўсюдна на Ўсходзе Беларусі. Страшныя бэтонныя манумэнты ў напамін пра мінулую вайну. Гразь на вуліцах. Стракацень «вэртыкальных» транспарантаў. Бедная вясковая крама, у якой трывала перамяшаліся ўсе вядомыя тутэйшым людзям пахі. Як завозяць хлеб — паўстае чарга. Мужыкі ўсе нападпітку. На пачатку лютага сёлета ў Басьценавічах быў звычайны пажар. У сваёй хаце загінуў мужык — парушэньне правілаў эксплюатацыі пячнога ацяпленьня.

Заўважылі фотаапараты, чарга па хлеб загарнулася, і наперабой людзі пачалі клясьці свайго старшыню калгасу. Не, не за мізэрныя грошы ці чорную працу. За тое, што самавольна пасьпілоўваў старыя бярозы вакол ставочка! «Адзін тут пэнсіянэр апошнюю бярозу гэтую абняў, абхапіў. Ня даў сьпілаваць хоць яе...»

Усім гуртом як адзін пачалі выказваць і іншыя крыўды: сьпілаваў старыя ліпы вакол царквы, што яшчэ прадзеды саджалі, птушыныя гнёзды паскідаў, паздымаў з царквы купалы й дах, шалёўку царкоўную абадраў, сабе на панадворак зьвёз... Быў некалі поп, прыехаўшы з Воршы, паслужыў пяць гадоў і... прапаў (цалкам тыповы выпадак у гэтых краях). Зьехаў разам з найбольш каштоўнымі рэчамі, што былі ў царкве.

**Юлія Кананенка ратуе ва ўласнай хаце царкоўны прастол.**



АЛЕСЬ МАТАФОНАЎ

У панявечанай і закінутай сьвятыні ідзе дождж... «Мы б самі ўсё зрабілі, але ж... Ці мала што ў галаву яшчэ прыйдзе таму старшыню ці якому яшчэ начальніку? Раней жа мы ўсё выдатна даглядалі...»

Самыя каштоўныя абразы й харугвы перахоўваюцца цяпер у хаце Жалязоўскіх. Раней тут жыла скарбніца прыходу Покрыва Прасьвятое Багародзіцы. Цяпер галоўным захавальнікам басьценавіцкіх рэліквіяў стаў яе сын Рыгор Жалязоўскі. Усе яны ў належным стане, ашчадна складзеныя, далей ад несумленных людзей. Сам спадар Рыгор — чалавек непісьменны ў пытаньнях веры, пра што шчыра шкадуе. Бо пасьля сьмерці маці ня ведае ўжо, што да чаго й калі якое сьвята. Ня ведае й што

**Працяг на старонцы 30**

працяг са старонкі 29

# Помнікі нашы...

за абразы, якія ён зьберагае. Але ён дакладна ведае, што ён мусіць іх зьберагчы. Не для сябе, а для ўсіх.

А сьвятарскія рызы, кнігі ды іншы царкоўны рыштунак зьберагае старшыня прыходзкага камітэту Юлія Кананенка. Гэтая запрацаваная ўдава ў сваёй беднай і цёмнай хаце зьберагае сапраўдныя скарбы. Шчырая верніца, і пра вясковую царкву яна гаворыць як пра свой сапраўдны дом. Цяпер яна ня верыць уладам — ні цывільным, ні царкоўным. Яна ня можа ўзяць у цям, як можна было раскідаць у нашае XXI ст. сьвятыню, што выстаяла праз усе навалы, войны й пажары? Царкву ў Басьценавічах не наважваліся зьнішчыць ні камуністы, ні нацысты. Варта толькі было прычакаць сваёй роднай калгаснай улады.

Справа ў тым, што калгасная ўлада гэтак дэманструе сваю ўсясільнасьць. Зламаць сьвятыню — гэта ж як разадраць сьцяг. Гэта — максымальнае пачуцьце ўсёдазволенасьці. Нішчыць тое, што ты не будаваў, тое, што пераўзыходзіць сваімі гадамі твае ўяўленьне, тое, што некаму вельмі дарагое.

Наша нацыянальная спадчына знаходзіцца пад самай вялікай пагрозаю за ўсе гады свайго існаваньня. Калі ж нешта й ацалее пасьля гэтага шалу вандалізму, то ўжо ж ня дзякуючы ўладзе, што ўсё падмінае пад сябе й прыпісвае ўсё адно сабе. Нешта ў Беларусі можа зьберагчыся толькі дзякуючы рупнасьці гэткіх мужчынаў і кабет, якія вынясуць помнікі нашыя на сваіх мазолістых руках.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Гэтага дому на рагу Калектарнай і Нямігі ўжо няма.


СЯРГЕЙ ХАРЗЎСКІ

Усё, што засталося ад камяніцы ў Слоніме.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

На чарзе — капітальныя будынкі менскай Лошыцы.

Сёньняшні вандалізм матываваны грашыма і невуцтвам.


АЛЕСЬ МАТАФОНАЎ

# Харавыя сьпевы бруднай бялізны

Сэзон «Свабоднага тэатру» адкрыўся маналёгамі майткоў і нецэнзурнаю лаянкай.

Новы сэзон «Свабоднага тэатру» распачаўся 4 верасьня брутальнай камэдыяй Паўла Пражка «Майткі». Прэм’ерны спэктакль ладзіўся на адкрытым паветры — пад тэнтам адной з кавярняў. Дзеля канспірацыі — на просьбу арганізатараў — не паведамляю назвы гэтай кавярні, але адбывалася ўсё ў цэнтры гораду пад самым носам афіцыёзу.

У афішцы, раздадзенай перад прэм’ерай «Майткоў», давалася тлумачэньне на расейскай мове, чым ёсьць гэты аб’ект споднай бялізны.

Але ўсе пытаньні, чаму беларускі аўтар аддае перавагу расейскай мове, зьнікі самахоць пасьля таго, як пачаўся спэктакль. Акторы ў суворых філярманічных касьцюмах — згодна з «канцэртным выкананьнем п’есы» — адкрылі тэчкі і пачалі гучна дэклямаваць.

Сяміпавярховай лаянцы, аздобленай рэчытатывам, пазайздросьцілі б і дасьведчаныя партовыя грузчыкі. Публіка аслупянела й зафыркала, быццам словы ..., ... і ... яна пачула ўпершыню.

Калі заплюшчыць вочы на ..., то зьмест п’есы зводзіцца прыкладна да наступнага.

Дзяўчына Ніна вывесіла сушыцца свае майткі-стрынгі. Іх скралі. Гераіня цяжка пакутуе, размаўляе з астатнімі майточкамі, моліцца, кепскі міліцыянт дамагаецца прыгажуні, а суседкі мараць спаліць яе на вогнішчы (чырвоная сьвечачка дадаецца). Ёсьць яшчэ іншапланэтніцы, харавыя сьпевы майткоў і нябожчык у спальніку.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Героі гэтага дзікунскага трэш-авангарду даўно ня людзі, а пашкамутаныя ўрыўкі гутарак. Савецкі «народны» хор гарадзкіх ускраін — узаконены Ёсіфам Бродзкім яшчэ ў «Представлении», асучасьніўся «дэрыдоўскімі» інтэрнэт-фразамі, трасянкаю і канвульсіямі цела (мінэт, ваніты).

«Свабодны тэатар» зьдзейсьніў мару шматлікіх творцаў — зьнішчыў мяжу паміж жыцьцём і мастацтвам. Калі б актораў раптам арыштавала міліцыя, а мясцовыя забулдыгі дадалі свае рэплікі — гэта сталася б неад’емнай часткай спэктаклю.

Раз няма межаў, рэжысэрскія выбрыкі Ўладзімера Шчэрбаня немагчыма аддзяліць ад бамжовых прыкідаў, выдрэсіраваную акторскую ігру ад п’яных разборак, а драматургію Пражка ад «Панарамы». Тэкст ужо не адрозны ад асяродзьдзя.

Мікалай Халезін кажа, што п’есу ў Латвіі й Расеі ўспрынялі дваіста: адныя казалі пра новае слова ў драматургіі, другія — што твор Пражка — пустышка.

Гэта няслушная супярэчнасьць.

Для нас важна, наколькі спэктакль зьменіць тэатральны беларускі ляндшафт.

Тое, што практыка «Свабоднага тэатру» становіцца школай для беларускіх актораў, драматургаў і рэжысэраў, — гэта праўда. Беларускія акторы ў спэктаклях граюць — і прыходзяць іх паглядзець.

Таксама праўда, што п’еса Пражка — правакацыя што да мясцовай тэатральна-акадэмічнае летаргіі.

Але падобныя рэчы заўжды былі зьяваю пераходнаю. Ад дна адштурхоўваліся, каб убачыць Неба.

Ананімна-гвалтоўныя «дыскурсы» даўно выкрыў Бэкет. Перабудовачны чарнушнік Сарокін утвараў цэлыя п’есы на расейскім маце.

«У сучаснай трагедыі гіне не герой, гіне хор», — казаў шчэ ў 70-я гады Бродзкі.

Хор сканаў, гледачы абсьмяяліся.

Ці не запозна для Беларусі?

**Андрэй Расінскі**

# Уладзімер Някляеў: «Мы стаміліся, патрэбная сьвежая кроў»

5 верасьня ў дольнай залі Чырвонага касьцёлу быў сход Беларускага ПЭН-Цэнтру.

Распачаўся ён ушанаваньнем памяці Янкі Брыля. Падчас сходу таксама былі ўручаныя прэміі імя Ф.Багушэвіча і А.Адамовіча за 2006 год. Першую атрымаў Леанід Маракоў за кнігу «Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асьветы, грамадзкія і культурныя дзеячы 1794—1991». Аўтар , які паклаў доўгія гады жыцьця і здароўе на выданьне даведніка-помніка, заўважна хваляваўся, прымаючы ўзнагароду.

Сяргей Навумчык уганараваны прэміяй імя А.Адамовіча за кнігу «Сем гадоў Адраджэньня. Фрагмэнты найноўшай беларускай гісторыі (1988—1995)». У адсутнасьць аўтара з рук дачкі А.Адамовіча Натальлі дыплём атрымаў дырэктар Беларускай службы радыё «Свабода» Аляксандар Лукашук, які зачытаў вітальнае слова С.Навумчыка.

Мерапрыемства праходзіла пад знакам падзеяў лета: канчатковага высяленьня Саюзу беларускіх пісьменьнікаў з Дому літаратара, расейскамоўных падручнікаў па гісторыі Беларусі ды ініцыяваных Лукашэнкам зьменаў правапісу. З гэтай нагоды выступіў Алесь Пашкевіч. Аднак варыянты выхаду зь існай сытуацыі прапаноўваліся розныя: старшыня ТБМ прапаноўваў ісьці на кантакт з уладай. «Вось жа Іпатава прымусіла з сабой лічыцца, а Пашкевіч не кантактаваў з уладай, таму й страцілі мы памяшканьне».

З гэтай думкай шмат хто не пагадзіўся. Франц Сіўко, старшыня віцебскай абласной філіі СБП, лічыць такія кантакты бессэнсоўнымі. Сяргей Законьнікаў і Вольга Іпатава выказалі аптымізм з нагоды выступленьняў 1 верасьня ў школах: «Нас запрашаюць на сустрэчы, нягледзячы на забароны міністра адукацыі». Былая кіраўнічка пісьменьніцкага саюзу заклікала шчыльна працаваць з рэгіёнамі, дзе яшчэ ёсьць магчымасьць выдавацца. С. Законьнікаў параіў спадзявацца на свае сілы, бо «ні Амэрыка, ні Эўропа нас не ўратуюць, калі ня будзем змагацца самі».

На сходзе прагучалі прапановы судзіцца зь міністрам адукацыі за забарону «недзяржаўным» пісьменьнікам праводзіць творчыя сустрэчы ў школах.

Дзейны старшыня арганізацыі Ўладзімер Някляеў падаў заяву аб сыходзе з пасады. «Аб'ектыўна кажучы, мы, выхаваныя ў «саўку», ужо не спраўляемся даганяць час, мы стаміліся». Ён прапанаваў на сваю пасаду кагосьці маладзейшага. Аднак Уладзімер Арлоў прапанаваў Някляеву кіраваць яшчэ год.

Пэўнае абнаўленьне арганізацыі ўсё ж адбылося: першым намесьнікам старшыні быў абраны Андрэй Скурко, намесьнік рэдактара «НН».

Беларускі ПЭН-Цэнтар — адна з тых арганізацыяў, якія былі створаны з ініцыятывы зьнізу, а не паўсталі з савецкіх утварэньняў. Яе кіраўнікамі ў свой час былі Васіль Быкаў і Рыгор Барадулін.

**Сямён Печанко**

# Прамова Сяргея Навумчыка

з нагоды атрыманьня прэміі Беларускага ПЭН-цэнтру імя Алеся Адамовіча

Калі гаворка ідзе пра такія падзеі, як аднаўленьне Незалежнасьці дзяржавы, роля аўтара зводзіцца да ўменьня як мага дакладней зафіксаваць тое, што ён бачыў. У мяне хапае цьвярозасьці разумець, што сёньняшняй высокай прэміяй адзначаная менавіта тэма. І гэта важна, бо працяглы час пэрыяд найвышэйшага нацыянальнага ўздыму падаваўся ледзьве не як параза. Бадай што толькі ў нас, у беларусаў, стварэньне дзяржавы можа быць аднесенае да катэгорыі палітычнай няўдачы — тым часам як у сьвеце гэта прынята лічыць вяршыняй праявы нацыянальнай волі.

Сёньня важна прыгадаць тых, дзякуючы каму мы маем Беларусь — яшчэ ня вольную, але ўжо незалежную, хто працягнуў распачатае Каліноўскім, Купалам, стваральнікамі БНР.

Гэта, найперш, дзясяткі тысячаў людзей самага рознага ўзросту, якія ўставалі пад сьвяты Бел-Чырвона-Белы Сьцяг: і на плошчы перад Домам ураду ў Менску, і на вуліцах гарадоў ды мястэчак. Кожны зь іх мог бы ўласным вопытам абвергнуць тэорыю, што нібыта «Незалежнасьць на Беларусь звалілася зь неба». Вартай гэтых беларускіх патрыётаў была і інтэлектуальная эліта. У кастрычніку 1988-га тут, у Чырвоным касьцёле, аргкамітэт Народнага Фронту стваралі лепшыя прадстаўнікі творчай інтэлегенцыі. Хацеў бы, каб сёньня ў гэтых сьценах прагучалі імёны тых, хто ўжо пайшоў ад нас: Янкі Брыля, Васіля Быкава, Артура Вольскага, Яўгена Глебава, Міхася Дубянецкага, Яўгена Куліка, Валер'я Масьлюка, Пімена Панчанкі, Стэфаніі Станюты, Максіма Танка, Міхася Ткачова…

Мяркую, што са мной пагодзіцца Зянон Пазьняк, — бязь іх падтрымкі, як і падтрымкі Ўладзімера Арлова, Рыгора Барадуліна, Генадзя Бураўкіна, Сяргея Законьнікава, Віктара Казька, Алеся Разанава, Валянціна Тараса (тут называю толькі сяброў ПЭН-Цэнтру), нам было б значна цяжэй працаваць у суседняй з Чырвоным касьцёлам Авальнай залі.

Праўда, аднойчы спроба аднаго выдатнага пісьменьніка дапамагчы нам у той залі скончылася драматычна.

Шаноўны Алег Трусаў у «Нашым Слове» закінуў мне папрок, што ў сваёй кнізе я недастаткова поўна асьвятліў ролю КПСС і камуністаў у працэсе нацыянальнага Адраджэньня. Мне цяжка ўявіць, што яшчэ можна дадаць пра камуністаў пасьля Аляхновіча і Салжаніцына, але паспрабую.

У сьнежні 1990 году Алесь Адамовіч прыехаў з Масквы ў Менск, і я запытаўся, ці не жадаў бы ён прыйсьці на сэсію Вярхоўнага Савету. Абмяркоўваўся За-

# Прэмія Багушэвіча за энцыкляпэдыю рэпрэсаваных




Каб выдаць мартыралёг беларусаў, Леанід Маракоў прадаў уласнае аўто.

кон аб зямлі. Апазыцыя БНФ прапанавала свой праект, з правам прыватнай уласнасьці на зямлю. У беларусаў нарэшце зьявіўся шанец зьдзейсьніць коласаўскую мару — «прыдбаць свой кут». Камуністычная ж большасьць настойвала на захаваньні калгасна-саўгаснага ладу. Алесь Міхайлавіч сказаў, што ня толькі прыйдзе, але і выступіць — балазе статус народнага дэпутата СССР даваў яму такую магчымасьць. Неабходныя паводле рэгляманту 20 подпісаў дэпутатаў я сабраў сярод «франтаўцаў» за пяць хвілінаў.

Адамовіч яшчэ не падышоў да трыбуны, а дэпутаты-камуністы ўжо ажывіліся. Адны прачнуліся, другія прыбеглі з буфэту, іншыя адклалі паўпарнаграфічныя газэткі. Прамову Адамовіч пачаў у цішыні, але ўжо праз хвіліну ягоныя словы нельга было пачуць з-за абуральных воклічаў; нехта нават грукаў пюпітрам. На галёрцы ў трэцім сэктары крывіўся самы малады дырэктар самага адсталага саўгасу. У крамлёўскім Палацы зьездаў Адамовіча зганялі з трыбуны не сакратары райкамаў, а члены Палітбюро, не генэралы, а маршалы — ды вось жа нашыя, беларускія, былі хай і тытуламі драбнейшыя, затое нейкія больш злыя ды аўчарыстыя. Дагаварыць Адамовічу не далі — ён сышоў з трыбуны ў роспачы, глытаў нейкія таблеткі. Сумую, што мая ініцыятыва забрала ў яго колькі дзён жыцьця.

Калі сёньня нас папракаюць, што мы не шукалі альянсу з камуністамі і не абапіраліся на кіраўнікоў калгасаў – мне прыгадваецца сагнаны з трыбуны Алесь Адамовіч.

Дзякую за ўзнагароду і шкадую, што не магу адзначыць яе зь сябрамі ПЭНу традыцыйным чынам. Сучасныя сродкі камунікацыяў дазваляюць у эміграцыі ня толькі сачыць за падзеямі ў Беларусі ў рэжыме рэальнага часу, але, у пэўным сэнсе, нават рабіцца іх удзельнікамі. Праз Інтэрнэт можна пераслаць кнігу, радыёперадачу, фільм, гэтую прамову, але, на жаль, не гарэлку. Але я спадзяюся быць у Беларусі значна раней, чым прагрэс ліквідуе гэтую тэхнічную недасканаласьць.

Уладзімер Някляеў адзначыў: дасьледчык выканаў працу цэлага інстытуту. Шматтамовы даведнік ня мае аналягаў. Гэта помнік, які пляменьнік паставіў свайму дзядзьку, Валер'ю Маракову, закатаванаму ў 1937-м (**ягоны партрэт — на сьцяне кабінэту Л.Маракова**). Каб выдаць даведнік, В.Маракоў прадаў свой мікрааўтобус. Але праца далёкая ад завяршэньня. Калегі на сходзе ПЭН-Цэнтру сумна жартавалі: ёсьць жа яшчэ кватэра. Вядома, РБ не дае на такія кнігі ні капейкі.

Аўтар рыхтуе да друку працу "Толькі адна ноч". Гэта ноч 29 кастрычніка 1937 году, у якую была вынішчаная амаль уся інтэлектуальная эліта Беларусі. Ёсьць там і зьвесткі пра катаў, якія ў раскошы дажывалі на праспэкце Скарыны...

**Сямён Печанко**

**Леанід Маракоў** (нар. у 1958) — празаік і гісторык. Аўтар даведнікаў "Валеры Маракоў. Лёс. Хроніка. Кантэкст", "Вынішчэньне". Аўтар кніг прозы: "Непамяркоўныя I", "Непамяркоўныя II", "Трое", "100 мініятур". Выдаў 3 тамы даведніка "Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асьветы, грамадзкія і культурныя дзеячы Беларусі 1794—1991". Жыве ў Менску.

# Рэчы, дзеля якіх мы жывём

Або нашто нам крутыя мабілкі? Піша **Руслан Равяка**.

Культ рэчаў валадарыць Беларусяй. Шкодныя звычкі сярэднявечных магнатаў ды азіяцкіх шагаў дасюль не пакідаюць нас. Савецкі рэжым, хаця і сьцьвярджаў адваротнае, замацаваў у нас гэтыя прынцыпы. Ня важна, колькі ты зарабляеш, галоўнае, як ты выглядаеш.

Некалі, у 1996 годзе, калі сярэдні заробак сягаў 50 даляраў, знаёмая галяндка, што пісала дыплёмную працу ў Баранавічах пра суіснаваньне хрысьціянскіх канфэсіяў, распавяла, што найбольш уразіла яе тут. Найперш гасьціннасьць, калі на стол гасьцям (асабліва замежным) выкладаецца ўсё, што ёсьць у хаце; уменьне 95 працэнтаў жыхароў садзіць і капаць бульбу; а таксама аўтамабілі…

— Вы ўвесь час стогнеце, што бедныя, што ў вас малыя заробкі… але на якіх шыкоўных аўто вы езьдзіце?

Я тады змаўчаў, што ў гэтыя дарагія самаходы нават заможныя ўладальнікі лілі танны бэнзін, калі не дармавое калгаснае/вайсковае дызпаліва. У лепшым разе 92-гі перамешваўся з 76-м напалову.

Гэткая паказуха трывае і дасюль. Хто жыў на Захадзе больш-менш доўга, ведае: рэчы мусяць быць прыдатныя табе, а не людзям. Большасьць палякаў і цяпер пры добрых заробках не сьпяшаюцца мяняць свае старыя мабілкі зь зялёнымі манахромнымі дысплэямі. Калі тыя, зразумела, працуюць. У нас жа сотавыя сталіся такой самай рэччу, што вызначае ступень тваёй заможнасьці. Як некалі першыя відэамагнітафоны.

Крутыя мабілкі з FM-прымачамі, лічбавымі камэрамі ды нават падлікоўцамі крытычных жаночых дзён уражваюць сваёй крутасьцю. Але шмат хто з гаспадароў таго тэлефона ледзь-ледзь падтрымліваюць станоўчы балянс, па некалькі разоў даведваючыся пра стан свайго рахунку.

Тое самае датычыць і вопраткі, і ежы, і мэбляў у кватэры… Шмат чаго. Паказуха. У Расеі, кажуць, дайшло да таго, што модна і шыкоўна нават зьбіраць кардонкі-візытоўкі ўрадоўцаў і выбітных асобаў. Некалі гэтым грашылі магнаты і шляхта. Бальшавікі, раўняючы ўсіх, прывялі да таго, што тая загана распаўсюдзілася на ўсё грамадзтва. Нястача простых і патрэбных рэчаў прынесла гэткія наступствы.

У Баранавічах дасюль старыя людзі вам раскажуць байку, як у 1940 годзе, па далучэньні Заходняй Беларусі да БССР, дочкі прыежджых камуністаў (іншых не дапускалі на ўзьяднаныя землі) прыйшлі ў школу на выпускную вечарыну ў начных кашулях з вышыванкамі. Тутэйшыя дзяўчаты жагналіся, мясцовыя хлопцы сьмяяліся. Усходнікі думалі, што гэта сукенкі для балю.

*Баранавічы*

## Як нам пашырыць шэрагі

**Я ў свой час даведалася пра «Нашу Ніву» з падпіснога каталёгу Белпошты. Назва вельмі гучная (білеты па гісторыі ў школе я добра вучыла!).**

Вырашыла выпісаць на месяц спачатку, праверыць, што гэта ёсьць і ці прыдатнае гэта да спажываньня паводле прызначэньня, а то іншыя можна толькі на гаспадарчыя патрэбы пускаць.

...Сёньня можна канстатаваць, што адмову Белпошты ў распаўсюдзе «Наша Ніва» так ці інакш перажыла. Ня ўсё так проста, ня ўсё ідэальна, зьмяніўся фармат выданьня і месца падпіскі (замест пошты — банк), ускладніўся працэс дастаўкі... Але мы (чытачы-падпісчыкі і шаноўная Рэдакцыя) пратрымаліся дастаткова часу, каб стала зразумела, што ад нас так проста не пазбавіцца! Што «Наша Ніва» была, ёсьць і будзе разам са сваімі вернымі чытачамі!

Але. Верныя старыя сябры-чытачы — гэта, безумоўна, добра. Аднак мне падаецца, што ўжо прысьпеў час падумаць і пра новых, пра тое, як пашырыць кола чытачоў. Камусьці пра газэту распавядуць знаёмыя, камусьці пашчасьціць даведацца пра газэту ў грамадзкім транспарце і атрымаць у падарунак які-небудзь нумар ад пастаяннага чытача... Толькі ж гэта адзінкі!.. Вядома, добрая рэкляма патрабуе добрых выдаткаў. Але, па-мойму, ёсьць рэчы, якія можна было б зрабіць з найбольшай эфэктыўнасьцю і з найменшымі выдаткамі.

Часам «Наша Ніва» друкуе рэклямныя абвесткі. Было б цудоўна, калі б Вы надрукавалі (ідэальны варыянт — фармат А4) у газэтцы і ўласную рэкляму. Такую, якую б кожны чытач мог выразаць з газэты і прымацаваць (прычапіць, прыляпіць) дзе-небудзь. Ну, хаця б на дошку для абвестак каля ўласнага пад'езду. (Выбар месца цалкам залежыць ад уласнай фантазіі.) Мне падаецца, што шмат хто з чытачоў пагадзіўся б з маёй думкай і быў бы ня супраць расклеіць некалькі абвестак (тым болей, што шмат часу гэта ня зойме). Узор рэклямы можна было б павесіць на сайце, каб ахвотнікі дапамагчы маглі згрузіць яе і раздрукаваць у патрэбнай колькасьці на друкарцы. З фарматам можна пагуляць...

Напрыклад, А4 — для вывешваньня і А5 — каб кідаць у паштовыя скрыні. Я б сама з радасьцю надрукавала з сотню такіх рэклямак-улётак, але вырашыла спачатку напісаць вам. Я ўпэўнена, што не адзіная сярод чытачоў «Нашай Нівы» такая «аматарка рэклямнай дзейнасьці». Таму добра было б распаўсюджваць рэкляму адзінага ўзору, а не каб кожны рабіў на свой капыл. Так мы даможамся меншай верагоднасьці памылак друку, недакладнасьцяў ці кепскай якасьці, а таксама большага эфэкту масавасьці. Карацей, лепей адна прадуманая кампанія і аб'яднаныя намаганьні, чым асобныя разьяднаныя памкненьні да карысных для «Нашай Нівы» дзеяньняў. Ну, а калі, на маю думку, лепей за ўсё такія дзеяньні чытачоў магла б скаардынаваць менавіта Рэдакцыя, то і пішу адразу да вас.

Такім чынам, буду чакаць ад вас адказу ў любой форме.

З найлепшымі зычэньнямі,

**Тацяна М., Менск**

**Ад Рэдакцыі.** Дзякуй, пашукаем спосаб задаволіць попыт. Пішэце, калі ласка, яшчэ, што варта было б рабіць. Дарэчы, анонсы значных культурных падзеяў і «Напішы палітвязьню» мы так адмыслова робім, каб гэтыя непалітычныя афішкі можна было лёгка множыць і пашыраць.

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас:**
**а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29.**







У свой час

Эдвард Вайніловіч

Магдалена Радзівіл

Васіль Быкаў

# ахвяравалі на «Нашу Ніву»

з пачатку 2006 году
газэта атрымала
6200 ахвяраваньняў
з усіх куткоў Беларусі.
Дзякуй!



# Дыхаць



Праект, «Гукі і малюнкі», 2006.

«Бяжы, хлопец», «Беларусь uber alles», «Радзіма-Свабода» ды іншыя гіты былі адмыслова перазапісаныя да гэтага праекту.

Дыск, які чакалі яшчэ летась, зьявіўся ў дыскарнях незаўважна. Бяз гучных прэзэнтацыяў і лішніх словаў. Грошы на яго выданьне сканчаліся, а потым знаходзіліся і сканчаліся ізноў. Таму рэліз праз увесь час адкладаўся. Па выхадзе ён пакінуў шмат пытаньняў.

Чакалі новы музычны праект, выйшаў чарговы «The Best». «Бяжы, хлопец», «Беларусь uber alles», «Радзіма-свабода» ды іншыя беларускія гіты былі адмыслова перазапісаныя да гэтага праекту. Цікавей было б пачуць новыя творы ад «Крамы», *Neuro Dubel* і *ZET*. А так «старыя» запісалі для «Дыхаць» свае галоўныя гіты, а «маладняк» (*IQ-48*, *Indiga*, *:B:N:*) — абсалютна новыя творы.

Канцэпцыі не праглядаецца, калі гэта ня ёсьць канцэпцыяй, вядома.

Галоўная разынка праекту, якую ня кожны заўважыць,— усе трэкі прапісваліся на польскай студыі *Rembrandt*. Таму гучаньне песень цешыць. Асабліва шыкоўна гучыць 8-хвілінная споведзь Сенькі з *Zero-85* («Вольны») і апошні па часе гіт «Палацу» — «Кола грукатала».

Пакідае пытаньні «Уліс», які перапісаў для складанкі добрую, але не выбітную песьню зь «Люстэрка» — «Мы ўцякаем». Цікавае, але малазразумелае бліцвяртаньне «Мроі» з гітом 15-гадовай даўніны — «Краіна крывавых дажджоў».

З новага асабліва чапляе «Бяжы са мной» гурту *Indiga*, якія істотна паляпшэлі з моманту выхаду іх дэбютных «Дзён». Ну, і дзьве песьні, якія сталі гітамі яшчэ да моманту іх выданьня: «Сьвятло ў цемры» *IQ-48* і «Гадзючнік» («Усё роўна мы пераможам») *N.R.M.*

Мець дыск у хатняй калекцыі варта. Няхай зойме месца на палічцы побач з «Генэраламі айчыннага року» і «Песьнямі свабоды».

# Крок




«Крок», West Records, 2006.

Някіслая альтэрнатыўшчына клюбнага ўзроўню.

Зрэдчас кампанія *West Records* цешыць альтэрнатыўнымі рэлізамі, а рэлізамі маладых выканаўцаў яшчэ радзей. «Крок» — заўсёднік вечарын памяці Курта Кабэйна. Таму стылістыка — адпаведная, так і карціць на кожную песьню «Кроку» павесіць цэтлік «гранж». Пра самабытнасьць тут і не вядзецца. Затое альбом сьведчыць: у Беларусі зьявілася яшчэ адна прыстойная альтэрнатыўная каманда. І хочацца спадзявацца, што яна будзе рухацца наперад. Прынамсі, песьні «Рай», «Падман», «Пан Крою» даюць спадзеў на тое. Найбольш удала ў «Кроку» ўдаецца тады, калі яны забываюцца на Кабэйна. Тады выходзіць някіслая альтэрнатыўшчына клюбнага ўзроўню. Ня варта забывацца, што гэта дэбютны альбом гурту, таму можна канстатаваць: крок зроблены. З часоў *Happy Face* у гэтай плыні нікога годнага не назіралася. Рэкамэндуецца ўсім прагным да новага ў беларускай музыцы.

# Паглыбленьне




Pete-Paff, 2006.

Ня сорамна немцу падарыць.

Густоўна аздоблены і народжаны ў творчых пакутах дэбютны дыск фольк-праекту Піта Паўлава. Піт прапануе сваю інтэрпрэтацыю шэрагу народных песень: ад некранутых «фольк-мадэрністамі» твораў да клясычных «Касіў Ясь», «На Купалу». Альбом слухаецца лёгка. Першыя фольк-спробы Паўлава выклікалі ўсьмешку: гэта было нецікавае прыпадабненьне да вядомых фольк-гуртоў. Але здаровая нахабнасьць Піта і музычны талент зрабілі сваю справу: «Паглыбленьне» — годны фольк-праект з масай цікавых музычных хадоў і ўдала падабраным рэпэртуарам. У ягоным запісе на кухні Піта (гэтага факту музыка зусім не саромеецца) было скарыстана два дзясяткі інструмэнтаў. Акрамя непасрэдных удзельнікаў капэлі, да запісу спрычыніліся Масуд Талібані, Аляксандра Кірсанава, Алесь Пузыня. Добра прадуманы альбом, які ня сорамна прэзэнтаваць па-за межамі краіны.

# Ананімка



«Ананімка», West Records, 2006.

Так бы сьпяваў Мамонаў, калі б ён быў 20-гадовай дзяўчынай.

Падвальны экспэрымэнтальны попс ад праекту, якім займаецца прадусэр *Personal Depeche* Адам Старповіч. Гэты праект будзе меней пасьпяховы, і таго «Ананімка», відаць, дамагаецца адмыслова, прадукуючы наўмысна тупаватыя тэксты пад немудрагелістую сынтэзатарную музыку. Магчыма, так бы жартаваў Пётар Мамонаў, калі б ён быў 20-гадовай дзяўчынай. На хвалю «Ананімкі» можна трапіць, і тады ўсе гэтыя песенькі пададуцца мілымі і сьмешнымі. Такая ж сытуацыя і зь іншым гуртам — «Срэбранае вясельле» (нешта, дарэчы, у іх з «Ананімкай» ёсьць роднаснае). У іншым разе — дыск сапраўды можна выкінуць на сьметнік. Ці тое зьдзек з папсы, ці сваё бачаньне лёгкага жанру. Праўда, песьня са словамі «Я невідзімка, павер мне, Дзімка» выглядае на тле нашай эстрады зусім ня кепска. А тонкага, сьціплага і не заўжды роўнага голасу вакалісткі Насты дакладна ні з чым іншым не паблытаеш. Для ўсіх тых, хто ня любіць альтэрнатывы, але ня можа слухаць банальнае папсы.

**Сяргей Будкін**

# Кропля салідарнасьці ў краіне цынізму

Польскі гіт часу «Салідарнасьці» стаў песьняй году ў Беларусі. Піша **Алена Скорабагатава**.



ДЖЭФ БАНІФАЦЫНА

**Міхал Анемпадыстаў.**

На апошнім этапе галасаваньня супраць у выніковым мэгатуры на «Тузіне Гітоў» песьня «Аўтабіяграфія» ў выкананьні Ігара Варашкевіча і Лявона Вольскага спаборнічала са «Сьвятлом у цемры» здаровых ласей з *IQ-48*. У выніку песьняй году стала «Аўтабіяграфія», галоўны гіт польскага гурту *Perfect* у беларускім варыянце, а чалавекам году на «Тузіне» прызнаны Міхал Анемпадыстаў: абедзьве песьні, якія дайшлі да вырашальнага апераджэньня, напісаныя на тэксты аўтара «Народнага альбому»!

Сам Міхал Анемпадыстаў на прысуджаны тытул рэагуе сьціпла. Я, канечне, малайчына, але ёсьць людзі, якія б больш пасавалі да «чалавека году».

Што датычыць песьні году, якой на «Тузіне» стала «Аўтабіяграфія» ў выкананьні Варашкевіча і Вольскага, — гэта адна з кампазыцыяў супольнага музычнага праекту *Solidarni z Bialorusia*, які быў створаны гэтай вясной. Гэта быў адзіны канцэрт у Варшаве, на якім гучалі песьні 80-х, што ў свой час натхнялі палякаў на змаганьне за сваю свабоду. Пераклады песень, на якіх ужо выгадавалася не адна генэрацыя ў Польшчы, амаль што ўсе былі зробленыя М. Анемпадыставым: «Такая ідэя — праспяваць па-беларуску гэтыя вядомыя польскія песьні 80-х — узьнікла вельмі даўно».

М. Анемпадыстаў падкрэсьлівае: «Усё не выпадкова, і нават не таму, што гэта песьня з таго сакавіцкага канцэрту — мала хто глядзеў або ведаў пра гэты канцэрт. Гэтая песьня гурту *Perfect* была ў Польшчы вялікім гітом! Першатвор, які мы выкарысталі, — варты таго, каб стаць песьняй году і ў Беларусі».

«Аўтабіяграфія», якую выконваюць Ігар Варашкевіч і Лявон Вольскі, — цалкам адаптаваная вэрсія ня толькі для Беларусі, але нават для саміх выканаўцаў. «Калі б мы проста пераклалі гэтую песьню, — распавядае Міхал, — гэта б была ня нашая аўтабіяграфія, а спадара Маркоўскага, які выконвае яе ў *Perfect*. Мы паспрабавалі зрабіць нашую біяграфію, якая б адпавядала нашай рэчаіснасьці і нашаму жыцьцю. У першапачатковым варыянце быў радок пра *Beatles*, але Ігар сказаў, што ён слухаў *Rolling Stones*, — і перарабілі на *Rolling Stones*».

Што датыкае песьні «Сьвятло ў цемры», якая крышачку не дацягнула да перамогі, Міхал лічыць, што гэта цікавы твор, ня менш варты перамогі.

«Любы гіт-парад — гэта крыху шоў, інтрыга, — кажа Міхал. — Гітпарад робіцца не абавязкова, каб знайсьці пераможцу, а дзеля інтрыгі, спаборніцтва, каб весялей было жыць! Любыя вынікі ўмоўныя».

Дарэчы, калі б М. Анемпадыставу далі магчымасьць аднаму вызначыць песьню году, перамагла б лявонавольская «Усё роўна мы пераможам»: «Гэтая песьня трапіла ў час, у сэнс, у настрой людзей!»

**Першы тур у новым музычным сэзоне на «Тузіне Гітоў» распачнецца 8 верасьня.**

АЎТАБІЯГРАФІЯ

меў я дзесяць год
у мяне быў руды кот
мора часу і сяброў
быў вялікі двор
дрэвы вышынёй да зораў
і транзыстар Гарызонт

ён лавіў сыгнал
у паветры плыў–лунаў
электрычны звон гітар
бацька піў як конь
нам сьпявалі Ролінг Стоўнз
нешта пра Лэдзі Джэйн

а праз год ці два
неяк брат падараваў
мне гітару сэканд–хэнд
развучыўся спаць
дзень і ноч карцела граць
і хацеў сабраць свой бэнд

быў застойны час
я хадзіў у сёмы кляс
меў даўгія валасы
за каўнер хаваў
каб пазьбегнуць заўвагаў
час тады быў такі

нас было трох
звар'яцелых на рок
але мелі на мэце адно
граць рок–н–рол
і ісьці па жыцьці
за крокам крок

пані Вясна
нечакана прыйшла
на цымбалах забацала джаз
дзякуй Вясьне
закахаліся ўсе
у першы раз

зьведаў кожны з нас
першай здрады горкі смак
і салодкі смак віна
цыгарэтны дым
ні пра што і аб усім
гаварыльня давідна

адзваніў званок
здаў экзамэн так як змог
на чатыры і на тры
я ня стаў касіць
мяне ў войска забралі
я аддаў два гады

ўзяў і аддаў
мне дагэтуль шкада
тых дарэмна панішчаных дзён
за Бугам тады
абышоў гарады
смутны анёл

вецер падзьмуў
што ты зробіш яму
калі ён пачынае шалець
аднекуль зь нябёсаў
свабоду прынёс
нам на крыле

слухайце там!
я пражыў гэта сам
і нікому свайго не аддам
тое што ёсьць
я налью да краёў
лепшым сябрам

тут і цяпер
адамкнуліся дзьверы
за дзьвярыма дарогаў мільён
скончыўся дзень
але будзе яшчэ
шмат новых дзён

# Аплядысмэнты для сонца

Выспа Маёрка — гэта заходнеэўрапейскі Крым. Піша **Алесь Кудрыцкі**.

Валадар мора жыве на высьпе Маёрка. Ён смаліць дрэнныя цыгарэткі, носіць кароценькія падраныя джынсавыя шорты ды выцьвілую на міжземнаморскім сонцы бэйсболку. Валадар сноўдае туды-сюды, нібы зламаны ківач, ды хаатычна размахвае рукамі. Ягонае падбародзьдзе па-старэчаму трасецца, а з вуснаў зьлятаюць кроплі сьліны ды неразборлівая каталёнская скорагаворка. Ён займаецца аховай хваляў — забараняе чужаніцам кранаць нагой мора. Стужка пляжу даўжынёй у паўсотні мэтраў прызначаная толькі для гасьцей суседняга гатэлю. Надыходзіць ноч. Госьці сьпяць, чужаніцы распужаныя, а на пляжы адно дзядок-маярканец, які вартуе сваё мора, пустыя шэзьлёнгі ды шоргат хваляў.



**Пляж, Порт дэ Саер.**

## Піва, сэкс, Балерман

Выспа Маёрка — заходнеэўрапейскі Крым. Мора, скалы, турысты. З замежных найперш — немцы. Яны і запачаткавалі сумнавядомую традыцыю алькагольнага турызму, чыёй Мэкай ёсьць пляжны прамэнад ля Пальмы, сталіцы выспы. Найперш гэта знакамітая кнайпа «Балерман», дзе нямецкія турысты трускаюць нямецкія сардэлькі ды жлукцяць нямецкае піва пад нямецкамоўныя балерманаўскія гіты-шлягеры пра адвечныя каштоўнасьці вакацыяў: выпіўку, сэкс, сонца. Непадалёк баварцы ў капелюшах ды скураных шортах з падцяжкамі на голае цела дасьледуюць ракавіны на пляжы. Турыст з Бону атачаны парканам пустых піўных бутэлек, утыркнутых рыльцам у пясок. Радзіма-Дойчлянд дый годзе — хіба што ля сонечнага мора.

Нездарма ў 1993 г. дэпутат Бундэстагу ад кансэрватыўнай партыі ХДС Дыёніс Ёбст прапанаваў набыць Маёрку за 50 млрд дойчмарак ды зрабіць яе 17-й фэдэральнай зямлёй Нямеччыны. «Маёрка мусіць быць нямецкай!» — выбухнула загалоўкам бульварная газэта «Більд». Жыхары выспы ды нават сам гішпанскі кароль не на жарт пакрыўдзіліся, а дэпутаты не прынялі прапановы сур’ёзна. У пэўным сэнсе «плян Ёбста» зьдзейсьніўся: рэшту ў касах маярканскіх крамаў даўно даюць эўрацэнтамі, ці не палова якіх мае на сабе выяву нямецкага дубовага лістка ці Брандэнбурскай брамы — начыньне кішэняў нямецкіх турыстаў.

## Шматмоўная выспа

Сваім гістарычным лёсам Маёрка дужа нагадвае Бела-



**Галава рыбы на доме ганчара ў вёсцы Дэя.**

русь. Выспа заўжды ляжала на перакрыжаваньні гандлёвых шляхоў. Мірнае насельніцтва марыла пасьвіць авечкі ды вырошчваць садавіну, а мусіла адбівацца ад заваёўнікаў ды піратаў. Спачатку выспу заваявалі рымляне ды за палову тысячагодзьдзя лацінізавалі мясцовае насельніцтва. Але потым прыйшлі вандалы і дашчэнту спляжылі цудоўныя палацы ды тэрмы. Вандалаў прагналі бізантыйцы, а тых — маўры. Трохсотгадовае мусульманскае панаваньне ў XIII ст. скончылі каталёнцы, адваяваўшы выспу ды зруйнаваўшы шыкоўныя мячэты ды лазьні. Каталёнская мова зноў зрабілася мовай Маёркі — да канца XVII ст., калі выспа падпадае пад уладу Гішпаніі. XIX ст. — новая спроба моўнага адраджэньня, і — зноў адкат пасьля Грамадзянскай вайны ды прыходу да ўлады ў 1939 г. дыктатара Франка. Тры з паловай дзесяцігодзьдзі каталёнская мова была афіцыйна забароненая ды выгнаная з грамадзкага жыцьця на карысьць гішпанскай.

Толькі дзякуючы неверагодным высілкам апошняга часу удалося дамагчыся на высьпе рэальнага дзьвюхмоўя. Праўда, і дагэтуль той замежнік, хто спрабуе задаць пытаньне па-каталёнску, а то і па-маярканску, найхутчэй атрымае адказ па-гішпанску: спрацоўвае каляніяльны рэфлекс мясцовага насельніцтва.

На розных баках караценькай вулачкі ў мястэчку Порт дэ Саер глядзяць адзін на аднаго маленькія супэрмаркеты-блізьняты. У адным прадавачкі гавораць па-каталёнску ды прадаюць найтаньнейшыя таматы. У іншым — смачнейшы хлеб ды выключна гішпанская мова ля прылаўка. Затое ангельскую ды нямецкую мовы ведаюць і там і тут. На Маёрцы як нідзе веданьне мовы — гэта жывыя грошы.



**Бухта Са Калёбра.**



**Порт дэ Саер уначы.**

## Якар у хмары

На пошукі аўтэнтычнай Маёркі выпраўляемся на паўночны ўсход выспы зь яго стромымі скаламі ды маленькімі камяністымі пляжамі. У навакольных садах ля горнай вёсачкі Дэя сьпелыя аранжыкі ды цытрыны падаюць долу. Уздоўж дарогі цягнецца высокі доўгі мур з камянёў, змацаваных рудой глінай. На драўляных дзьвярох цыдулка: «Джон, мы ня трапілі ў дом, бо забыліся на ключы. Будзем а дзявятай увечары». За густымі дрэвамі ўгадваецца вялікая віла. Горная дарога-сэрпантын робіць кола, яшчэ адно, узьбіраецца вышэй... Яшчэ адны весьніцы — і такая самая цыдулка. Бачна, гэты Джон адхапіў сабе немалы кавалак гары. Так, дзякуючы турызму, Маёрка зрабілася самым багатым рэгіёнам Гішпаніі. Але менавіта з-за нямецкіх ды брытанскіх інвэстараў ды маклераў цэны на нерухомасьць на Маёрцы дасягнулі такіх вышыняў, узяць якія большасьць гішпанцаў ня мае моцы. Палова з 550 жыхароў вёскі — замежнікі з туга набітымі гаманцамі.

Дарога кружляе, матляецца ды прыводзіць да перакрыжаваньня. Турысткі-лацінаамэрыканкі са скуластымі індзейскімі тварамі пачуваюцца як дома, разваліўшыся на прыпынку ў чаканьні аўтобуса. Далёка ўнізе, у марской бухце, белая яхта кідае якар у цень хмары, якая зачапілася за гару.

## Марскі тэатар

Турысты любяць Маёрку і свае сабакі, а таму бяруць іх з сабой у адпачынак. Ды толькі сабакі Маёрку ненавідзяць. Лябрадоры панура бадзяюцца па брукаваных дворыках, блакітнавокія лайкі ляжаць, высалапіўшы языкі, на гаўбцах, а аўчары хаваюць пысы ў цень пальмаў. Яны, відавочна, не разумеюць, што цікавага ў гэтым няясным сьпякотным краі, з усіх бакоў абкружаным вадой, якая пячэ язык сольлю. Таму сабакі бяз жалю застануцца дома, пакуль іх гаспадары пойдуць сустракаць заход сонца. Апошні карабель ледзь пасьпее ўзьняцца сонечнай дарожкай, як агнявая сфэра дасьць нырца ў люстраную ваду. Прыціхлая аглядная пляцоўка выбухае воплескамі. Чарговая дзея бясконцага маярканскага спэктаклю скончаная. Антракт — уначы, за столікамі рэстарацыяў. Працяг — нараніцу, зь першымі крыкамі чаек.

*Маёрка—Вітэнбэрг*

**Фота аўтара**

# Тэлевізар для памяці забойчы

Ежце болей рыбы, разгадвайце болей крыжаванак і выключыце тэлевізар, калі хочаце мець лепшую памяць, — сьведчыць аўстралійскае інтэрнэт-дасьледаваньне «Нацыянальны тэст памяці».

У дасьледаваньні ўзялі ўдзел 30 тыс. чалавек. Арганізатары правялі яго падчас тыдня навукі ў Аўстраліі. Тэст правяраў, як карыстальнікі Інтэрнэту даюць рады з запамінаньнем сьпісу пакупак, узгадваньнем імёнаў, твараў і прафэсіяў, як знаходзяць розьніцу паміж здымкамі.

Удзельнікі дасьледаваньня таксама запоўнілі апытальнік на тэму розных звычак, напрыклад, спажываньня алькаголю, аглядаьня тэлевізіі і чытаньня.

Высьветлілася, што найважнейшым чыньнікам, што вызначыў вынік тэсту, было глядзеньне тэлевізіі. Тыя, хто глядзіць тэлевізар у дзень менш за гадзіну, лепей за тэлеманьякаў далі сабе рады ўва ўсіх заданьнях, зьвязаных з памяцьцю.

На горшыя вынікі тэсту паўплывала таксама штодзённае спажываньне вялікай колькасьці алькаголю. Таксама пацьвердзілася сувязь добрай памяці з чытаньнем мастацкай літаратуры.

Тыя, хто разгадвае крыжаванкі, лепш запамінаюць сьпісы пакупак і прыгадваюць імёны, а спажываньне рыбы раз на тыдзень палепшае здольнасьць запамінаць сьпісы пакупак — вынікае з дасьледаваньня.

Жанчыны і мужчыны мелі такія самыя вынікі ўва ўсіх заданьнях.

Важным для памяці зьяўляецца здароўе ў яго шырокім разуменьні: фізычнае і псыхічнае, дыета і актыўны стыль жыцьця — падкрэсьліла адна з кіраўнікоў дасьледаваньня, нэўрапсыхоляг з унівэрсытэту ў аўстралійскім штаце Кўінзлэнд Нэнсі Пэчана.

Экспэрт падкрэсьліла, што для памяці карысная разумовая актыўнасьць. «Тэлевізія — неблагая рэч, але яна адбірае час, які б можна было прысьвяціць на выкананьне чагосьці, што патрабуе ад мозгу крыху большага высілку. Тэлевізія можа быць пасіўнай дзейнасьцю, у той час калі чытаньне вымагае актыўнасьці, што нашмат лепш», — патлумачыла яна.

Навукоўцы папярэдзілі, што тэст сыгналізуе пра пэўныя заканамернасьці на тэму чалавечай памяці, аднак з інтэрнэт-дасьледаваньнем заўсёды зьвязаная рызыка несур’ёзнага ці нядобрасумленнага падыходу яго ўдзельнікаў.

**ВД паводле gazeta.pl**




PHOTO.BYMEDIA.NET

# Канец спрэчкі пра эмбрыёны

У апошнія месяцы здавалася, што дасьледаваньні эмбрыянальных клетак прыпыніліся. Карэйскі спэцыяліст па клонах і мацярынскіх клетках Ву Сук Хван аказаўся махляром. Эўразьвяз прыняў палажэньне пра фінансаваньне гэтага тыпу дасьледаваньняў з грамадзкіх грошай, але зь безьліччу строгіх правілаў. У ЗША аналягічнае палажэньне апратэставаў прэзыдэнт Буш (першае вэта за час яго прэзыдэнцтва).

У Кангрэсе ЗША прайшлі вялікія дэбаты. І хоць на іх зьявіліся невылечна хворыя людзі, для якіх клеткі эмбрыёнаў маглі стаць шанцам на вяртаньне здароўя, працўнікі былі непахісныя: няма згоды на тое, каб ратаваць чыёсьці жыцьцё за кошт іншага. Аднак надзеі, што зьвязваюцца з эмбрыянальнымі клеткамі, такія вялікія, што навукоўцы цярпліва шукаюць новыя мэтады, якія дазволяць ім абмінуць этычную заслону. У часопісе *Nature* адзін з пачынальнікаў кланаваньня і спэцыяліст у мацярынскіх клетках доктар Робэрт Ланца спадзяецца разьбіць аргумэнт пра забіцьцё эмбрыёнаў. Ён вывеў зародкавыя клеткі безь зьнішчэньня эмбрыёнаў.

## Як скрасьці клетку

Чалавечы эмбрыён на раньнім этапе разьвіцьця — гэта група клетак, якія здольныя да ўсяго. Яшчэ няма паміж імі розьніцы, што зьяўляецца па далейшым разьвіцьці эмбрыёна. Таму яны маюць у сабе патэнцыял на тое, каб стаць цяглі-цай, нэўронам альбо клеткай крываносных сасудаў. Таму ня трэба зьдзіўляцца, што іх атрыманьне і падпарадкоўваньне сваёй волі здаўна захапляе навукоўцаў. Шмат зь іх спрабавалі, але заўсёды заставалася адна і тая ж праблема: каб узяць клеткі, трэ было зьнішчыць зародак. Але ці заўсёды так адбываецца? Бывае ж, калі ў зародка «скрадваецца» адна клетка бяз шкоды для яго здароўя.

Тут ідзе гаворка пра так званую прэімплянтацыйную дыягностыку, што прымяняецца падчас апладненьня in vitro. Мэтад дазваляе лекару ацаніць, ці ня мае зародак, што разьвіваецца, генэтычных заганаў. У эмбрыёна на этапе васьмі клетак бярэцца адна, і на ёй праводзяцца генэтычныя тэсты. Калі клетка здаровая, здаровы ўвесь зародак — ён імплянтуецца ў матку, дзе разьвіваецца ў дзіця.

Робэрт Ланца хацеў, аднак, заахвоціць клеткі да дзяленьня і стварэньня цэлай калёніі эмбрыянальных блізьнятаў. Зь іх навукоўцы маглі б паспрабаваць стварыць любую клетку чалавечага цела, здольную вылечыць хворы орган. Вопыты на мышах даказалі, што такі «крадзеж» можа быць пасьпяховы. Заахвочаная посьпехам каманда Ланцы прынялася за чалавечыя эмбрыёны.

# Футбалістаў вылечаць мацярынскія клеткі іх дзяцей

«Мы робім вялікі экспэрымэнт. Мы ўпрыскваем мацярынскія клеткі дзіцяці проста ў траўмаванае калена. І паколькі яны маюць такі самы генэтычны код, то пачынаюць адбудоўваць страты, напрыклад, разарваныя зьвязкі, — кажа Поль Грыфітс, дырэктар клінікі CryoGenesis International (CGI) у Лівэрпулі. — Збаўчыя клеткі паходзяць з замарожанай пупавінавай крыві і прыдатныя для лячэньня тыповых для футболу кантузіяў сустаўных храсткоў і каленных зьвязак.

Як піша *Sunday Times*, з паслуг CGI скарысталася за апошні час пяць асноўных футбалістаў прэм’ер-лігі. Раней тры іншыя спартоўцы замарозілі клеткі сваіх нашчадкаў у лёнданскай «Smart Cells».

«Няпраўда, што мы замарозілі мацярынскія клеткі дзяцей выключна з думкай пра нашыя траўмы, — тлумачыць адзін з футбалістаў, які, аднак, не жадае казаць сваё прозьвішча. — Калі ўзьнікне такая неабходнасьць, мы выкарыстаем іх для тэрапіі саміх дзяцей. Але ў прафэсіі футбаліста кожная траўма можа азначаць канец кар’еры. Замарожваньне клетак нашых дзяцей — гэта як стварэньне сабе рамонтнага набору. Гэта сапраўды мае сэнс».

Адзіным футбалістам зь вядомым прозьвішчам, які публічна абвесьціў пра замарожваньне мацярынскіх клетак сваіх дзяцей, зьяўляецца зорка лёнданскага «Арсэналу» і зборнай Францыі Т’еры Анры. Аднак ён ніколі не казаў пра тое, што хацеў бы выкарыстаць іх таксама для ратаваньня ўласнага здароўя. На Брытанскіх выспах на замарожваньне пупавінавай крыві дзяцей рашылася за апошнія пяць год каля 11 тыс. бацькоў. Працэдура і захоўваньне каштуе каля 1,5 тыс. фунтаў.


WWW.PA-SPORT.COM
**Т’еры Анры даў згоду на замарожваньне мацярынскіх клетак сваіх дзяцей.**

Гэтая тэрапія, якую на выспах называюць saviour offspring (нашчадак-збаўца), выклікае, аднак, этычныя сумненьні, асабліва гэта тычыцца экспэрымэнтаў навукоўцаў зь лёнданскага *Imperial College*, якія вывелі сустаўныя храсткі з клетак эмбрыёнаў.

**ВД**
**паводле Sunday Times**

## Першыя восем месяцаў

Навукоўцы выкарысталі для дасьледаваньняў 16 эмбрыёнаў, што засталіся з апладненьняў in vitro. Пасьля адбору засталося шэсьць. З двух здолелі атрымаць стабільныя і чыстыя клеткавыя лініі. Абедзьве жаночыя. Клеткі былі адарваныя ад эмбрыёну на этапе, калі іх было восем, і пасьля іх расьцілі разам з эмбрыёнам, які нармальна разьвіваўся. Потым яны былі перанесеныя на спэцыяльна падрыхтаваныя пажыўныя асяродзьдзі. Удалося правесьці і дасьледаваньні творчых здольнасьцяў атрыманых клетак. Навукоўцы «заахвоцілі» іх да пераўтварэньня ў структуры, характэрныя для крываносных сасудаў.

## Надзеі на спраўджваньне

Магчымасьць прымяненьня гэтага мэтаду абмежаваная неабходнасьцю апладненьня in vitro. Для маці гэтыя клеткі былі б свайго роду аховай здароўя будучага дзіцяці. Сумнеўна, каб жанчыны толькі з гэтай прычыны масава падвяргаліся штучнаму апладненьню. Хоць часам над гэтым варта было б разважыць. З дабрачынных клетак магло б скарыстаць ня толькі дзіця, зь якога іх узялі (калі яшчэ было зародкам), але таксама яго хворыя браты і сёстры. З другога боку, зьяўляецца ўсё больш параў, што карыстаюцца апладненьнем in vitro. Маштаб праблемы бясплоднасьці павялічваецца, а вынікам зьяўляюцца тысячы створаных у клініках лішніх эмбрыёнаў, зь якімі не вядома што рабіць. У ЗША іх 400 тыс. Гэта, галоўным чынам, пра іх спрачаліся месяц таму амэрыканскія палітыкі. Навукоўцы хацелі выкарыстаць іх для дасьледаваньняў, што пацягнула б за сабой іх зьнішчэньне.


**На чалавечыя эмбрыёны накладзена вэта, і навукоўцы дасьледуюць клеткі эмбрыёнаў мышэй.**

Досьледы Ланцы могуць істотным чынам зьмяніць сытуацыю. Калі не вызваляючы дзяржаўныя грошы (прыватных і так мноства), то паляпшаючы атмасфэру вакол тэмы эмбрыёнаў. Бо калі ў эмбрыёнаў будуць забіраць па адной клетцы, а пасьля замарожваць з надзеяй на тое, што некалі бацькі вернуцца па чарговае дзіця, і воўк будзе сыты, і авечка цэлая.

Амэрыканцы сьцьвярджаюць, што калі б аслабіць этычны тормаз, які цяпер запавольвае дасьледаваньні, дык можна было б нарэшце праверыць, колькі праўды і колькі пабожных інтэнцыяў у захапленьнях навукоўцаў пакуль толькі патэнцыяльнай магутнасьцю мацярынскіх клетак. А чаканьні ў дачыненьні да іх велізарныя. Ня выключана, што апублікаваная праца дазволіць іх у хуткім часе спраўдзіць.

# Вы чаго равяце?
# Чаго сьлёзы ліяце?













**Мы абед рабілі:**
**Памідоры мылі,**





**Рэзалі гуркі,**
**Дралі буракі,**



**А як чысьцілі ______ ,**
**Вой жа, сьлёзак мы глынулі!**

Капітан Танака ©

# Аршанская бітва 2006

Фэст беларускай аўтарскай песьні й паэзіі «Аршанская бітва — 2006» адбудзецца сёлета **9 верасьня**. Пачатак а 19-й.

Фэст адбываецца на месцы Аршанскае бітвы 1514 г. — правым беразе Дняпра, дзе ў яго ўліваецца рэчка Крапівенка. Ён доўжыцца ўсю ноч, каб за нядзелю ўдзельнікі змаглі адпачыць і спакойна дабрацца дадому. Фэст праходзіць на адкрытым паветры ля ракі, варта падумаць пра цёплую вопратку, ежу і намёт. Дровы для вогнішча будуць на месцы.

**Даезд:** з чыгуначнага вакзалу на аўтобусе ці маршрутцы №11 да аўтавакзалу (канцавы). Далей — аўтобусам «Ворша—Дуброўна» да прыпынку «Гацькаўшчына». Гуртам можна наняць маршрутку з вакзалу проста да Гацькаўшчыны.

Таксама аўтобусам або маршруткай можна ад'ехаць ад прывакзальнае плошчы да прыпынку «Цэнтар», затым ад Цэнтральнай плошчы, што ля Дому гандлю (прыпынак за помнікам Леніну), сесьці на аўтобус ці маршрутку «Ворша—Дуброўна» і ехаць да прыпынку «Гацькаўшчына». Адтуль да месца фэсту 1 км.




**Ахвотныя дапамагчы** могуць тэлефанаваць: 319-65-74 (Генадзь).

**Дадатковая інфармацыя**: 291-62-38 (Юрка).

ПРАЕКТ ГІСТАРЫЧНАЙ МУЗЫКІ «СТАРАЖЫТНАЯ ЗЯМЛЯ»



КЗ «Менск», Кастрычніцкая, 5

8 верасьня, 19.00

# Гістарычная песьня

Кудмень, Тэстамэнт, Рокаш, Тутэйшая шляхта
Стары Ольса, P.L.A.N.

Архаічныя мужчынскія сьпевы, гістарычныя песьні XIV—XIX ст., песьні на словы Яна Чачота, стылізацыі і аўтарскія кампазыцыі на гістарычныя тэмы. Кошт квіткоў 10 000 — 16 000.
Тэл. для даведак: 2066638 (каса), 029-5736746, 029-6168490



## Шалкевіч прызямліўся

14 кастрычніка ў канцэртнай залі «Менск» (малая заля) — вялікі сольны канцэрт Віктара Шалкевіча і прэзэнтацыя яго новага альбому «Гарадзенец прызямліўся ў Менску». Пачатак а 19-й. Кошт квіткоў 8 000 — 14 000. Даведкі: 649-08-88, 766-24-25

## КІНО НА DVD

**MASTER RECORDS**
**10 прыказаньняў**
**(The Ten Commandments)**
Біблейскі пэплюм, ЗША, 2006, рэж. **Робэрт Дорнгэлм**. У ролях: **Дугрэй Скот, Амар Шарыф, Лінус Роўч.**
Эпічная сага на старазапаветную тэму. Майсей выводзіць габрэяў зь нявольніцтва і атрымлівае ад Бога 10 прыказаньняў.
**Менск, Кісялёва 12, 643-21-08**

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Выкіньце свой мабільнік!

**Пульс** (Pulse).

ЗША, 2006, каляровы, 90 хв.

**Жанр:** містычны фільм жахаў.

**Адзнака:** 5 (з 10).

Карціна «Пульс» прапануе выкінуць мабільнікі, адключыць кампутары, разьдзяўбаць тэлевізары — і ўцячы ў вясковую глухмень. Заклікі тлумачацца не настальгіяй па зямлі і натуральным беларускім жаданьнем пакапаць бульбу, а зусім празаічна: прывіды захапілі гарады.

Прышэсьце зданяў пачалося пасьля таго, як павесіўся студэнт-хакер. Сябры нябожчыка пачалі атрымліваць электронныя лісты ад памерлага, мабільнікі пачалі зьвякаць, а ў кампутары няшчаснага разьвялося такое!..

Гарадзкія кашмарыкі пра электронна-пабытовыя прыборы найлепей за ўсіх здымаюць японцы. Карціна «Пульс» тут не вынятак. Твор Джыма Санзэра ёсьць паўторам стужкі «Каіра» Кіёсі Курасавы. Руку да адаптацыі прыклаў Ўэс Крэйвэн, склаўшы амэрыканскі сцэнар.

Паўтор, як здараецца часта, няроўны. Але попельна-шэрая прастора зацягвае, як тысячы рук мерцьвякоў. І чырвоны скотч — параноідальная дэталь — адзіная абарона.

У галаве пасьля фільму нічога не застанецца. І гэта ж, у прынцыпе, плюс!

**Андрэй Расінскі**

З 7 верасьня ў Менску распачынаецца прэм'ера гішпанскага фільму «Вяртаньне» Пэдра Альмадовара і казаскай стужкі «Качэўнік». Рэцэнзіі глядзеце на сайце і ў наступным нумары.


# ЗДАРОВА, ТАВАРЫШЫ, ДОЎГА ЧАКАЛІ!




«Майстар-клюб», вул.Будаўнікоў, 22. (Маршруткай з маладачанскай прывакзальнай плошчы, прыпынак «Паліклініка».)

19.00

Квіткі: 10 тыс. Даведкі па т.: 6781899, 5023060, 6089586, 5062405.



# Трыб’ют Сяргею Новіку–Пеюну

«БМАGroup» выдае дыск — прысвячэньне клясыку беларускай песьні Сяргею Новіку–Пеюну. Альбом будзе звацца «Дні лятуць». Да ўдзелу ў праекце запрашаюцца ўсе ахвотныя музыкі. Трэба перасьпяваць любую песьню Новіка–Пеюна альбо пакласьці на музыку яго верш. Па тэксты і песьні можна зьвяртацца да арганізатараў: т.: 649–08–88, e–mail: w1979@tut.by.

15 верасьня



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

КЗ «Менск» (Малая заля)

Пачатак 19.00

# Зьміцер Вайцюшкевіч

Прэзэнтацыя дыска

## Песьні з доўгай шуфляды. Нявыданае

## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

Субота, 9 верасьня
«СТВ», 07.55
«Горад майстроў».
Беларусь, 1965, рэж. Уладзімер Бычкоў.
Казка паводле аднайменнай п’есы Тамары Габэ.
Беларускі шэдэўр візуальнай культуры — і надзвычай актуальная казка.
БТ, 21.35
«Атлянтыда».
Францыя — Італія, 1995, рэж. Боб Сўэйм.
Прыгодніцкая мэлядрама паводле раману П’ера Бэнуа. Прыгожыя жанчыны, экзотыка і фатальныя жарсьці.
«Лад», 21.45
«Неўтаймаваны».
Францыя, 1983, рэж. Ален Дэлён.
Дэтэктыўны трымценьнік.
Калі Жак Дэрнэ выйшаў з турмы, на яго пачала паляваць і мафія, і паліцыя.
Нядзеля, 10 верасьня
БТ, 07.20
«Гадзіньнік спыніўся апоўначы».
Беларусь, 1958, чорна–белы, рэж. Мікалай Фігуроўскі.
Гераічная драма.
Падпольшчыкі забіваюць гаўляйтэра Беларусі... Апалёгія вызваленчай барацьбы й партызанкі.
БТ, 14.10
«Час кіно».
Беларусь, 2006, вядоўца Ігар Сукманаў.
Другая частка перадачы пра сёлетні Канскі фэст.
БТ, 19.10
«Мільён гадоў да нашай эры».
Францыя, 2004, рэж. Ален Шаба.
Камэдыя.
У першабытным мінулым племя Бруднавалосых пнецца выкрасьці сакрэт шампуню ў племені Чыставалосых. Легкадумныя хохмы абсурдовае комікгрупы, рэжысэра «Астэрыкса» і дзікага Жэрара Дэпард’ё.
БТ, 22.20
«Дзяўчына з жамчужнай завушніцай».
Вялікабрытанія — Люксэмбург, 2003, рэж. Пітэр Ўэбэр.
Драма.
У доме мастака Вэрмэера зьяўляецца новая служанка Грыет. Прыгажуня натхняе мастака на шэдэўр... Далікатны й відовішчны фільм, насычаны пекнатою і пачуцьцёвасьцю.
НТВ, 22.45
«Уцёкі».
ЗША, 1972, рэж. Сэм Пэкінпа.
Крымінальная драма паводле рамана Джыма Томпсана.
Дока Макоя выцягнулі з турмы, каб абрабаваць банк, грошы зь якога ўжо былі раскрадзеныя. Але герой не зьбіраецца быць пешкай у чужой гульні.
Рэжысура амэрыканскага кінабунтара–генія — Сэма Пэкінпы.
У галоўнай ролі зорка — Стыў Маккўін.
Не прапусьцеце.

**Андрэй Расінскі**

17 верасьня 16.00

# 222 альбомы

У Воршы ў касьцёле Сьвятога Язэпа (вул.Савецкая, 6) — прэзэнтацыя энцыкляпэдыі беларускага року «222 альбомы беларускага року і ня толькі...». Сустрэча з аўтарамі кнігі, музычнымі журналістамі Вітаўтам Мартыненка і Анатолем Мяльгуем. Таксама адбудзецца канцэрт з удзелам Андрэя Плясанава (гурт *P.L.A.N.*) і Яраша Малішэўскага (*Pete Paff*). Даведкі праз сотавы: 711–95–45.

УВАХОД ВОЛЬНЫ!

# Каб штотыдзень атрымліваць газэту, дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні

Каб гарантавана чытаць «Нашу Ніву» цяпер, калі «Саюздрукам» і «Белпошце» забаронена распаўсюджваць газэту:

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць па тэлефоне, факсам, праз пошту ці электронную пошту.** Тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@tut.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям'ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 6 000 рублёў на месяц. Гэтага будзе досыць для выхаду і дастаўкі газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перaказу, калі ласка, дакладна і разборліва пазначайце ваш адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.** Тыя, хто перакажа 18 000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад газэты на тры месяцы. Хто ж мае магчымасьць пераказаць 36 000 рублёў адразу,

# Дзякуй за ахвяраваньні

**Ігару Х., Г.** зь Менскага раёну.
**Генадзю Л.** з Гомелю.
**Аляксандру А.** з Горадні.
**А.І., Зьмітру Ш., А.П.** зь Берасьця.
**Анатолю П., Натальлі Г.** з Салігорску.
**Ларысе Л., Алесю Б., Вячаславу С.** з Баранавічаў.
**Ніне М.** зь Вялейкі.
**Віталю С., Т.П., Міхаілу Ж., А.Н., К.З., Івану Ш., А.Г., Л.Д., І.С., Андрэю Л.** зь Менску.
**Вользе Ш., Юр'ю М., В.К., А.Б., Васілю Л., Аляксандру К., Міхаілу Б., Юр'ю М., Мікалаю Г., Веры С., І.В., Р.Б., Тацяне В., Уладзімеру К.** зь Менску.
**Ганьне К.** зь Віцебску.
**Сяргею С.** з Барысава.
**Сяргею Ц.** зь Лепельскага раёну.

Дыяна Леанідаўна зь Менску, паведаміце, калі ласка, нумар сваёй кватэры.
Сяргей Рыгоравіч Н., паведаміце, калі ласка, свой адрас.
М.В.Е. з вуліцы 17 верасьня, удакладніце адрас.
С.В.А. з Радашкавічаў, дашліце дакладны адрас.

0402280179
**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521**
получатель платежа
**МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764**
наименование банка

| Счет получателя | 3015 212 000 012 | Лицевой счет | |
|---|---|---|---|

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир
Плательщик

**КВИТАНЦИЯ**

**Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521**
получатель платежа
**МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764**
наименование банка

| Счет получателя | 3015 212 000 012 | Лицевой счет | |
|---|---|---|---|

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир М.П. Плательщик

## На які рахунак пералічаць грошы?

Ахвяраваньне можна перавесьці ў любым аддзяленьні банку, на любой пошце. Улічыце, што пры пераказваньні грошай паштовым пераводам пошта спаганяе дадаткова 3%, а пры пераводзе грошай праз «Беларусбанк» працэнту не бяруць.
На банкаўскай квітанцыі ў графе «Від плацяжа» трэба пазначыць: «Ахвяраваньне». У графе: «Атрымальнік плацяжа» трэба пісаць: «Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521». У графе «Найменаваньне банку» трэба пісаць: «МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764». У графе «Рахунак атрымальніка» 3015 212 000 012. Пры перасылцы грошай па пошце тое самае трэба пісаць у рубрыках «Каму» і «Куды».



**...сярод краінаў руху непрыяднаньня сапраўды было адзінства.**

— Паколькі краіны руху непрыяднаньня адзіныя, іх лідэры разам зь Фідэлем захварэлі на кішачнік і перадалі мяне, Раулю Кастра, свае паўнамоцтвы. Такім чынам, паседжаньне Фэдэрацыі хакея Беларусі сёньня буду весьці я.



**...навіна аб тым, што Садама катуюць праглядам мульцікаў, мела эфэкт на беларускае кіраўніцтва.**

— Не! Не, праклятыя гаазкія судзьдзі! Няма ў мяне ніякіх сакрэтных рахункаў! Так, здаецца, катаваньне Мікі Маўсам я вытрымаю. Зараз паспрабую Тома і Джэры.

МАЛЮНКІ І ТЭКСТЫ ЛЁЛІКА УШКІНА

## У НУМАРЫ

### Звольнены настаўнік прыкуў сябе да ліхтарні



Алесь Чыгір: Такія акцыі заўсёды маюць плён. **Старонка 13.**

### У тайзе захаваліся беларускамоўныя вёскі



Беларусы Іркуцкай вобласьці перажываюць нацыянальны рэнэсанс. Піша Зьміцер Панкавец. **Старонка 26.**

## Вызначаныя пераможцы Літаратурнага конкурсу да стагодзьдзя «Нашай Нівы»

**Беларускі ПЭН-Цэнтар і газэта «Наша Ніва» падвялі вынікі Конкурсу маладых літаратараў, прысьвечанага стогадоваму юбілею «НН», які, нагадаем, будзе адзначацца ў лістападзе.**

Усяго на разгляд даслалі творы 80 аўтараў. Журы вызначыла 22 фіналісты.

Гэта Андрэй Адамовіч, Яраслава Ананка, Юлія Арцёмава, Ірына Барысевіч (Віцебск), Валянцін Бойка (Мазыр), Кірыла Дубоўскі, Сяргей Карбановіч, Алесь Кудрыцкі (Вітэнбэрг), Настасься Манцэвіч, Сяржук Мядзьведзеў, Андрэй Пакроўскі, Сірошка Пістончык і Уласік Смаркач (Берасьце), Віялета Пачкоўская, Віталь Рыжкоў (Магілёў), Аляксей Сарока (Крупкі), Ганна Серахан, Сяржук Семянюк, Наталка Харытанюк (Берасьце), Юлія Шадзько, Віктар Ываноў, Юлія Яфімовіч.

У сьнежні ў Менску пройдуць майстар-клясы для фіналістаў. Іх творы будуць выдадзеныя асобнай кнігай.

Віншуем пераможцаў!

## АНОНС

**Што вырашыла лёс Клецкай бітвы**

Гісторык Генадзь Сагановіч пра адну з самых дасканалых перамог беларускай зброі.

**Палалі пажары**

«Марозным студзеньскім днём 1943 г. партызаны Кіраўскага атраду Расонскай брыгады імя Сталіна сабраліся на пастраеньне...»

**Львоўская місія «Язафата»**

Знойдзены дакумэнт, які пралівае сьвятло на яшчэ адну малавядомую старонку дзейнасьці Беларускага Супраціву ў 1941—1944 гадох. Пішуць Сяржук Горбік, Сяргей Ёрш.

**Гісторыя на старонках «НН»: чытайце ў выпуску 15 верасьня.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### КНІГІ

**Студэнтка набудзе** падручнік альбо граматыку літоўскай мовы. МТС: 504-31-14 (Тацяна). aniolski@tut.by

### ВАНДРОЎКІ

**Зьміцер Касьпяровіч запрашае** ў вандроўкі.

**Маршрут I** (Амсьціслаўшчына) 10 верасьня. Амсьціслаўе—Ануфрыева—Пустынкі—Мазалава—Горкі. **Маршрут 2** (на сутыку Бераставіцкага, Гарадзенскага і Мастоўскага р-наў). 17 верасьня. Лунна—Квасаўка—Індура—Масаляны—Вялікія Эйсманты—Малая Бераставіца—Вялікая Бераставіца. **Маршрут 3** (Ваўкавыскі р-н). 24 верасьня. Рось—Воўпа—Рэпля—Вярэйкі—Шылавічы—Мсьцібава—Гнёзна—Ваўкавыск. Т.: 292-54-58, 622-57-20, 509-12-16




# А ты падпішыся!



**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 46.**

## СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**З рэдакцыйнага артыкулу.** Беларускі народ мае сваю старую славянскую векавечную культуру, і хоць яна іншым «сьмярдзіць дзёгцем», але за тое кожная сярмяжка чуецца ў ёй свабодна, як у сваёй хаце. На бяду ёсьць у нас шмат людзей, маючых сілу або і ня маючых яе, каторым стары славянскі дзёгаць сьмярдзіць, бо галава ў іх засыпана так званай «маргарынавай» (фальшывай) цывілізацыяй; і вось яны пхнуць і пруць народ у «піджачную», паказную культуру ды вераць, быццам гэта сьвятая справа.

**«Наша Ніва». 1911, №33.**

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| нам.галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220030, г. Менск, вул. Калектарная, 20а-112. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2721. **Газэта выдаецца 48 разоў на год.**

Нумар падпісаны ў друк 23.00 06.09.2006.

Замова № 4981.

Рэдакцыйны адрас: Калектарная, 20а-112.